Беларусь

Справаздача па правах чалавека 2020

Асноўныя палажэнні

Беларусь – аўтарытарная дзяржава. Канстытуцыя краіны прадугледжвае наўпроставыя выбары прэзідэнта, які з'яўляецца кіраўніком дзяржавы, і двухпалатнага парламента, што называецца Нацыянальным Сходам. Прэм'ер-міністр, які прызначаецца прэзідэнтам, намінальна ўзначальвае ўрад, але дэ-юрэ і дэ-факта ўлада засяроджаная ў руках прэзідэнта. Грамадзяне не мелі магчымасці абіраць свой урад шляхам свабодных і справядлівых выбараў. З моманту абрання на пасаду прэзідэнта ў 1994 годзе Аляксандр Лукашэнка ўмацоўваў сваю ўладу над усімі інстытутамі і скасоўваў вяршэнства права праз выкарыстанне аўтарытарных інструментаў, у тым ліку праз маніпуляванне выбарамі і падпісанне адвольных указаў. Усе наступныя пасля 1994 года прэзідэнцкія выбары, у тым ліку і выбары 9 жніўня, не дацягвалі да міжнародных стандартаў. Парламенцкія выбары 2019 года таксама не адпавядалі міжнародным стандартам.

Міліцыя падпарадкоўваецца Міністэрству ўнутраных спраў, аднак іншыя органы, якія не знаходзяцца пад кантролем міністэрства, напрыклад, КДБ, Дэпартамент фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, Следчы камітэт і Служба бяспекі Прэзідэнта, таксама выконвалі функцыі аховы парадку. Сваім уласным распараджэннем Прэзідэнт мае ўладу падпарадкоўваць сабе ўсе ограны бяспекі. Лукашэнка захаваў эфектыўны кантроль над сілавікамі. Супрацоўнікі сілавых структур здзейснілі шматлікія злоўжыванні.

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня ў краіне адбыліся масавыя грамадзянскія пратэсты, падчас якіх дэманстранты выступалі супраць шырокамаштабнай фальсіфікацыі Лукашэнкам вынікаў галасавання, а таксама супраць шырокамаштабнага прымянення ўладамі жорсткай сілы і затрыманняў мірных дэманстрантаў. Штотыднёвыя акцыі пратэсту, у якіх бралі ўдзел сотні тысяч пратэстоўцаў, пачаліся ў ноч пасля выбараў і працягваліся да канца года.

Да істотных праблем у сферы правоў чалавека адносіліся незаконныя і адвольныя забойствы супрацоўнікамі сілаў бяспекі; катаванні ў месцах пазбаўлення волі і выпадкі жорсткага, бесчалавечнага і прыніжальнага для чалавечай годнасці абыходжання або пакаранняў з боку сілаў бяспекі; цяжкія і небяспечныя для жыцця ўмовы ўтрымання ў турмах; адвольныя арышты і затрыманні; наяўнасць палітзняволеных або затрыманых; сур'ёзныя праблемы што да незалежнасці судовай улады; адвольнае або неправамернае

ўмяшальніцтва ў прыватнае жыццё; сур'ёзнае абмежаванне свабоды слова, друку і інтэрнэту, у тым ліку гвалт, пагрозы гвалту або неабгрунтаваныя арышты ці судовы пераслед журналістаў; цэнзура, блакіроўка сайтаў і наяўнасць законаў, якія крыміналізуюць абразы і паклёпы на дзяржаўных чыноўнікаў; празмерна абмежавальныя законы ў дачыненні да недзяржаўных арганізацый; жорсткія абмежаванні свабоды мірных сходаў і аб'яднанняў, уключна з увядзеннем крымінальнай адказнасці за заклік да мірных дэманстрацый, а таксама законаў, якія крыміналізавалі дзейнасць і фінансаванне супольнасцяў, не прызнаных уладамі; абмежаванне свабоды перасоўвання; немагчымасць грамадзян мірным шляхам мяняць свой урад праз свабодныя і справядлівыя выбары; абмежаванні права на ўдзел у палітычным жыцці, уключна з пастаянный неадпаведнасцю выбараў міжнародным стандартам; сур'ёзныя карупцыйныя дзеянні; адсутнасць расследавання актаў гвалту ў дачыненні да жанчын і адказнасці за яго; гандаль людзьмі; злачынствы, звязаныя з гвалтам і пагрозамі гвалту ў адносінах да лесбіянак, гееў, бісэксуалаў, трансгендараў і інтэрсэксуалаў; абмежаванні дзейнасці незалежных прафсаюзаў; а таксама істотныя абмежаванні права працоўных на стварэнне аб'яднанняў.

Улады на ўсіх сваіх узроўнях дзейнічалі беспакарана і ніколі не прымалі мераў па судовым перасследзе і пакаранні службовых асоб ва ўрадзе і сілавых структурах за парушэнні правоў чалавека.

Раздзел 1. Захаванне недатыкальнасці асобы, у тым ліку свабода ад:

а. Адвольнага пазбаўлення жыцця і іншых незаконных або палітычна матываваных забойстваў

На працягу года паступалі вартыя даверу звесткі пра здзяйсненне ўладамі або па іх даручэнні адвольных або незаконных забойстваў, а таксама пра выпадкі смерці ад катаванняў.

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня АМАП, унутраныя войскі і супрацоўнікі сілавых органаў у цывільным жорстка падаўлялі масавыя пратэсты. Прынамсі чатыры чалавекі загінулі ў выніку гвалтоўных дзеянняў з боку міліцыі, прымянення агнястрэльнай зброі супрацоўнікамі сілаў бяспекі або праз няздольнасць уладаў аказаць медычную дапамогу.

Так, напрыклад, 10 жніўня ў Мінску міліцыянтамі падчас дэманстрацыі быў застрэлены пратэстоўца Аляксандр Тарайкоўскі. Сцвярджэнне ўладаў пра тое, што Тарайкоўскі быў забіты выбуховай прыладай, якую трымаў у руках, абвяргаюцца паказаннямі відавочцаў і відэазапісамі інцыдэнту, на якіх яўна бачна, што сілавікі стрэлілі Тарайкоўскаму ў грудзі, калі ён падыходзіў да іх з

узнятымі, пустымі рукамі. Следчы камітэт распачаў расследаванне па гэтай справе, але 13 лістапада перапыніў яго. Па стане на снежань крымінальная справа па дадзеным факце так і не была ўзбуджаная.

2 лістапада прадстаўнік Следчага камітэта, праваахоўнага органа, якому даручана расследаванне ў краіне выпадкаў гвалту, здзейсненых міліцыяй, паведаміў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, што камітэт не расследуе ніякіх заяваў аб злоўжыванні з боку міліцыі, і заявіў, што "ў цяперашні час выпадкаў неправамоцных дзеянняў з боку міліцыі не выяўлена". Прадстаўнік СК абвінаваціў арганізатараў пратэстаў у тым, што яны выкарыстоўваюць пратэстоўцаў у якасці "гарматнага мяса" і прыводзяць на дэманстрацыі дзяцей.

12 лістапада Раман Бандарэнка памёр ад траўмаў галавы і лёгкага ў выніку жорсткага збіцця і затрымання 11 лістапада ў Мінску супрацоўнікамі праваахоўных органаў у цывільным і ў масках. Само затрыманне і часткова збіццё было зафіксавана на відэа. Праз некалькі гадзін непрытомны Бандарэнка быў дастаўлены ў мінскі шпіталь, дзе і сканаў. Паведамляецца, што траўмы, якія прывялі да смерці Бандарэнкі, былі больш сур'ёзныя за тыя, якія ён атрымаў у час арышту, і праваабаронцы прыйшлі да высновы, што яго працягвалі жорстка збіваць у зняволенні. Паводле інфармацыі, улады распачалі расследаванне гэтага выпадку.

б. Знікненняў

На працягу года не прыходзіла паведамленняў пра знікненні, арганізаваныя дзяржаўнымі ўладамі або па іх даручэнні.

Аднак прыходзілі паведамленні пра выкраданне сіламі бяспекі лідараў апазіцыі. Так, напрыклад, 7 верасня супрацоўнікі сілавых структур у масках падышлі да лідара апазіцыі Марыі Калеснікавай на вуліцы ў Мінску, схапілі яе і заштурхнулі ў мікрааўтобус. Паводле словаў адваката Калеснікавай, мужчыны спачатку даставілі яе ў Галоўнае ўпраўленне МУС па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй, дзе яе пратрымалі некалькі гадзін, не рэгіструючы затрымання. Пасля таго яе адвезлі ў цэнтральны апарат Камітэта дзяржаўнай бяспекі, дзе параілі ў добраахвотным парадку пакінуць краіну. Пасля таго, як Калеснікава адмовілася, 8 верасня яе даставілі на мяжу з Украінай, дзе ўлады паспрабавалі прымусіць яе пакінуць краіну. Калеснікава парвала свой пашпарт, каб прадухіліць высылку з краіны. У далейшым яе арыштавалі, даставілі назад у Мінск і змясцілі ў следчы ізалятар, дзе яна і знаходзілася па стане на снежань справаздачнага перыяду. 16 верасня ёй было прад'яўлена афіцыйнае абвінавачанне ў "закліках да дзеянняў, накіраваных на нанясенне шкоды нацыянальнай бяспецы".

16 студзеня Следчы камітэт паведаміў пра паўторнае адкрыццё перапыненага раней расследавання знікненняў у 1999 годзе былога намесніка прэм'ер-міністра Віктара Ганчара і бізнесоўца Анатоля Красоўскага. У снежні 2019 года камітэт таксама аднавіў расследаванне знікнення былога Міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі пасля таго, як Юрый Гараўскі, які сцвярджаў, што з'яўляецца былым супрацоўнікам спецпадраздзялення хуткага рэагавання, заявіў, што браў удзел у гвалтоўных знікненнях і забойствах Ганчара, Красоўскага і Захаранкі. У сакавіку камітэт ізноў прыпыніў расследаванне праз "немагчымасць вызначыць асобы падазраваных". Хоць і існавалі доказы дачынення ўладаў да гэтых знікненняў, але самі ўлады працягвалі адмаўляць якую-кольвечы сувязь з імі. У снежні 2019 года Лукашэнка заявіў, што забойствы па палітычных матывах былі б немагчымыя без ягоных загадаў, якія ён "[не аддаваў] ніколі і не будзе аддаваць".

в. Катаванняў ды іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжальных для чалавечай годнасці спосабаў абыходжання і пакарання

Закон забараняе падобную практыку. Тым не менш, Камітэт дзяржаўнай бяспекі (КДБ), АМАП і іншыя сілавыя падраздзяленні, часта ніяк не абазначаныя, у цывільным і ў масках, рэгулярна ўжывалі празмерную сілу супраць затрыманых і пратэстоўцаў. Па-ранейшаму працягвалася перыядычнае збіццё затрыманых. Паводле інфармацыі, сілы бяспекі таксама жорстка абыходзіліся з людзьмі ў працэсе следства. Міліцыянты рэгулярна збівалі і катавалі людзей падчас затрыманняў і арыштаў. Паводле дадзеных недзяржаўных праваабарончых арганізацый і былых вязняў, турэмная адміністрацыя жорстка абыходзілася са зняволенымі.

Згодна з дакументальнымі сведчаннямі відавочцаў, 9-11 жніўня супрацоўнікі службаў бяспекі сістэматычна і па ўсёй краіне прымянялі фізічны гвалт у транспартных сродках, міліцэйскіх будынках і месцах утрымання ў дачыненні да большасці з прыкладна 6 700 чалавек, затрыманых падчас паслявыбарчых грамадзянскіх хваляванняў. Праваабарончы цэнтр "Вясна" задакументаваў больш за 500 выпадкаў катаванняў і іншых праяваў жорсткага абыходжання, якія мелі месца падчас утрымання ў міліцыі ў дачыненні да ўдзельнікаў паслявыбарчых пратэстаў і незалежных назіральнікаў за выбарамі, лідараў апазіцыі, актывістаў грамадзянскай супольнасці і шараговых грамадзян.

Сярод задакументаваных праяваў гвалту былі жорсткае збіццё; псіхалагічнае прыніжэнне; прымушэнне да знаходжання ў нязручных позах; прынамсі адзін зарэгістраваны выпадак згвалтавання і сэксуальнага гвалту; выкарыстанне электрашокераў і слезацечнага газу; наўмыснае пазбаўленне ежы, пітной вады,

сродкаў гігіены, прыбіральні, сну і медыцынскай дапамогі тэрмінам да трох дзён.

Напрыклад, па дадзеных арганізацыі Human Rights Watch, 11 жніўня супрацоўнікамі міліцыі быў затрыманы 18-гадовы студэнт універсітэта Аляксандр Бруханчык, які ў начны час ішоў па вуліцы жылога мікрараёна ў суправаджэнні двух сяброў. Супрацоўнікі міліцыі перадалі затрыманых групе супрацоўнікаў АМАП МУС. Супрацоўнікі АМАП заштурхалі студэнтаў у мікрааўтобус, збілі іх, разрэзалі іх шорты ў раёне ягадзіц, пагражалі згвалтаваць ручной гранатай; затым перамясцілі іх у аўтазак, прымусілі паўзці на карачках па запырсканай крывёй падлозе і зноў збілі. Адзін з супрацоўнікаў ударыў Бруханчыка нагой у твар. Бруханчык прадаставіў прадстаўнікам Human Rights Watch медыцынскія дакументы, якія пацвярджаюць яго аповед.

Паступалі шматлікія паведамленні пра пагрозы згвалтавання і гвалтоўныя сэксуальныя дзеянні з боку прадстаўнікоў праваахоўных органаў у дачыненні як да мужчын, так і да жанчын, і пра прынамсі адзін выпадак згвалтавання затрыманага. Згодна са справаздачай Маскоўскага механізму Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ), 11 жніўня адзін са старшых афіцэраў пасля арышту згвалціў 30-гадовага работніка ІТ-галіны Алеся міліцэйскім дручком. У міліцэйскім мікрааўтобусе афіцэр запатрабаваў, каб Алесь разблакаваў свой мабільны тэлефон. Калі Алесь некалькі разоў адмовіўся гэта зрабіць, афіцэр разрэзаў яму шорты і ніжнюю бялізну ззаду, надзеў на дручок прэзерватыў і згвалціў яго. Пасля таго афіцэр збіў Алеся. Алесь прадставіў недзяржаўным арганізацыям медычныя дакументы, якія пацвярджалі яго гісторыю. 6 лістапада першы намеснік міністра ўнутраных спраў Генадзь Казакевіч заявіў, што “згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, мужчыну нельга згвалціць”. Аднак, паводле закона, згвалтаванне мужчын і жанчын ў краіне з’яўляецца крымінальным злачынствам і караецца па законе (гл. раздзел 6).

Сур’ёзнай праблемай заставалася беспакаранасць амаль усіх падраздзяленняў праваахоўных органаў, уключна з міліцыяй і КДБ. Беспакаранасць была шырока распаўсюджаная і захоўвалася пераважна праз палітызацыю праваахоўных органаў. 2 лістапада Следчы камітэт пацвердзіў, што ўлады не ўзбуджалі крымінальныя справы па пададзеных у камітэт скаргах на катаванні або гвалт з боку міліцыі. Хоць у жніўні міністр унутраных спраў Юрый Караеў папрасіў прабачэння ў “выпадковых людзей, затрыманых падчас пратэстаў”, ён, тым не менш, апраўдаў жорсткае задушэнне пратэсту і далейшыя катаванні, заявіўшы, што міліцыя адрэагавала на агрэсію пратэстоўцаў супраць праваахоўнікаў і на тое, што пратэстоўцы будавалі барыкады і аказвалі супраціў міліцыі. Намеснік Караева Аляксандр Барсукоў, які наведаў 14 жніўня мінскія установы ўтрымання, абверг паведамленні пра катаванні, заявіўшы, што ні адзін з затрыманых не скардзіўся на жорсткае абыходжанне.

Паводле справаздачы Маскоўскага механізму АБСЕ, апублікаванай 29 кастрычніка, “першы этап гвалту з боку сілаў бяспекі пасля выбараў трэба кваліфікаваць як перыяд сістэмных катаванняў і жорсткага абыходжання з асноўнай мэтай пакараць дэманстрантаў і запалохаць іх і іншых патэнцыйных пратэстоўцаў. У меншай ступені прычыненне болю і пакутаў служыла мэце атрымання інфармацыі або прызнанняў. Катаванні і бесчалавечнае ды прыніжальнае для чалавечай годнасці абыходжанне было наўмысным, паколькі было шырока распаўсюджаным і сістэматычным, а таксама было накіравана на пратэстоўцаў, хоць некаторыя выпадковыя мінакі таксама сталі ахвярамі рэпрэсій. Гэтай сістэматычнай і распаўсюджанай мадэлі прытрымліваліся як у Мінску, так і ў іншых гарадах”.

Умовы ўтрымання ў турмах і ізалятарах

Умовы ўтрымання ў турмах і ізалятарах заставаліся дрэннымі і ў шматлікіх выпадках уяўлялі сабой пагрозу жыццю і здароўю.

Умовы ўтрымання: Паводле дадзеных былых зняволеных і юрыстаў-праваабаронцаў, па-ранейшаму адзначаўся недахоп харчавання, медыкаментаў, цёплай вопраткі, асабістых гігіенічных сродкаў і пасцельнай бялізны, а таксама недастатковая забяспечанасць базавай і неадкладнай медыцынскай дапамогай і чыстай пітной вадой. Затрыманыя паведамлялі, што ў якасці пакарання супрацоўнікі турмы наўмысна адмаўлялі ім у ежы, вадзе, гігіенічных сродках і неабходнай медыцынскай дапамозе, часам цягам некалькіх дзён. У цэлым санітарныя ўмовы былі дрэнныя. Улады не прыкладалі шмат намаганняў да прадухілення распаўсюду COVID-19 у месцах пазбаўлення волі, аднак у той самы час выкарыстоўвалі COVID-19 як падставу для абмежавання наведванняў і перадачы прадуктаў харчавання, гігіенічных сродкаў і вопраткі.

Праблемай працягвала заставацца перанаселенасць установаў дасудовага ўтрымання і турмаў, аднак закон аб амністыі ад 22 траўня скараціў тэрмін зняволення прынамсі 2 500 вязняў, што прывяло да іх вызвалення. Праз тры дні пасля выбараў 9 жніўня ў ізалятарах, асабліва ў Мінску, не хапала месца для тысяч затрыманых, якія былі арыштаваныя па абвінавачванні ў пратэстах. Паводле інфармацыі, у перапоўненых камерах ізалятараў, разлічаных на 5 чалавек, змяшчалася па 50 затрыманых, што вымушала іх па чарзе стаяць і адпачываць.

Хоць паступалі адзінкавыя заявы пра тое, што міліцыянты змяшчалі няпоўнагадовых падазраваных у камеры ізалятара часовага ўтрымання разам з дарослымі падазраванымі і асуджанымі, улады, як правіла, утрымлівалі няпоўнагадовых зняволеных асобна ад дарослых у калоніях для няпоўнагадовых, ізалятарах часовага ўтрымання і следчых ізалятарах. Умовы

ўтрымання зняволеных жанчын і няпоўнагадовых былі, як правіла, лепшымі, чым дарослых зняволеных мужчын.

Паводле меркаванняў назіральнікаў, у выніку дрэннай медыцынскай дапамогі ў месцах пазбаўлення волі былі шырока распаўсюджаныя туберкулёз, пнеўманія, ВІЧ/СНІД, COVID-19 і іншыя інфекцыйныя захворванні.

Асобы, затрыманыя па палітычных матывах да выбараў або падчас акцый пратэсту пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня, сутыкаліся з горшымі турэмнымі ўмовамі, чым асноўная маса зняволеных, уключна з паведамленнямі пра катаванні і жорсткае абыходжанне з імі.

Адміністрацыя: Зняволеныя і затрыманыя мелі абмежаваную магчымасць сустракацца з наведнікамі, а звычайным пакараннем за парушэнне дысцыпліны была адмова ў спатканні з сем'ямі. Улады абмяжоўвалі візіты да ўсіх затрыманых нібыта з мэтай скараціць распаўсюд COVID-19 ва ўстановах, нягледзячы на афіцыйнае непрызнанне ўрадам пандэміі COVID-19 і няздольнасць прыняць нацыянальныя каранцінныя меры.

Нягледзячы на гарантаваную законам свабоду веравызнання, улады звычайна забаранялі зняволеным праводзіць набажэнствы і здзяйсняць абрады, якія не адпавядалі турэмным правілам. Храмы Беларускай праваслаўнай царквы размяшчаліся ў шэрагу турмаў, і праваслаўныя святары, як правіла, мелі магчымасць праводзіць набажэнствы.

Ад былых зняволеных і іх адвакатаў паступалі звесткі, што супрацоўнікі турмы часта цэнзуравалі іх скаргі або не перадавалі іх у вышэйшыя інстанцыі, а таксама што турэмная адміністрацыя або адхіляла, або выбарачна разглядала просьбы аб расследаванні выпадкаў жорсткага абыходжання. Зняволеныя таксама паведамлялі, што турэмная адміністрацыя часта адмаўлялася прадстаўляць копіі адказаў на іх скаргі, што ў далейшым ускладняла іх абарону. Скаргі маглі справакаваць прыняцце супраць зняволеных, якія іх падавалі, мераў у адказ, уключна з прыніжэннем чалавечай годнасці, пагрозамі забойства або іншымі відамі пакаранняў або пераследу. Былыя зняволеныя сцвярджалі, што неаднаразовыя акты пераследу з боку турэмнай адміністрацыі прыводзілі да самазабойстваў, якія не былі расследаваны ўладамі і не атрымалі розгаласу.

Вялікай праблемай у турмах была карупцыя, і назіральнікі адзначалі, што ўмоўна-датэрміновае вызваленне нярэдка залежала ад хабару супрацоўнікам турмы або ад палітычных перакананняў зняволенага.

Незалежны маніторынг: Нягледзячы на шматлікія звароты ў Міністэрства ўнутраных спраў, дзяржаўныя чыноўнікі па-ранейшаму адмаўляліся даваць

НДА дазвол на наведванне следчых ізалятараў ды турмаў і размаўляць са зняволенымі.

г. Адвольны арышт або затрыманне

Закон абмяжоўвае магчымасць адвольных затрыманняў, аднак урад не зважаў на гэтыя абмежаванні. Улады, уключна з сілавікамі ў цывільным, арыштоўвалі і затрымлівалі тысячы грамадзян падчас мірных пратэстаў і выкарыстоўвалі адміністрацыйныя меры для затрымання палітычных і грамадскіх актывістаў, а таксама мінакоў ды журналістаў, якія не бралі ўдзелу ў пратэстах, да, падчас і пасля пратэстаў і іншых буйных грамадскіх акцый, у тым ліку і тых, што былі афіцыйна дазволены ў рамках выбарчых кампаній.

Працэдуры арышту і абыходжанне з затрыманымі

Паводле закона, міліцыя мусіць атрымаць санкцыю пракурора на затрыманне асобы больш чым на тры гадзіны. Улады могуць утрымліваць падазраванага ў злачынстве да 10 дзён без прад'яўлення афіцыйнага абвінавачання і да 18 месяцаў пасля прад'яўлення абвінавачання, аднак былі выпадкі, калі грамадзяне затрымліваліся на тэрмін больш за 18 месяцаў. Закон дазваляе затрыманым атрымліваць неадкладны доступ да адваката па сваім выбары або адваката, якога бясплатна прадастаўляе дзяржава, хоць улады часта абмяжоўвалі гэтае права ў дачыненні да вядомых палітвязняў, для якіх пачатковыя этапы афіцыйнага расследавання прайшлі без прысутнасці адвакатаў. Пракуроры, следчыя і прадстаўнікі службаў бяспекі маюць права працягнуць тэрмін затрымання без узгаднення з суддзёй. Затрыманыя маюць права падаваць апеляцыі адносна законнасці свайго ўтрымання, аднак улады часта адмаўляліся іх разглядаць або ігнаравалі падобныя скаргі. У краіне не існуе сістэмы вызвалення пад заклад.

Паступалі звесткі пра затрыманне асобаў без санкцыі суда.

Таксама паступала інфармацыя пра затрыманых, якія ўтрымліваліся без сувязі са знешнім светам. Падчас першых арыштаў пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня ў РУУС у затрыманых бралі адбіткі пальцаў і пакідалі без аніякай сувязі са знешнім светам у СІЗА да суду.

Цягам некалькіх тыдняў пасля выбараў каля 80 чалавек былі абвешчаныя зніклымі без вестак, але, у рэшце рэшт, яны знайшліся пасля таго, як улады прызналі факт іх затрымання або вызвалілі іх. Паводле паведамлення на "Радыё Свабода", 11 жніўня Юрый Савіцкі, прыхільнік затрыманага кандыдата ў

прэзідэнты Віктара Бабарыкі, пасля ўдзелу ў акцыі пратэсту быў выкрадзены шасцю мужчынамі ў цывільным. Ягоная жонка цягам некалькіх дзён спрабавала даведацца пра яго месцазнаходжанне, але ўлады паведамлялі, што зняволеных занадта шмат і што многія з іх афіцыйна не зарэгістраваныя. Яна змагла вызначыць месца яго знаходжання і высунутыя супраць яго абвінавачанні толькі пасля таго, як стаяла каля СІЗА ў Жодзіна з фотаздымкам свайго мужа, распытваючы тых, каго вызвалілі, ці пазнаюць яны ейнага мужа.

Адвольны арышт: Улады затрымлівалі палітолагаў, палітычных лідараў, удзельнікаў прэзідэнцкай кампаніі, лідараў і сябраў апазіцыі, актывістаў грамадзянскай супольнасці і дэманстрантаў па прычынах, якія шырока прызнаюцца палітычна матываванымі. Шмат у якіх выпадках улады выкарыстоўвалі адміністрацыйныя меры для затрымання палітычных актывістаў да, падчас і пасля запланаваных дэманстрацый, пратэстаў і іншых публічных мерапрыемстваў. Супрацоўнікі службаў бяспекі адвольна затрымлівалі людзей у раёнах, дзе пратэстоўцы мірна стаялі ў ланцугах уздоўж вуліц, або там, дзе чакаліся пратэсты (гл. раздзел 2.б.).

Так, напрыклад, 6 траўня ў Магілёве ўлады затрымалі папулярнага блогера і патэнцыйнага кандыдата ў прэзідэнты Сяргея Ціханоўскага падчас яго паездкі па краіне з мэтай сустрэчы з грамадзянамі. У 2019 годзе ён атрымаў 15 сутак адміністрацыйнага пакарання за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве. У адказ на яго арышт гледачы ягонага блога і стрымаў распачалі трохдзённыя акцыі пратэсту па ўсёй краіне. Супрацоўнікі праваахоўчых органаў без санкцыі суда затрымалі, а пазней і аштрафавалі або асудзілі больш за сотню актывістаў і прыхільнікаў Ціханоўскага нібыта за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах (гл. раздзел 2.б. «Мірныя сходы» і раздзел 3).

Пасля арышту лідара апазіцыі Віктара Бабарыкі (гл. раздзел 3) 28 чэрвеня супрацоўнікі КДБ і АМАПу адвольна затрымалі не менш як 52 вядомых бізнесоўцаў, палітычных дзеячаў, прыхільнікаў Бабарыкі і супрацоўнікаў яго штабу, а таксама незалежных журналістаў, якія сабраліся ля будынка КДБ, каб падаць хадайніцтва аб вызваленні Бабарыкі. Улады вызвалілі прынамсі 12 мясцовых незалежных журналістаў і іх замежных калег, а таксама 33 іншых асобаў пасля праверкі дакументаў у міліцыі. У далейшым не менш за сем чалавек апынуліся перад судом па адміністрацыйным абвінавачанні ў нібыта ўдзеле ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах і аказанні супраціву міліцыі.

Сілавікі рэгулярна затрымлівалі мінакоў, у тым ліку і тых, хто не ўдзельнічаў у пратэстах. Так, напрыклад, паводле дадзеных Human Rights Watch, 10 жніўня міліцыя затрымала будаўніка Аляксандра Газімава каля мінскага гандлёвага цэнтра, дзе сабраўся натоўп пратэстоўцаў. Паводле словаў Газімава, ён не

ўдзельнічаў у акцыі пратэсту і толькі што павячэраў з сябрам. Калі прыбыў АМАП, пратэстоўцы пабеглі, і Газімаў таксама пабег. Аднак на бягу ён зваліўся і зламаў нагу. Міліцыянты зацягнулі яго ў фургон, збілі, наўмысна наступаючы на зламаную нагу, і прыгразілі згвалціць дручком. Потым яны перадалі яго іншай групе міліцыянтаў, якія яго таксама збілі, даставілі ў мясцовае РУУС, дзе прымусілі стаць на зламаную нагу, затым вымусілі легчы на зямлю і зноў наўмысна ўдарылі ботам па зламанай назе. Усю ноч ён правёў у двары аддзялення міліцыі і быў пераведзены ў жодзінскі ізалятар, дзе два дні чакаў у турэмным шпіталі, а затым быў накіраваны ў лякарню на аперацыю. Незалежныя СМІ расказвалі пра дзясяткі аналагічных паведамленняў пра асобаў, якія не ведалі пра месцы правядзення акцый пратэсту ў сувязі з блакіроўкай ўладамі інтэрнэту, але былі схопленыя службамі бяспекі разам з пратэстоўцамі і адвольна затрыманыя.

Дасудовае ўтрыманне пад вартай: У 2018 годзе (апошнім, па якім былі даступны дадзеныя) пад вартай да суда ўтрымлівалася каля 5 000 чалавек. Інфармацыя пра сярэднюю працягласць часу знаходжання пад вартай або пра тое, колькі расследаванняў было працягнута на больш доўгі перыяд, адсутнічала. Назіральнікі меркавалі, што затрымкі былі выкліканыя шэрагам магчымых прычын, у тым ліку палітычным умяшальніцтвам; абвінавачаннямі, высунутымі супраць асобаў, якія знаходзіліся пад вартай да суда, і пачаткам расследавання; прызначэннем новых следчых, якім перадаваліся справы; справамі, якія патрабавалі грунтоўных судова-медыцынскіх або іншых экспертыз і аналізу. Так, напрыклад, цягам года былы галоўны інжынер Мінскага завода калёсных цягачоў Андрэй Галавач судзіўся з дзяржавай за кампенсацыю, якую ён хацеў атрымаць за праведзеныя ім ў СІЗА 4,5 года. Галавач быў вызвалены ў 2019 годзе пасля зняцця ўсіх абвінавачанняў і апраўдання ў двух асобных судовых працэсах.

Магчымасць да суда затрыманым аспрэчыць законнасць свайго затрымання: Затрыманыя маюць права звярнуцца да судовай сістэмы з нагоды законнасці свайго затрымання, аднак улады пастаянна спынялі або ігнаравалі такія звароты. Паводле закона, суды або пракуроры маюць 24 гадзіны, каб вынесці рашэнне аб затрыманні, і 72 гадзіны – аб арышце. У падобных выпадках суды праводзяць закрытыя слуханні, на якіх могуць прысутнічаць падазраваныя, адвакаты і іншыя законныя прадстаўнікі. Звароты аб абскарджанні затрыманняў звычайна адхіляліся.

д. Адмова ў справядлівым і адкрытым судовым разбіральніцтве

Канстытуцыя прадугледжвае незалежнасць судовай сістэмы, аднак улады не паважалі прынцып незалежнасці і непрадузятасці суддзяў. Назіральнікі адзначалі шырокі распаўсюд карупцыі, неэфектыўнасць і палітычнае ўмяшальніцтва ў працэс прыняцця рашэнняў. Суды выносілі прысуды на

падставе лжывых і палітычна матываваных абвінавачанняў, якія прад'яўляліся пракурорамі, і, на думку назіральнікаў, высокапастаўленыя дзяржаўныя чыноўнікі і прадстаўнікі мясцовых уладаў дыктавалі суддзям іх рашэнні.

Як і ў папярэднія гады, паводле інфармацыі праваабарончых арганізацый, пракуроры мелі празмерныя і незбалансаваныя паўнамоцтвы, паколькі маглі працягваць тэрмін утрымання без санкцыі суддзяў. Адвакаты абароны не маглі азнаёміцца з матэрыяламі следства, прысутнічаць пры правядзенні следчых дзеянняў і допытаў або азнаёміцца з доказамі абвінавачання, пакуль пракурор афіцыйна не перадасць справу ў суд. Адвакаты лічылі, што некаторыя доказы было складана аспрэчыць, таму што ўся тэхнічная экспертыза знаходзілася пад кантролем Генеральнай пракуратуры. Паводле меркавання шматлікіх адвакатаў, гэты дысбаланс паўнамоцтваў захоўваўся на працягу года, асабліва ў палітычна матываваных крымінальных і адміністрацыйных справах. За выключэннем рэдкіх выпадкаў, суды не выносілі апраўдальных прысудаў абвінавачаным па крымінальных справах.

Паступалі паведамленні пра рэпрэсіўны пераслед і пазбаўленне права ажыццяўляць абарону ў дачыненні да адвакатаў, якія прадстаўлялі інтарэсы палітычных кампаній, апазіцыйных лідараў і Каардынацыйнай рады. Так, напрыклад, 24 верасня знікла Людміла Казак, абаронца чальца прэзідыума апазіцыйнай Каардынацыйнай рады Марыі Калеснікавай. Пазней стала вядома, што яе выкралі на мінскай вуліцы невядомыя і даставілі ў ізалятар. Казак абвінавацілі і пакаралі за аказанне супраціву міліцыі на апазіцыйным мітынгу 30 жніўня, на якім яна не прысутнічала. Казак была аштрафаваная прыкладна на 675 рублёў (277 даляры) па справе, якую праваабарончыя арганізацыі і сама адвакатка прызналі палітычна матываванай помстай за дзейнасць па абароне Калеснікавай.

15 кастрычніка вядомы юрыст і чалец Мінскай гарадской калегіі адвакатаў цягам 30 год Аляксандр Пыльчанка пазбавіўся ліцэнзіі на адвакацкую дзейнасць нібыта за заявы, зробленыя 14 жніўня ў інтэрв'ю незалежным СМІ, у якіх ён заклікаў да прыняцца Генеральнай пракуратурай прававых мераў па прыцягненні да адказнасці прадстаўнікоў праваахоўчых органаў за жорсткае абыходжанне з затрыманымі і арыштаванымі падчас паслявыбарчых мірных акцый пратэсту. Пыльчанка абараняў кандыдата ў прэзідэнты Віктара Бабарыку і чальца прэзідыума Каардынацыйнай рады Марыю Калеснікаву. Бабарыка заявіў, што ануляванне ліцэнзіі Пыльчанкі было спробай уладаў пазбавіць яго права на юрыдычную абарону.

9 верасня ўлады пасля вобшуку ў кватэрах затрымалі чальца прэзідыума Каардынацыйнай рады і аднаго з адвакатаў Бабарыкі Максіма Знака, а таксама Ілью Салея, адваката чальца прэзідыума Каардынацыйнай рады Марыі Калеснікавай. Адвакаты сцвярджалі, што арышт Знака - гэта помста за тое, што

21 жніўня ён падаў у Вярхоўны суд скаргу з патрабаваннем прызнаць вынікі прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня несапраўднымі праз шырока распаўсюджаныя факты іх фальсіфікацыі. Салей быў арыштаваны праз два дні пасля выкрадання супрацоўнікамі сілаў бяспекі ў масках Калеснікавай па абвінавачанні ў закліку да дзеянняў, якія наносяць шкоду нацыянальнай бяспецы краіны, а таксама да гвалтоўнага звяржэння рэжыму. Салей заставаўся пад вартай да 16 кастрычніка, калі яго змясцілі пад хатні арышт.

Судовыя працэдуры

Закон гарантуе права на справядлівы і адкрыты суд, аднак улады часта ігнаравалі гэтае права. Паводле закона, абвінавачаныя па крымінальных справах могуць утрымлівацца пад вартай да 10 дзён без паведамлення пра тое, у чым іх абвінавачваюць, але ў іх мусіць быць дастаткова часу для падрыхтоўкі да абароны. Аднак памяшканні не адпавядалі патрабаванням і ў многіх выпадках сустрэчы з адвакатамі мелі абмежаванні або не з'яўляліся канфідэнцыйнымі. Паведамляецца, што часам улады прымушалі падазраваных сведчыць супраць саміх сябе і іншых падазраваных па справе, а таксама прызнаваць сваю віну. У гэтых выпадках улады, паводле інфармацыі, заяўлялі, што прысуды будуць больш мяккімі і абвінавачаныя атрымаюць таксама іншыя ільготы. Паступалі таксама паведамленні пра тое, што ўлады вымушалі падазраваных да падпісання прызнальных паказанняў і іншых заяваў.

Закон гарантуе прэзумпцыю невінаватасці. Разам з тым, адсутнасць незалежнасці судоў, манера дзяржаўных СМІ паведамляць пра рэзанансныя справы такім чынам, нібыта віна ўжо даказаная, а таксама шырока распаўсюджаная практыка абмежавання права на абарону нярэдка вялі да таго, што цяжар даказвання ўласнай невінаватасці ўскладаўся на самога абвінавачванага.

Закон таксама прадугледжвае прынцып адкрытага судовага разгляду, аднак улады ў некаторых выпадках рабілі судовыя працэсы закрытымі і праводзілі іх у кабінетах суддзяў. Суддзі прымаюць рашэнне па ўсіх судовых справах. Пры разглядзе найбольш сур'ёзных спраў суддзям дапамагаюць двое народных засядацеляў.

Закон дае абвінавачаным права прысутнічаць на паседжаннях, аспрэчваць паказанні сведак і прадстаўляць доказы ад свайго імя, аднак улады не заўсёды ўлічвалі гэтае права. Некаторых абвінавачаных судзілі завочна. Акрамя таго, АМАП і іншыя супрацоўнікі службаў бяспекі, якія сведчылі супраць абвінавачаных па гэтых справах, не прадстаўляліся і давалі паказанні ў масках, што тлумачылася "клопатам пра іх бяспеку".

Закон прадугледжвае права затрыманых на дапамогу адваката і абавязвае суды прызначаць адваката тым асобам, якія не могуць сабе гэтага дазволіць. Хоць, паводле закона, падсудныя могуць патрабаваць, каб суды адбываліся па-беларуску, большасць суддзяў і пракурораў, якія не валодалі свабодна беларускай мовай, адхілялі хадайніцтвы аб забеспячэнні перакладчыкамі і вялі паседжанні на рускай мове, адной з дзяржаўных у краіне. Перакладчыкі забяспечваліся ў тым выпадку, калі падсудныя не размаўлялі ні па-беларуску, ні па-руску. Закон прадугледжвае права грамадзян свабодна выбіраць адваката для абароны сваіх інтарэсаў у судзе, аднак прэзідэнцкі дэкрэт забараняў прадстаўнікам НДА, якія з'яўляюцца адвакатамі, абараняць у судзе інтарэсы якіх-кольвечы асоб, за выключэннем сябраў сваёй арганізацыі. Спробы ўладаў адклікаць ліцэнзіі ў юрыстаў, якія абаранялі інтарэсы палітычных апанентаў рэжыму, яшчэ больш абмяжоўвалі падсудных у выбары адвакатаў. Улады таксама патрабавалі ад адвакатаў падпісваць заявы аб неразгалошванні, што абмяжоўвала іх магчымасць перадаваць якую-кольвечы інфармацыю па судовай справе грамадскасці, сродкам масавай інфармацыі і нават сваякам падсудных.

У выпадку прад'яўлення абвінавачанняў па адміністрацыйных справах, уключна з удзелам у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах і аказаннем супраціву супрацоўнікам праваахоўчых органаў, суддзі часта не інфармавалі затрыманых пратэстоўцаў аб іх праве на абарону і адхілялі запыты адвакатаў аб выкліку ў суд дадатковых сведкаў для дачы паказанняў. Улады ўсё часцей выкарыстоўвалі фармат відэаканферэнцыі, каб дазволіць абвінавачаным аддалена прысутнічаць на слуханнях і судовых працэсах, нібыта з мэтай абмежавання распаўсюду COVID-19 у месцах утрымання пад вартай. Аднак пасля выбараў 9 жніўня гэтай практыкай пачалі злоўжываць, калі, паводле звестак, некаторых затрыманых судзілі ў жодзінскім СІЗА "віртуальна", без прысутнасці адвакатаў і сведак.

Некаторыя суды ставілі пад сумнеў законнасць дамоваў, зараней падпісаных паміж адвакатам і адказчыкам, альбо выкарыстоўвалі факт наяўнасці гэтых дакументаў супраць адказчыка. Так, напрыклад, 11 верасня Мінскі раённы суд прызнаў вінаватым і аштрафаваў спецыяліста па інфармацыйных тэхналогіях Паўла Манько за нібыта ўдзел 27 жніўня ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. Суддзя Жанна Хвайніцкая заявіла, што "той факт, што Манько меў дамову з адвакатам ад 3 жніўня, сведчыць пра яго непасрэдны намер узяць удзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах".

Суды часта дазвалялі выкарыстоўваць супраць абвінавачаных паказанні, атрыманыя падчас допытаў з прымяненнем сілы і пагроз нанясення цялесных пашкоджанняў.

Падсудныя маюць права абскарджання судовага рашэння, і большасць з іх карысталася гэтым правам. Разам з тым, у пераважнай большасці спраў апеляцыйныя суды пакідалі рашэнні ніжэйстаячых судоў у сіле.

Палітвязні і асобы, затрыманыя па палітычных матывах

Мясцовая праваабарончая арганізацыя “Вясна” вяла спіс палітычных зняволеных у краіне, які, паводле меркаванняў многіх, заслугоўвае даверу. Па стане на снежань у ім было 160 імёнаў, у тым ліку імёны лідараў палітычнай апазіцыі і іх супрацоўнікаў.

Так, напрыклад, 2 верасня ўлады затрымалі чатырох супрацоўнікаў IT-кампаніі PandaDoc: Віктара Куўшынава, Дзмітрыя Рабцэвіча, Юлію Шардыка і Уладзіслава Міхалапа. Двума тыднямі раней уладальнік кампаніі Мікіта Мікада публічна асудзіў палітычныя рэпрэсіі ў краіне і выступіў з грамадскай ініцыятывай “Абарані Беларусь”, накіраванай на фінансавую падтрымку супрацоўнікаў праваахоўчых органаў, якія адмовіліся браць удзел у рэпрэсіях. Улады абвінавацілі чатырох супрацоўнікаў кампаніі ў крадзяжы, за што ім пагражае да 10 год пазбаўлення волі. Абвінавачанні шырокай грамадскасцю былі расцэненыя як помста Мікаду і былі накіраваныя на стрымліванне палітычнай актыўнасці іншых тэхналагічных кампаній. 12 кастрычніка ўлады выпусцілі Рабцэвіча, Шардыка і Міхалапа пад хатні арышт, але абвінавачанні з іх не знялі. Па стане на канец снежня Куўшынаў заставаўся за кратамі, а “Вясна” абвясціла ўсіх чатырох супрацоўнікаў PandaDoc палітвязнямі.

Былыя палітвязні па-ранейшаму не маглі карыстацца некаторымі грамадзянскімі і палітычнымі правамі.

Грамадзянска-прававыя працэдуры і сродкі судовай абароны

Закон прадугледжвае права грамадзян падаваць судовыя пазовы аб кампенсацыі шкоды, звязанай з парушэннем правоў чалавека, аднак грамадзянскія суды не былі незалежнымі і рэдка праяўлялі аб’ектыўнасць у такіх пытаннях.

Рэстытуцыя маёмасці

Не існуе законаў, якія б прадугледжвалі рэстытуцыю або кампенсацыю прыватнай нерухомасці, канфіскаванай цягам II Сусветнай вайны, Халакосту і савецкага перыяду. У 2019 годзе ўрад паведамляў, што на працягу апошніх 11 гадоў не атрымліваў ніякіх запытаў з патрабаваннямі аб кампенсацыі або рэстытуцыі маёмасці ад фізічных асоб, НДА або любых іншых грамадскіх арганізацый, габрэйскіх ці замежных.

Для атрымання інфармацыі аб рэстытуцыі ўласнасці часоў Халакосту і па звязаных з гэтым тэмах, калі ласка, глядзіце *Справаздачу Дзяржаўнага дэпартамента юстыцыі перад Кангрэсам ЗША аб кампенсацыі ахвярам Халакосту* ад 29 чэрвеня: https://www.state.gov/reports/just-act-report-to-congress/.

е. Адвольнае парушэнне недатыкальнасці прыватнага і сямейнага жыцця, жытла і перапіскі

Закон забараняе падобныя дзеянні, аднак урад ігнараваў гэтую забарону. Улады ажыццяўлялі праслухоўванне тэлефонных размоваў ды відэаназіранне і выкарыстоўвалі сетку інфарматараў, што з'яўляецца парушэннем недатыкальнасці прыватнага жыцця грамадзян.

Закон патрабуе прад'яўлення ордара да або адразу пасля правядзення вобшуку. КДБ мае права ў любы час увайсці ў любы будынак пры ўмове звароту па выдачу ордара цягам 24 гадзін пасля ажыццяўлення гэтага дзеяння.

Паступалі паведамленні пра пранікненне ўладаў у прыватныя памяшканні без судовай або іншых адпаведных санкцый. У жніўні і верасні былі зарэгістраваныя шматлікія выпадкі, калі супрацоўнікі ў цывільным гвалтоўным чынам траплялі ў прыватныя дамы або на прадпрыемствы. Яны часта адмаўляліся паказваць пасведчанне асобы або ордар, сцвярджалі, што ім дастаткова заявіць пра сваю прыналежнасць да дзяржаўнай установы, і заходзілі ў памяшканне. 7 верасня чалавек, ідэнтыфікаваны як кіраўнік Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Мікалай Карпянкоў неаднаразова нанёс удары па шкляных дзвярах кавярні і ў выніку разбіў іх, каб супрацоўнікі службаў бяспекі ў цывільным змаглі затрымаць асобаў, якія, паводле іх меркаванняў, удзельнічалі ў пратэстах.

Паступалі звесткі пра тое, што органы ўлады ажыццяўлялі доступ да прыватных паведамленняў і асабістых дадзеных, іх збор і выкарыстанне адвольна і незаконна, не маючы на тое адпаведных юрыдычных паўнамоцтваў. Так, напрыклад, пасля выбараў 9 жніўня супрацоўнікі службаў бяспекі перыядычна пад пагрозай гвалту і арышту вымушалі затрыманых на акцыях пратэсту разблакоўваць сотавыя тэлефоны для праверкі. Афіцыйныя асобы таксама пагражалі тым, хто знаходзіўся ў следчых ізалятарах, больш жорсткімі выракамі, калі тыя не разблакуюць свае сотавыя тэлефоны. Паводле звестак, супрацоўнікі службаў бяспекі затрымлівалі і выносілі больш суворыя выракі тым асобам, у сацыяльных сетках якіх знаходзілі фотаздымкі ці ўліковыя

запісы, што падаваліся ім апазіцыйнымі ці дэманстравалі жорсткія дзеянні сілавікоў.

Паводле справаздачы арганізацыі Freedom House аб свабодзе ў інтэрнэт-прасторы за 2019 год, у краіне выкарыстоўваюцца сістэматычныя і складаныя метады назірання за сваімі грамадзянамі. З 2010 года ўрад выкарыстоўваў распрацаваную ў Расіі Сістэму аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў, якая забяспечвала органам улады наўпроставы аўтаматызаваны доступ да дадзеных, атрыманых ад стацыянарных тэлефонных сетак, мабільных апаратараў і інтэрнэт-правайдараў. Урад таксама блакаваў і фільтраваў вэб-сайты і платформы сацыяльных сетак (гл. раздзел 2.а. “Свабода інтэрнэту”). У краіне працавала цэнтралізаваная сістэма назірання.

Паведамляецца, што супрацоўнікі дзяржаўнага тэлебачання атрымлівалі ад службаў дзяржбяспекі матэрыялы назірання і пратаколы праслухоўвання, якія выкарыстоўвалі для вытворчасці праўладных дакументальных фільмаў і рэпартажаў.

Паводле словаў актывістаў, пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня ўлады выкарыстоўвалі на дзяржаўных прадпрыемствах сістэму інфарматараў, каб даведацца, якія працоўныя будуць страйкаваць, а таксама вымушалі працоўных не ўступаць у страйкамы. Паведамлялася, што за падтрыманне сістэмы інфарматараў на дзяржаўных прадпрыемствах адказвалі ідэалагічныя работнікі.

Паведамлялася, што сваякоў маглі пакараць за злачынства, нібыта здзейсненае іх роднымі. Так, напрыклад, мінскі лекар, які сышоў са шпіталя ў знак пратэсту супраць гвалту міліцыі ў дачыненні да мірных дэманстрантаў у жніўні, паведаміў, што ягоную жонку, таксама лекарку таго самага шпіталя, вымусілі звольніцца з працы. Напрыканцы жніўня абодва пакінулі краіну праз страх перад пераследам.

Улады часова адбіралі дзяцей у бацькоў або пагражалі пазбавіць іх бацькоўскіх правоў, каб пакараць за пратэсты або палітычную актыўнасць. 13 верасня кіраўнік аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства аб няпоўнагадовых і моладзі Генпракуратуры Аляксей Падвойскі заявіў дзяржаўным СМІ, што бацькі, якія бяруць з сабой дзяцей на акцыі пратэсту, рызыкуюць пазбавіцца бацькоўскіх правоў, і што такія дзеянні будуць кваліфікавацца як “пагарджанне бацькоўскімі абавязкамі”. Паводле СМІ, напрыклад, 27 верасня на акцыі пратэсту ў Гомелі быў затрыманы Герман Сняжкоў. 29 верасня прадстаўнікі ўладаў уварваліся ў яго дом і арыштавалі жонку Наталлю, а таксама забралі двух няпоўнагадовых дзяцей, якіх накіравалі ў дзяржаўны дзіцячы дом.

Дапытаўшы, Наталлю Сняжкову адпусцілі, і яна пакінула краіну пасля таго, як вярнула апеку над сваімі дзецьмі. Пасля таго, як Герман Сняжкоў адбыў 14 сутак арышту, яму было прад'яўлена абвінавачанне ў аказанні супраціву супрацоўнікам праваахоўчых органаў і ва ўжыванні або пагрозе ўжывання гвалту, а таксама яму паведамілі, што і яго жонка з'яўляецца падазраванай па гэтай самай справе. Ён быў вызвалены, але з 15 лістапада яму быў забаронены выезд з краіны. Дакладна такім самым чынам кандыдаты ў прэзідэнты Святлана Ціханоўская і Валерый Цапкала, а таксама дзеці абаіх і жонка Цапкалы пакінулі краіну пасля таго, як, паводле звестак, іх пачалі запалохваць і пагражаць пазбавіць бацькоўскіх правоў.

Нягледзячы на тое, што закон забараняе ўладам перахопліваць тэлефонныя размовы і камунікацыі іншага кшталту без санкцый пракурора, улады рэгулярна праслухоўвалі жылыя памяшканні, тэлефоны і кантралявалі кампутарную перапіску. Амаль усе апазіцыйныя палітычныя дзеячы і многія вядомыя прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці паведамлялі пра тое, што ўлады праслухоўвалі іх перамовы і сачылі за іх дзейнасцю. Улады працягвалі збіраць і атрымліваць асабістую інфармацыю незалежных журналістаў і дэмакратычных актывістаў падчас рэйдаў, а таксама праз канфіскаваную кампутарную тэхніку.

Закон дазваляе супрацоўнікам КДБ, Міністэрства ўнутраных спраў, спецслужбаў, фінансавай выведкі і пэўных падраздзяленняў памежнай аховы выкарыстоўваць прылады для праслухоўвання тэлефонных размоваў. Для праслухоўвання патрабуецца санкцыя пракурора, аднак праз адсутнасць незалежнасці пракураў гэтае патрабаванне робіцца бессэнсоўным.

Міністэрства сувязі мае права спыняць аказанне тэлефонных паслуг асобам, якія парушаюць падпісаныя з імі дамовы на аказанне паслуг тэлефоннай сувязі, а такія дамовы забараняюць выкарыстоўваць тэлефонную сувязь у мэтах, што супярэчаць інтарэсам дзяржавы і грамадскаму парадку.

Раздзел 2. Захаванне грамадзянскіх свабод, у тым ліку:

а. Свабоды выказвання, у тым ліку ў СМІ.

Канстытуцыя прадугледжвае свабоду выказвання, у тым ліку і ў друку. Аднак урад не забяспечваў захаванне гэтых правоў і выбарачна прымяняў шматлікія законы для кантролю і цэнзуры ў дачыненні да грамадства і сродкаў масавай інфармацыі. Больш за тое, дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі выступалі ў падтрымку прэзідэнта і афіцыйнай палітыкі, не даючы пляцоўкі для іншых крытычных выказванняў.

Свабода слова і выражэння: Грамадзяне не маглі публічна крытыкаваць прэзідэнта і ўрад або абмяркоўваць агульнаграмадскія пытанні праз страх рэпрэсій, уключна з судовым пераследам і прымусовай ссылкай. Улады таксама забаранялі дэманстраваць некаторыя гістарычныя сцягі ды сімвалы і плакаты са зместам, што нібыта ўяўляў пагрозу для ўладаў ці грамадскага парадку.

Пачынаючы з траўня, улады зрабілі значныя захады па абмежаванні свабоды слова. Улады пераследавалі блогераў і карыстальнікаў сацыяльных сетак, затрымліваючы некаторых з іх на суткі. Астатнія атрымлівалі больш доўгія тэрміны пазбаўлення волі. Так, напрыклад, паводле дадзеных Камітэта па абароне журналістаў, у чэрвені ўлады затрымалі Сяргея Пятрухіна і Аляксандра Кабанава, двух папулярных YouTube-блогераў, і абвінавацілі іх ва “ўдзеле ў дзейнасці, звязанай з яўным непадпарадкаваннем законным патрабаванням уладаў”. Абодва мужчыны вядомыя сваімі апазіцыйнымі палітычнымі выказваннямі.

Улады звольнілі сотні супрацоўнікаў дзяржаўных устаноў, якія выказвалі сваю палітычную нязгоду або бралі ўдзел у пратэстах пасля прэзідэнцкіх выбараў, у тым ліку тэле- і радыёвядоўцаў, іншых работнікаў СМІ, настаўнікаў, дзяржслужачых, супрацоўнікаў праваахоўчых органаў, спартоўцаў, прадстаўнікоў адміністрацыі універсітэтаў і шпіталяў, а таксама дыпламатаў. Так, напрыклад, 17 жніўня Міністэрства культуры звольніла дырэктара Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы Паўла Латушку за тое, што ён выступіў у абарону збітых міліцыяй мітынгоўцаў. Пасля яго звальнення большасць супрацоўнікаў тэатра звольніліся.

Закон таксама абмяжоўвае свабоду слова шляхам крыміналізацыі такіх дзеянняў, як перадача замежніку інфармацыі пра палітычны, эканамічны, сацыяльны, ваенны або міжнародны стан краіны, якая, паводле уладаў, з'яўляецца лжывай або кампраметуючай. Не было выяўлена ніводнай асобы, якая б абвінавачвалася паводле гэтага закона.

Улады забаранялі заклікі да ўдзелу ў “несанкцыянаваных дэманстрацыях”. 12 сакавіка Мінскі раённы суд судзіў завочна відэаблогера Уладзіміра Цыгановіча па абвінавачанні ў закліку да ўдзелу ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве і прысудзіў яму 15 сутак пазбаўлення волі. Паведамляецца, што ў відэароліку Цыгановіч заклікаў сваіх прыхільнікаў прыйсці да штаб-кватэры дзяржаўнага прадпрыемства “Белнафтахім” у знак пратэсту супраць павышэння з 25 лютага цэн на бензін. 9 чэрвеня міліцыя затрымала Цыгановіча і адправіла на суткі, а 15 чэрвеня яму былі прысуджаныя дадатковыя 15 сутак за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве 31 траўня. 26 чэрвеня праваабарончыя арганізацыі паведамілі, што ўлады абвінавацілі Ціхановіча ў

арганізацыі і ўдзеле ў дзейнасці, якая груба парушае грамадскі парадак і звязаная з супраціўленнем загадам уладаў. Па стане на канец года па гэтых абвінавачаннях ён заставаўся за кратамі.

12 лістапада Драгічынскі суд аштрафаваў мясцовага жыхара на 999 рублёў (410 даляраў) за заклік сабрацца 15 кастрычніка ў цэнтры горада. У той жа дзень міліцыя затрымала жыхара. Яго выпусцілі, але абвінавачанні не былі высунуты да атрымання вынікаў судовых слуханняў.

Улады забараняюць "экстрэмісцкую" інфармацыю, пад якой разумеюць інфармацыйныя матэрыялы, у тым ліку друкаваныя, аўдыёматэрыялы, візуальныя і відэаматэрыялы, плакаты, банеры і іншыя візуальныя матэрыялы, прызначаныя для публічнага выкарыстання або распаўсюду і накіраваныя на гвалтоўную змену канстытуцыйнага ладу або тэрытарыяльнай цэласнасці краіны; захоп дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам; стварэнне незаконных узброеных фармаванняў; тэрарыстычную дзейнасць; распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай варожасці ў грамадстве; арганізацыю масавых беспрадкаў; хуліганства і вандалізм на глебе расавай, этнічнай, рэлігійнай і іншай варожасці ў грамадстве; палітычную або ідэалагічную нянавісць; прасоўванне ідэі перавагі пэўнай грамадскай групы на падставе мовы, сацыяльнай, расавай, этнічнай або рэлігійнай прыналежнасці; а таксама апраўданне нацызму, уключна з прасоўваннем, вытворчасцю, распаўсюдам і дэманстрацыяй нацысцкай сімволікі.

20 кастрычніка Мінскі раённы суд прызнаў экстрэмісцкім Тэлеграм-канал NEXTA-Live, платформу, з дапамогай якой апазіцыйна настроеныя беларусы ладзяць акцыі пратэсту, а таксама лагатып канала, заявіўшы, што ён садзейнічае масавым пратэстам і беспарадкам у дадатак да распаўсюду іншых "экстрэмісцкіх" матэрыялаў (гл. раздзел "Свабода інтэрнэту" ніжэй). Акрамя таго, улады абвінавацілі стваральніка канала Сцяпана Пуцілу і яго былога рэдактара Рамана Пратасевіча ў арганізацыі масавых беспарадкаў, арганізацыі групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, а таксама ў распальванні нянавісці да прадстаўнікоў прафесійных груп, у прыватнасці, да супрацоўнікаў праваахоўчых органаў і супрацоўнікаў дзяржапарата. Абедзве гэтыя асобы знаходзіліся за межамі Беларусі, але былі абвешчаныя ў росшук. Улады таксама забараняюць кантэнт, які прапагандуе гвалт і вайну; утрымлівае інфармацыю пра незаконную зброю, выбуховыя рэчывы і наркотыкі; звязаны з гандлем людзьмі або парнаграфіяй; а таксама той, што можа нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам краіны.

Закон не прадугледжвае штрафаў за выяву або захоўванне незарэгістраванай сімволікі, у тым ліку апазіцыйных бел-чырвона-белых сцягоў, але дазваляе падчас санкцыянаваных масавых мерапрыемстваў выкарыстоўваць толькі

зарэгістраваную сімволіку. Хоць герб “Пагоня” і ўнесены ў рэестр дзяржаўных гістарычных і культурных сімвалаў, улады выказвалі варожае стаўленне ў адносінах да пратэстоўцаў, якія неслі бел-чырвона-белыя сцягі і “Пагоню”, а сілавікі затрымлівалі такіх дэманстрантаў, паколькі гэтыя сімвалы звычайна атаясамліваліся з апазіцыяй.

Улады забараняюць распаўсюд “фэйкавых навінаў” у інтэрнэце, але гэтую забарону не прымяняюць у дачыненні да звычайных грамадзян.

Свабода сродкаў масавай інфармацыі, уключна з анлайн-медыямі:
Абмежаванні, усталяваныя ўрадам, звужалі доступ да інфармацыі. Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі не забяспечвалі збалансаванае асвятленне падзеяў і ў пераважнай большасці падавалі іх афіцыйную версію. З’яўленне апазіцыйных палітыкаў у дзяржаўных СМІ адбывалася рэдка і пераважна абмяжоўвалася выпадкамі, прадугледжанымі законам на перыяд правядзення выбарчых кампаній. Улады папярэджвалі, штрафавалі, затрымлівалі, праводзілі допыты і пазбаўлялі акрэдытацыі прадстаўнікоў незалежных СМІ.

2 кастрычніка ўлады адмянілі акрэдытацыю ўсіх прадстаўнікоў замежнай прэсы ў рамках працэсу, які, паводле іх заяваў, быў спробай абнавіць працэс акрэдытацыі для замежных СМІ. Перад адменай у жніўні ўлады ўжо пачалі адмяняць акрэдытацыю замежнай прэсы, у тым ліку BBC, Радыё Свабода, Associated Press, нямецкага тэлеканала ARD, Deutsche Welle, французскага агенцтва навін France-Presse, Reuters і расійскага “Дождя”. Такім самым чынам Міністэрства замежных спраў не акрэдытавала дзясяткі замежных карэспандэнтаў, якія падалі дакументы, каб асвятляць прэзідэнцкія выбары 9 жніўня. Некаторыя карэспандэнты былі паўторна акрэдытаваныя, сярод іх Deutsche Welle і BBC, але цэлы шэраг беларускіх пазаштатных карэспандэнтаў - не.

Да адмены 2 кастрычніка акрэдытацыі замежных журналістаў улады адмовілі ў акрэдытацыі некаторым замежным СМІ, такім як тэлебачанне “Белсат” і радыё “Рацыя”, якія базуюцца ў Польшчы, і рэгулярна штрафавалі неакрэдытаваных пазаштатных журналістаў, якія працавалі на гэтыя агенцыі. Па стане на 10 снежня не менш за 17 журналістаў былі аштрафаваныя ў 30 выпадках за адсутнасць дзяржаўнай акрэдытацыі або за супрацоўніцтва з замежнымі СМІ. Большая частка штрафаў у сувязі з адсутнасцю акрэдытацыі была накладзена на журналістаў, якія працавалі на тэлеканале “Белсат”.

Улады дэпартавалі некаторых прадстаўнікоў замежных СМІ. Напрыклад, 29 жніўня ўлады дэпартавалі двух карэспандэнтаў маскоўскага прадстаўніцтва

Associated Press у рамках шэрагу захадаў, якія прывялі да скарачэння колькасці незалежных карэспандэнтаў у краіне.

Згодна з законам, урад мае права закрыць любое друкаванае або анлайнавае выданне пасля вынясення двух папярэджанняў цягам аднаго года за парушэнне шэрагу абмежаванняў, усталяваных для прэсы. Акрамя таго, паводле нарматыўных актаў, улады надзеленыя правам па сваім меркаванні забараняць або цэнзураваць журналісцкія рэпартажы. Міністэрства інфармацыі можа на тры месяцы прыпыняць дзейнасць часопісаў або газет без пастановы суда. Закон таксама забараняе СМІ распаўсюджваць інфармацыю ад імя незарэгістраваных палітычных партый, прафсаюзаў і НДА. 1 кастрычніка Міністэрства інфармацыі да 30 снежня прыпыніла рэгістрацыю ў якасці "сеткавага медыя-выдання" аднаго з самых папулярных незалежных навінавых анлайн-парталаў TUT.by пасля вынясення чатырох папярэджанняў у сувязі з асобнымі публікацыямі, у тым ліку адной падрабязнай справаздачай аб парушэннях, якія назіральнікі зафіксавалі ў дзень выбараў. 3 снежня Эканамічны суд Мінска пастанавіў пазбавіць яго афіцыйнага статусу СМІ са студзеня 2021 года. Арганізацыя планавала падаць апеляцыю, аднак не здолела захаваць свой статус у працэсе апеляцыі.

Дзяржаўныя СМІ панавалі на інфармацыйным полі і мелі найбольшыя наклады, дзякуючы шчодрым субсідыям і прэферэнцыям. У краіне не існавала прыватнага тэлебачання, якое б вяшчала на ўсю яе тэрыторыю, і ў медыяпрасторы вяшчання дамінавалі дзяржаўныя і расійскія тэлестанцыі. Пасля таго, як шэраг супрацоўнікаў дзяржаўнага тэлебачання звольніліся ў знак пратэсту супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў і далейшага гвалту з боку міліцыі, які распачаўся ў жніўні, Лукашэнка звярнуўся па дапамогу да расійскага дзяржаўнага навінавага тэлеканала RT. Пачынаючы з 17 жніўня, расійскія дзяржаўныя СМІ ў значнай ступені кантралявалі і кіравалі дзяржаўнымі тэлеканаламі з мэтай забяспечыць дамінаванне ў прэсе пралукашэнкаўскага і прарасійскага пунктаў гледжання, у той час як улады заціскалі ўнутраныя незалежныя галасы і аказвалі ціск на дзяржаўных журналістаў, якія сышлі ў адстаўку. Пасля 17 жніўня, калі RT стаў падтрымліваць і кантраляваць беларускія дзяржаўныя СМІ, прадстаўнікі расійскіх дзяржаўных СМІ ў цэлым адчувалі меншы ціск з боку ўладаў.

<u>Гвалт і пераслед:</u> Улады па-ранейшаму рэгулярна пераследавалі і затрымлівалі мясцовых ды замежных журналістаў, перадусім тых, хто займаўся фрылансам або працаваў на замежныя СМІ без акрэдытацыі. Сілавікі ўвесь час першкаджалі незалежным айчынным і замежным журналістам асвятляць перадвыбарчыя і паслявыбарчыя дэманстрацыі і пратэсты ў Мінску і па ўсёй краіне, а часам практыкавалі гвалт у дачыненні да журналістаў і высоўвалі

супраць іх ілжывыя абвінавачанні. Па стане на лістапад незалежная Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ) паведамляла, што з пачатку года зафіксавала не меней за 500 выпадкаў гвалту і пераследу ў адносінах да мясцовых і замежных журналістаў, уключна з затрыманнямі, збіццём, нападамі, штрафамі і кароткатэрміновымі зняволеннямі. Паведамляецца, што гэтыя выпадкі былі звязаныя з меркаваным удзелам журналістаў у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах, стрымах дэманстрацый або працы без акрэдытацыі ў замежных СМІ. 12 кастрычніка БАЖ выступіла з заявай, у якой адзначыла, што сітуацыя для журналістаў у краіне з "цяжкай" ператварылася ў "катастрафічную" праз гвалт і іншыя формы ціску на журналістаў.

Прывядзем адзін прыклад ціску з боку ўладаў, калі міліцыя затрымала двух журналістаў незалежнай газеты "Ганцавіцкі час" Аляксандра Пазняка і Сяргея Багрова падчас жывога стрыму ў Ганцавічах. Паведамляецца, што ў мясцовым аддзяленні міліцыі Пазняка збівалі і выказвалі ў яго бок пагрозы. Улады абвінавацілі абодвух у аказанні супраціву міліцыі і ўдзеле ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. 22 чэрвеня мясцовы суд даў Багрову 15 сутак, а Пазняка аштрафаваў на 810 рублёў (332 даляры).

Паступалі звесткі пра тое, што сілы бяспекі наўмысна жорстка пераследавалі прадстаўнікоў прэсы падчас дэманстрацый. Так, напрыклад, 10 жніўня, паводле інфармацыі, супрацоўнікі службаў бяспекі напалі і разагналі групу карэспандэнтаў, якія асвятлялі паслявыбарчыя пратэсты, былі абазначаныя як прэса і мелі адпаведныя камізэлькі і бэйджы. Сілавікі стралялі гумовымі кулямі і паранілі журналістку незалежнай газеты "Наша Ніва" Наталлю Лубнеўскую, якая патрапіла ў шпіталь больш чым на месяц.

Паступалі паведамленні пра тое, што некаторыя журналісты падвяргаліся сур'ёзнаму гвалту падчас затрыманняў. Паводле дадзеных Human Rights Watch, напрыклад, 10 жніўня неакрэдытаваны 33-гадовы журналіст тэлеканала "Белсат" Віталь Дубікаў накіроўваўся на працу ў Мінск, калі быў спынены і абшуканы двума супрацоўнікамі міліцыі. Знайшоўшы камеру і мікрафон з лагатыпам "Белсата", яны заштурхнулі яго ў міліцэйскі фургон і даставілі ў АМАП, дзе амапаўцы збілі яго і іншых затрыманых дручкамі, загадалі легчы на зямлю і звязалі ім рукі за спінай. Дубікаў і іншыя затрыманыя правялі ноч пад адкрытым небам, спачатку лежачы на зямлі, а потым стоячы на каленях ля сценкі. Раніцай яго запхнулі ў міліцэйскі фургон з іншымі затрыманымі і пратрымалі там некалькі гадзін без ежы, вады і вентыляцыі. 14 жніўня Дубікава адпусцілі без прад'яўлення абвінавачанняў.

Супрацоўнікі службаў бяспекі таксама канфіскоўвалі або наўмысна пашкоджвалі відэа- і аўдыёапаратуру журналістаў. Так, напрыклад, паводле інфармацыі ў прэсе, 11 жніўня сілавікі падышлі да фатографа Associated Press Сяргея Грыца і некалькіх яго калегаў, калі тыя асвятлялі разгон дэманстрацыі

міліцыяй. Паводле словаў Грыца, амапаўцы без апазнавальных знакаў акружылі іх, дасталі карты памяці з іх абсталявання і разбілі ягоную камеру.

Паведамляецца, што ўлады пераследавалі журналістаў з мэтай адпомсціць за змест іх рэпартажаў. Напрыклад, паводле дадзеных Камітэта абароны журналістаў, 25 траўня супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю затрымалі Сяргея Сацука, галоўнага рэдактара навінавага сайта "Ежедневник", пасля ператрусу ў яго офісе і выняцця дакументаў. Сацук рэзка крытыкаваў рэакцыю ўрада на пандэмію COVID-19 і карупцыю ў сістэме аховы здароўя. Яму было прад'яўлена абвінавачанне ў атрыманні хабару, якое "Рэпарцёры без межаў" назвалі помстай за рэдакцыйны артыкул, які ставіў пад сумнеў афіцыйную статыстыку па COVID-19 і крытыкаваў загад Лукашэнкі "разабрацца" са СМІ, якія "сеюць паніку" ў сувязі з эпідэміяй. 4 красавіка ён быў вызвалены пад падпіску аб нявыедзе. Па стане на лістапад афіцыйнае расследаванне працягвалася.

<u>Цэнзура або абмежаванні зместу:</u> Урад аказваў ціск на пераважную большасць незалежных выданняў, прымушаючы іх ажыццяўляць самацэнзуру, папярэджваючы пра адказнасць за асвятленне пэўных тэм або крытыку ўладаў. Улады жорстка і наўпростава кантралявалі змест матэрыялаў дзяржаўных вяшчальных і друкаваных СМІ. Тэлеканалы павінны былі трансляваць прынамсі 30% мясцовага кантэнту. Рэгіянальныя незалежныя тэлевізійныя станцыі дзейнічалі ў некаторых раёнах і перадавалі мясцовыя навіны, хоць большасць з іх адчувала на сабе ціск з боку уладаў, якія пад пагрозай цэнзуры дамагаліся адмовы ад асвятлення агульнанацыянальных і вострых пытанняў. Улады жорстка цэнзуравалі інтэрнэт (гл. раздзел "Свабода інтэрнэту" ніжэй).

Улады каралі тых, хто публікаваў матэрыялы, якія супярэчылі дзяржаўным дырэктывам (гл. раздзел "Свабода слова" вышэй). Некаторыя прыватныя сеткі раздробнага гандлю таксама адмаўляліся працягваць продаж нумароў незалежных газет праз ціск з боку дзяржавы, а дзяржаўныя і прыватныя друкарні адмаўляліся іх друкаваць, вымушаючы рэдактараў купляць паліграфічныя паслугі за мяжой.

Паводле звестак, улады не адказвалі на запыты аб прадастаўленні інфармацыі, а некаторыя СМІ, як мяркуецца, устрымліваліся ад асвятлення падзеяў, каб пазбегчы пакарання за публікацыю недакладнай інфармацыі.

Незалежныя сродкі масавай інфармацыі, уключна з газетамі і навінавымі інтэрнэт-парталамі, сутыкнуліся з дыскрымінацыйнай палітыкай у дачыненні да публікацый і распаўсюду, у тым ліку з абмежаваннем доступу да ўрадавых чыноўнікаў і брыфінгаў для прэсы, кантролем памеру накладаў газет і завышэннем выдаткаў на друк. Пасля таго як, напрыклад, папулярная апазіцыйная газета "Народная воля" і недзяржаўны штодзённік "Камсамольская

праўда” (мясцовая версія папулярнага расійскага таблоіда) шырока асвятлялі гвалт і збіццё пратэстоўцаў у першыя дні пасля выбараў, улады пачалі цэнзураваць далейшыя штодзённыя выпускі, блакуючы іх распаўсюд праз дзве дзяржаўныя сістэмы - сетку шапікаў раздробнага гандлю “Белсаюздрук” і паштовую абаненцкую службу.

Друкавальныя станкі ў краіне кантраляваліся дзяржавай. Паводле дадзеных Камітэта абароны журналістаў (КАЖ), праз некалькі дзён пасля пачатку пратэстаў дзяржаўны Дом друку пачаў адмаўляцца ад друку незалежных газет, спаслаўшыся на шэраг “тэхнічных праблем”, уключна з адсутнасцю матэрыялаў і зламаным абсталяваннем, што, як лічылі назіральнікі, было проста зачэпкай. КАЖ адзначаў, што ў той жа дзень, калі незалежнай газеце было адмоўлена ў магчымасці надрукаваць выданне з бел-чырвона-белым сцягам на вокладцы (сімвал пратэстаў супраць Лукашэнкі), іншая падкантрольная дзяржаве газета змагла надрукаваць свой наклад з інтэрв’ю спевака-прыхільніка Лукашэнкі.

Улады перасцерагалі бізнесы, каб тыя не змяшчалі рэкламу ў газетах, якія крытыкавалі ўрад. У выніку незалежныя выданні былі вымушаныя працаваць ва ўмовах жорсткіх бюджэтных абмежаванняў.

<u>Законы, якія прадугледжваюць адказнасць за распаўсюд паклёпу і абразу:</u> Паклёп і абраза з’яўляюцца крымінальнымі злачынствамі. За распаўсюд звестак, што ганьбяць і зневажаюць прэзідэнта, прадугледжаныя буйныя штафы і пазбаўленне волі на тэрмін да чатырох год. Пакаранне за паклёпніцтва аднолькавае як для прыватных, так і для публічных асоб. Афіцыйная асоба, атрымаўшы крытыку за нездавальняльнае выкананне сваіх службовых абавязкаў, можа падаць у суд як на журналіста, так і на перыядычнае выданне, якое распаўсюдзіла крытычнае паведамленне.

23 верасня супрацоўнікі Упраўлення ўнутранай бяспекі МУС затрымалі галоўнага рэдактара незалежнай газеты “Наша Ніва” Ягора Марціновіча, абшукалі яго кватэру і канфіскавалі кампутарную тэхніку. Улады адпусцілі Марціновіча пасля таго, як затрымалі яго на 72 гадзіны, але ён па-ранейшаму застаецца падразаваным у паклёпе на намесніка міністра ўнутраных спраў Аляксандра Барсукова ў сувязі з апублікаваным газетай інтэрв’ю, у якім Барсукова абвінавачвалі ў збіцці затрыманых у ізалятарах.

<u>Нацыянальная бяспека:</u> Улады часта спасылаліся на пытанні нацыянальнай бяспекі для таго, каб арыштоўваць і караць крытыкаў рэжыму або стрымліваць крытыку палітыкі ўраду і службовых асобаў. Так, напрыклад, 9 верасня затрымалі чальца прэзідыума Каардынацыйнай рады адваката Максіма Знака.

Яму выставілі абвінавачанне ў “закліку да дзеянняў, накіраваных на нанясенне шкоды нацыянальнай бяспецы”. Іншым чальцам Каардынацыйнай рады таксама былі прад’яўленыя абвінавачанні ў аналагічных парушэннях. Шмат хто палічыў, што гэта помста за палітычную актыўнасць Знака.

Свабода інтэрнэту

Урад кантраляваў інтэрнэт-камунікацыі без адпаведных на тое юрыдычных паўнамоцтваў. Згодна са справаздачай Freedom House за 2019 год аб свабодзе ў сеціве, усе аператары сувязі мусілі ўсталяваць абсталяванне для маніторынгу, што дазваляе ўладам без судовага надзору адсочваць трафік у рэжыме рэальнага часу і атрымліваць адпаведныя метададзеныя і іншыя дадзеныя кшталту гісторыі праглядаў карыстальнікаў, уключна з даменнымі імёнамі і наведанымі адрасамі інтэрнэт-пратаколу. Усе інтэрнэт-правайдары павінны захоўваць інфармацыю пра гісторыю праглядаў сваіх кліентаў цягам аднаго года. Ад кампаній таксама патрабавалася захоўваць ідэнтыфікацыйныя дадзеныя прыладаў сваіх кліентаў і іх дзеянняў ў інтэрнэце цягам як мінімум 5 год і перадаваць гэтую інфармацыю на запыт уладаў.

Улады ажыццяўлялі маніторынг электроннай пошты і сацыяльных сетак. Нягледзячы на тое, што асобныя грамадзяне, групы і выданні, як правіла, маглі ўдзельнічаць у абмене думкамі праз інтэрнэт, у тым ліку і праз электронную пошту, усе, хто гэта рабіў, рызыкавалі сутыкнуцца з магчымымі прававымі і асабістымі наступствамі і, паводле некаторых меркаванняў, час ад часу вымушаны былі практыкаваць самацэнзуру. Актывісты апазіцыі сцвярджалі, што іх электронная перапіска і іншыя паведамленні ў інтэрнэце, верагодней за ўсё, адсочваліся.

На зарэгістраваныя навінавыя вэб-сайты і любыя крыніцы інфармацыі ў інтэрнэце распаўсюджваюцца тыя самыя правілы, што і на друкаваныя СМІ. Вэб-сайты могуць падаваць заяўкі на рэгістрацыю ў якасці навінавых агенцтваў, але для рэгістрацыі патрабуецца, каб у сайта быў офіс, які размяшчаецца ў нежылым памяшканні, і каб галоўны рэдактар з’яўляўся беларускім грамадзянінам і меў не менш за пяць год досведу працы на кіруючых пасадах у СМІ. Вэб-сайты, якія вырашылі не падаваць заяўку на рэгістрацыю, могуць працягваць працаваць, але не маючы статусу СМІ. Іх карэспандэнты не могуць атрымліваць акрэдытацыю ад дзяржаўных органаў, а таксама не могуць асвятляць масавыя мерапрыемствы або мець журналісцкае права на абарону крыніц інфармацыі.

Улады фільтравалі і блакавалі інтэрнэт-трафік. З 9 па 12 жніўня доступ у інтэрнэт у краіне быў жорстка абмежаваны прыкладна на 61 гадзіну. У

большасці карыстальнікаў перыядычна працавалі толькі СМС-сэрвіс і галасавыя выклікі.

У той час як улады вінавацілі ў збоях у працы замежныя кібератакі, незалежныя эксперты прыпісвалі гэтыя збоі дзеянням ўладаў. Пачынаючы са жніўня, адбываліся неаднаразовыя перабоі ў працы інтэрнэту і яго поўнае адключэнне, што звычайна супадала з буйнымі пратэстамі і дзеяннямі міліцыі па іх разгоне. Прыватныя інтэрнэт-правайдары паведамлялі кліентам, што адключэнне было запатрабавана ўладамі з меркаванняў нацыянальнай бяспекі. Тэлекамунікацыйныя кампаніі заяўлялі, што ў дні правядзення масавых дэманстрацый улады загадвалі ім жорстка абмяжоўваць перадачу дадзеных праз мабільны інтэрнэт.

Улады абмяжоўвалі анлайн-кантэнт. Дастаўнікі анлайн-навінаў мусілі выдаляць кантэнт і публікаваць выпраўленні па загадзе ўладаў, а таксама пільнавацца шэрагу дзяржаўных забаронаў на свабоду слова (гл. таксама раздзел “Свабода слова”). Улады без санкцый пракурора або суда могуць блакаваць доступ да сайтаў, якія не падпарадкоўваюцца распараджэнням урада, у тым ліку і за адзінкавае парушэнне што да распаўсюду забароненай інфармацыі. У выпадку блакіроўкі інтэрнэт-выданне губляе рэгістрацыю ў якасці СМІ. Уладальнікі інтэрнэт-сайтаў або інтэрнэт-публікацый маюць адзін месяц на тое, каб абскардзіць у судзе рашэнне ўрада абмежаваць доступ да іх сайтаў або адмову ва ўзнаўленні доступу да іх. 21 жніўня Міністэрства інфармацыі паведаміла, што 9 жніўня яно заблакавала доступ больш чым да 70 інтэрнэт-сайтаў, уключна з буйнымі незалежнымі навінавымі парталамі “Еўрарадыё”, “Радыё Свабода” і праваабарончай НДА “Вясна”. Хоць да сярэдзіны жніўня большасць інтэрнэт-сайтаў запрацавала зноў, многія з іх заставаліся заблакаванымі цягам доўгага перыяду часу. Некаторыя з іх аднавілі працу да сярэдзіны лістапада. У жніўні Лукашэнка назваў незалежныя СМІ “часткай гібрыднай вайны супраць Беларусі”.

Былі таксама спробы абмежаваць або заблакаваць сацыяльныя сеткі. 20 кастрычніка Мінскі раённы суд прызнаў тэлеграм-канал NEXTA Live і яго лагатып NEXTA «экстрэмісцкім» і ў далейшым абмежаваў доступ да інфармацыйных рэсурсаў, якія выкарыстоўвалі яго назву. Згодна з інфармацыяй дзяржаўнага агенцтва “БелТА”, рашэнне было прынята ў адказ на выяўленне “экстрэмісцкай дзейнасці” на тэлеграм-канале, уключна з заклікамі грамадства да арганізацыі масавых беспарадкаў. Зашыфраваны тэлеграм-канал NEXTA быў асноўнай крыніцай інфармацыі пра падзеі ў краіне і публікаваў прапановы па маршрутах пратэстаў і месцах сустрэч.

Улады каралі людзей за выказванне іх палітычных поглядаў у інтэрнэце. Так, напрыклад, 25 чэрвеня сілавікі ўварваліся ў дом Ігара Лосіка, адміністратара папулярнага апазіцыйнага тэлеграм-канала “Беларусь галаўнога мозгу”.

Супраць яго было высунута абвінавачанне ў “дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак”, што цягне за сабой да трох год пазбаўлення волі ў выпадку прызнання ягонай віны. Па стане на лістапад ён заставаўся пад вартай да суда. Назіральнікі перакананыя, што абвінавачанні супраць яго былі высунутыя ў адказ на мадэраванне ім апазіцыйнага тэлеграм-канала.

Уладальнікі інтэрнэт-сайтаў таксама могуць несці адказнасць за каментары карыстальнікаў, якія ўтрымліваюць любую забароненую інфармацыю, і гэтыя сайты могуць быць заблакаваныя. Закон таксама патрабуе стварэння базы дадзеных навінавых сайтаў і ідэнтыфікацыі ўсіх каментатараў па іх асабістых дадзеных і нумарах мабільных тэлефонаў. Калі навінавы вэб-сайт атрымлівае два або больш афіцыйных папярэджанняў ад уладаў, ён можа быць выдалены з базы дадзеных і згубіць права на распаўсюд інфармацыі.

У адпаведнасці з законам, тэлекамунікацыйны манапаліст “Белтэлекам” і іншыя ўпаўнаважаныя ўрадам арганізацыі маюць выключнае права на абслугоўванне інтэрнэт-даменаў.

Улады рабілі спробы абмежаваць ананімнасць у інтэрнэце. Указ прэзідэнта патрабаваў рэгістрацыі правайдараў паслуг і інтэрнэт-сайтаў, а таксама патрабаваў збіраць інфармацыю пра тых, хто карыстаецца агульнадаступным інтэрнэтам. Ён патрабаваў ад правайдараў паслуг захоўваць дадзеныя аб карыстанні людзьмі інтэрнэтам цягам года і перадаваць дадзеныя праваахоўчым органам на іх запыт. Парушэнне ўказа каралася пазбаўленнем волі, хоць такія парушэнні і не пераследаваліся па законе. Аднак такія захады ўладаў стымулявалі выкарыстанне зашыфраваных праграм абмену паведамленнямі, такіх як тэлеграм, што абыходзілі абмежаванні.

Паступалі паведамленні пра палітычна матываваныя кібератакі. Пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня ўрадавыя сайты, у тым ліку і сайт Міністэрства ўнутраных спраў, сталі мішэнню такіх атак.

Акадэмічныя свабоды і культурныя мерапрыемствы

Урад абмяжоўваў акадэмічныя свабоды і культурныя мерапрыемствы.

Ад адукацыйных установаў патрабавалася выкладаць афіцыйную дзяржаўную ідэалогію, якая сумяшчала ў сябе гонар за дасягненні былога Савецкага Саюза і Беларусі пад лідарствам Аляксандра Лукашэнкі. Зацверджаныя ўрадам падручнікі прапаноўвалі надзвычай прапагандысцкую версію гісторыі і іншых прадметаў. Улады абавязвалі ўсе ўстановы адукацыі, у тым ліку і прыватныя навучальныя ўстановы, выконваць дырэктывы дзяржаўных органаў па ўкараненні афіцыйнай ідэалогіі і забаранялі ім прызначаць на пасаду кіраўніка сябра апазіцыі.

Міністр адукацыі мае права прызначаць і звальняць кіраўнікоў прыватных адукацыйных установаў. Напрыклад, 31 жніўня міністр культуры звольніў рэктарку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў за нібыта няздольнасць не дапусціць студэнцкіх пратэстаў. Міністр аховы здароўя змяніў кіраўнікоў медыцынскіх ВНУ ў Гродна, Гомелі і Мінску пасля таго, як у жніўні некалькі лекараў, выкладчыкаў і студэнтаў арганізавалі серыю пратэстаў.

Улады абмяжоўвалі мастацкія імпрэзы і іншыя культурныя мерапрыемствы. Так, напрыклад, у верасні ўлады адмянілі ўсе спектаклі ў гродзенскім драматычным тэатры, спаслаўшыся на рост выпадкаў захворвання COVID-19, і звольнілі як мінімум двух вядучых актораў пасля таго, як трупа спыніла спектакль на знак пратэсту супраць затрымання 20 верасня іх калег на мясцовай дэманстрацыі. Назіральнікі меркавалі, што адмена спектакляў была помстай за дзеянні трупы, паколькі ўлады не патрабавалі ад усіх тэатраў адмены прадстаўленняў падчас пандэміі COVID-19.

б. Свабода мірных сходаў і асацыяцый

Канстытуцыя прадугледжвае свабоду мірных сходаў, аднак урад жорстка абмяжоўваў гэтае права і выкарыстоўваў разнастайныя сродкі, каб перашкодзіць правядзенню дэманстрацый, разагнаць іх, звесці да мінімуму іх уплыў і пакараць удзельнікаў. Закон прадугледжвае свабоду асацыяцый, аднак улады перашкаджалі рэалізацыі гэтага права і селектыўна прымянялі законы і правілы рэгістрацыі з мэтай абмежаваць дзейнасць незалежных асацыяцый, здольных крытыкаваць урад.

Свабода мірных сходаў

Толькі зарэгістраваныя палітычныя партыі, прафсаюзы і НДА маглі звяртацца па дазвол на правядзенне дэманстрацый з удзелам больш чым тысячы чалавек. Улады звычайна адхілялі запыты, што паступалі ад незалежных і апазіцыйных груп, а таксама самаарганізаваных суполак грамадзян з розных куткоў краіны.

Закон прадугледжвае крымінальную адказнасць за ўдзел у несанкцыянаваных сходах, распаўсюд звестак пра намер правесці масавыя акцыі да атрымання афіцыйнага дазволу, навучанне людзей тэхніцы правядзення дэманстрацый,

фінансаванне грамадскіх дэманстрацый або атрыманне замежнай дапамогі “з мэтай нанясення шкоды” краіне. За некаторыя парушэнні гэтых патрабаванняў прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да трох год.

Асобы з непагашанай судзімасцю за злачынствы, звязаныя з парушэннем закону і парадку, дзяржаўнасці і кіравання, грамадскай бяспекі і маралі, таксама як і асобы, якія былі пакараныя штрафамі за ўдзел у несанкцыянаваных масавых акцыях (цягам года пасля прысуджэння штрафу), не мелі права выступаць у якасці арганізатараў масавых мерапрыемстваў.

Закон патрабуе, каб арганізатары апавясцілі ўлады пра запланаванае ў прызначаным месцы масавае мерапрыемства не пазней чым за 10 дзён да даты яго правядзення. Улады мусяць паінфармаваць аб сваёй адмове не пазней як за пяць дзён да мерапрыемства. Паводле закона, адмова можа быць дадзена па адной з дзвюх прычын: мерапрыемства супадае па часе і па месцы з іншым, арганізаваным асобным грамадзянінам або групай грамадзян, або апавяшчэнне не адпавядае патрабаванням. Арганізатары масавых мерапрыемстваў па-за межамі прызначаных месцаў мусяць падаваць заяўку на яго правядзенне прынамсі за 15 дзён, каб атрымаць дазвол, а ўладам трэба даць адказ не пазней як за 5 дзён да запланаванага мерапрыемства. Паводле справаздачы Маскоўскага механізму АБСЕ, такая практыка не адпавядала міжнародным стандартам. Улады звычайна давалі дазвол на правядзенне апазіцыйных дэманстрацый толькі ў выпадку, калі тыя праводзіліся далёка ад цэнтра горада. У справаздачы Маскоўскага механізму АБСЕ адзначалася, што ўлады не абгрунтоўвалі неабходнасці адміністрацыйных арыштаў і штрафаў у сувязі са стыхійнымі дэманстрацыямі, якія Арганізацыя Аб’яднаных Нацый лічыла неабходнымі ў дэмакратычным грамадстве і сувымернымі з пытаннямі як нацыянальнай бяспекі, так і абароненасці грамадства.

Закон прадугледжвае парадак аплаты арганізатарамі масавых мерапрыемстваў паслуг міліцыі, выдаткі на медыцынскае абслугоўванне і прыбіранне тэрыторыі пры правядзенні мерапрыемства. Улады працягвалі пакрываць выдаткі, звязаныя з мерапрыемствамі, якія афіцыйна фінансаваліся на мясцовым або рэспубліканскім узроўні. У выпадку, калі заяўка на правядзенне масавага мерапрыемства падтрыманая, арганізатары мусяць заключыць дамову з гэтымі службамі за два дні да самога мерапрыемства і аплаціць усе паслугі цягам 10 дзён. Арганізатары скардзіліся на высокі кошт такіх паслуг. Так, напрыклад, за паслугі міліцыі падчас мерапрыемства з удзелам больш чым 1 000 чалавек у адмыслова прызначаным месцы трэба заплаціць прыкладна 7 290 рублёў ($2 990), а ў непрызначаным - у паўтара раза больш.

Улады часта прыдумлялі падставы для адмовы ў выдачы дазволу на правядзенне публічных дэманстрацый. Напрыклад, 30 ліпеня мітынг апазіцыйнай кандыдаткі ў прэзідэнты Святланы Ціханоўскай у Мінску сабраў

63 000 удзельнікаў, што зрабіла яго найбуйнейшым перадвыбарчым сходам з часоў атрымання краінай незалежнасці. У далейшым мясцовыя ўлады Мінска заблакавалі магчымасць правядзення Ціханоўскай дадатковых агітацыйных мерапрыемстваў. 2 жніўня ўлады абвясцілі, што дзяржаўныя мерапрыемствы будуць праводзіцца кожны вечар ва ўсіх дазволеных для агітацыйных мітынгаў месцах у перыяд з 2 па 8 жніўня, нягледзячы на тое, што Ціханоўская ў сярэдзіне ліпеня падала заяўку на правядзенне мітынгаў у Мінску 5 і 8 жніўня.

Міліцыя затрымлівала і садзіла ў турму апазіцыянераў, якія спрабавалі арганізаваць палітычныя мерапрыемствы і мітынгі. Так, напрыклад, 27 кастрычніка Мінскі раённы суд прысудзіў Змітру Дашкевічу, актывісту апазіцыі і грамадзянскай супольнасці і былому лідару апазіцыйнай моладзевай арганізацыі “Малады фронт”, 15 сутак турэмнага зняволення пасля затрымання на акцыі пратэсту 25 кастрычніка. Дашкевіч быў ключавым арганізатарам Ночы расстраляных паэтаў - штогадовага мерапрыемства апазіцыі ў памяць больш за сотні беларускіх паэтаў, пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў, расстраляных у 1937 годзе, якое праводзіцца 29 кастрычніка ў Курапатах на месцы масавых забойстваў людзей сталінскім рэжымам.

Цягам года мясцовыя ўлады па ўсёй краіне затрымлівалі адказы або адхілялі заяўкі на атрыманне дазволу на правядзенне разнастайных дэманстрацый. Так, напрыклад, цягам года мясцовыя ўлады Брэста адхілілі дзясяткі заявак ад групы мясцовых жыхароў, якія пратэставалі супраць будаўніцтва і ўводу ў эксплуатацыю акумулятарнага завода. Міліцыя затрымала і аштрафавала некаторых з іх за парушэнне Закона аб масавых мерапрыемствах і правядзенне мітынгаў без дазволу дзяржавы.

Улады часта прымянялі тактыку запалохвання, каб адбіць у людзей жаданне ўдзельнічаць у несанкцыянаваных дэманстрацыях. Таксама з мэтай запалохвання ўлады рабілі відэазапіс палітычных дэманстрацый і ажыццяўлялі праверку асобы, ствараючы пагрозу таго, што ўдзельнікі могуць быць пакараныя ў больш позні тэрмін.

Са жніўня па снежань міліцыяй было затрымана больш за 30 000 чалавек за ўдзел у несанкцыянаваных дэманстрацыях. Большасці асобаў, затрыманых падчас акцый пратэсту, міліцыя прад’явіла грамадзянскія пазовы за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. Такія пазовы звычайна прыводзілі да накладання штрафаў, непрацяглага пазбаўлення волі на тэрмін ад 10 да 15 сутак або да таго і другога адначасова. У перыяд з 9 жніўня па снежань міліцыя таксама ўзбудзіла не менш за 900 крымінальных спраў супраць мірных дэманстрантаў і журналістаў. У чэрвені і ліпені супрацоўнікі службаў бяспекі як у цывільным, так і ў форме таксама адвольна затрымлівалі дэманстрантаў, якія мірна станавіліся ў ланцугі ўздоўж вуліц у многіх гарадах, надаючы асаблівую ўвагу тым, хто меў апазіцыйную сімволіку або размахваў

апазіцыйным бел-чырвона-белым сцягам. Міліцыя затрымлівала таксама асобаў, якія не прымалі ўдзел у дэманстрацыях. За выключэннем масавых затрыманняў 9-11 жніўня, большасць асобаў, затрыманых да і пасля выбараў, была зарэгістраваная міліцыяй і вызваленая ў той самы або ў наступны дзень, хоць улады мелі магчымасць прымяняць непрацяглыя тэрміны празбаўлення волі і ў больш позні час.

Улады затрымалі цэлы шэраг лідараў пратэсту, сябраў апазіцыі і актывістаў. Іх першапачаткова змяшчалі за краты на кароткі тэрмін, а затым высоўвалі супраць іх дадатковыя абвінавачанні ў сувязі з больш раннімі затрыманнямі, каб утрымліваць у пастарунку больш працяглы перыяд часу. Напрыклад, пасля арышту 6 траўня за ўдзел ў 2019 годзе ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве, 29 траўня Сяргей Ціханоўскі зноў быў затрыманы ў Гродна падчас збору подпісаў за кандыдатуру сваёй жонкі. 8 чэрвеня Ціханоўскаму і шасці іншым затрыманым былі прад'яўленыя абвінавачанні ў "парушэнні грамадскага парадку" і ў "стварэнні перашкодаў выбарам". 16 чэрвеня супраць яго была ўзбуджана крымінальная справа па абвінавачанні ва ўмяшальніцтве ў выбарчы працэс і чыненні перашкодаў працы Цэнтральнай выбарчай камісіі. 30 ліпеня ўлады заявілі пра дадатковыя крымінальныя абвінавачанні супраць Ціханоўскага, сцвярджаючы, што ён вёў "падрыхтоўку да масавых беспарадкаў", а таксама пачалі расследаванне па абвінавачанні ў падбухторванні да гвалтоўных дзеянняў супраць міліцыі. Па стане на снежань, пакуль працягвалася расследаванне па гэтых крымінальных справах, Ціханоўскі заставаўся за кратамі (гл. таксама раздзелы 1.г. і 3).

Сілы бяспекі прымянялі да людзей фізічны і псіхалагічны гвалт пра разгоне мерапрыемстваў, падчас знаходжання іх у аўтазаках і ў месцах пазбаўлення волі (гл. раздзел 1.в.). Для разгону дэманстрацый улады выкарыстоўвалі вадамёты, светла-гукавыя гранаты, гумовыя кулі, балончыкі з пярцовым газам і дручкі.

12 кастрычніка намеснік міністра ўнутраных спраў Генадзь Казакевіч заявіў, што супрацоўнікі праваахоўчых органаў "у выпадку неабходнасці будуць прымяняць спецсродкі і баявую зброю" для таго, каб "забяспечыць парадак у краіне". Улады выкарыстоўвалі баявыя патроны ў некалькіх асобных выпадках, што прывяло да гібелі двух пратэстоўцаў (гл. раздзел 1.а.).

Праваабарончыя групы паведамлялі, што ўлады імкнуліся пазначыць або маркіраваць тых пратэстоўцаў, у якіх была апазіцыйная сімволіка, якія скандавалі апазіцыйныя лозунгі або аказвалі супраціў пры арышце. Паведамляецца, што ваду ў вадамётах таксама афарбоўвалі, каб у далейшым можна было апазнаць пратэстоўцаў. Паводле звестак, улады вылучалі асаблівым чынам пазначаных людзей, каб прымяніць да іх больш высокі ўзровень фізічнага і псіхалагічнага гвалту ў месцах пазбаўлення волі.

Сілавікі ў цывільным затрымлівалі асобаў з апазіцыйнай сімволікай, асобаў, апазнаных як удзельнікаў пратэсту, або тых, каго міліцыя лічыла лідарамі пратэсту. Сутыкнуўшыся з вялікімі натоўпамі на несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах, супрацоўнікі праваахоўчых органаў у цывільным спарадычна затрымлівалі, а часам і збівалі падазраваных удзельнікаў шэсця далёка ад цэнтра падзей, а многіх зацягвалі ў аўтамабілі без нумароў. З траўня па снежань супрацоўнікі міліцыі ў цывільным і ў масках часта не называлі сябе і не паказвалі дакументаў.

У некаторых выпадках суды асуджалі ўдзельнікаў мірных пратэстаў на працяглыя тэрміны турэмнага зняволення па крымінальных справах, у прыватнасці тады, калі ўлады абвінавачвалі дэманстрантаў у прымяненні гвалту. З 9 па 11 жніўня прэса зафіксавала асобныя выпадкі, калі дэманстранты кідалі камяні, петарды і кактэйлі Молатава. Паведамляецца, што кіданне камянёў таксама адбывалася падчас акцый пратэсту 23 верасня пасля інаугурацыі Лукашэнкі. Міністэрства ўнутраных спраў паведаміла пра прынамсі 10 выпадкаў наездаў аўтамабіляў на міліцыянтаў у перыяд з 10 па 12 жніўня. Пасля 11 жніўня пераважная большасць дэманстрацый насіла мірны характар, а выпадкі гвалту з боку дэманстрантаў, відавочна, былі выкліканыя ўжываннем міліцыянтамі сілы або гвалтоўнымі затрыманнямі, асабліва здзейсненымі супрацоўнікамі ў цывільным і ў балаклавах. З чэрвеня па лістапад асобныя бойкі паміж супрацоўнікамі службаў бяспекі і дэманстрантамі або спробы дэманстрантаў аказаць супраціў пры арышце адбываліся ў розных гарадах, як правіла, пасля спробаў сілавікоў адвольна затрымаць пратэстоўцаў або разагнаць мірны натоўп.

Напрыклад, 29 верасня Маладзечанскі раённы суд прызнаў вінаватымі і прысудзіў мясцовых жыхароў Паўла Пяскова і Уладзіслава Еўсцягнеева да трох год і трох месяцаў пазбаўлення волі з адбываннем тэрміну ў калоніі агульнага рэжыму. Улады абвінавацілі іх у аказанні супраціву АМАПу за тое, што яны 19 чэрвеня паспрабавалі перашкодзіць міліцыі затрымаць пратэстоўца.

З пачатку траўня Следчы камітэт Беларусі ўзбудзіў не менш за 900 крымінальных спраў у дачыненні да асобаў, затрыманых падчас акцый пратэсту па абвінавачаннях ва ўдзеле ў масавых хваляваннях і беспарадках, нанясенні шкоды нацыянальнай бяспецы, аказанні супраціву, а таксама гвалце або пагрозе гвалту над супрацоўнікамі МУС, хуліганстве, распальванні варожасці або нянавісці, а таксама ў арганізацыі або ўдзеле ў дзеяннях, якія парушаюць грамадскі парадак. Так, напрыклад, следчыя абвінавацілі не менш чым 231 чалавека ў арганізацыі або ўдзеле ў дзеяннях, якія парушаюць грамадскі парадак, пасля іх затрымання падчас акцыі пратэсту 1 лістапада. Паводле справаздачы, гэта паказвае на вяртанне да крыміналізацыі ў дзяржаве мірных пратэстаў.

Удзельнікі пратэстаў станавіліся аб’ектам рэпрэсій як у дзяржаўных навучальных установах, так і на працоўных месцах. Згодна з дырэктывай Міністэрства адукацыі, навучальныя ўстановы могуць выключаць студэнтаў, якія займаюцца антыўрадавай або несанкцыянаванай палітычнай дзейнасцю, і мусяць забяспечваць іх належнае ідэалагічнае выхаванне. Аднак афіцыйныя прадстаўнікі ўстановаў адукацыі ў якасці афіцыйнай прычыны адлічэння часта спасылаліся на дрэнную паспяховасць або на адсутнасць на занятках. Напрыклад, у красавіку адміністрацыя адлічыла студэнтку чацвёртага курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта нібыта за пропускі заняткаў. Студэнтка заявіла, што знаходзілася на двухтыднёвым каранціне праз магчымае заражэнне COVID-19. Яна ўваходзіла ў кіраўнічую раду апазіцыйнага Задзіночання беларускіх студэнтаў. З 20 па 30 сакавіка яна разам з іншымі студэнтамі ўдзельнічала ў пратэстнай акцыі каля сценаў універсітэта, раздаючы бясплатныя медыцынскія маскі з надпісам “Ха-ха, я тут умру!” для таго, каб прадэманстраваць крытычнае стаўленне да рэакцыі ўладаў на COVID-19. Студэнтка сцвярджала, што рашэнне адміністрацыі ўніверсітэта аб яе выключэнні з установы было палітычна матываваным. Паведамляецца, што з кастрычніка па снежань з навучальных установаў за палітычныя погляды было выключана больш за 140 студэнтаў.

Свабода асацыяцый

Усе НДА, палітычныя партыі і прафсаюзы мусяць атрымліваць папярэдні дазвол на рэгістрацыю ў Міністэрстве юстыцыі. Урадавая камісія разглядае і зацвярджае ўсе заявы аб рэгістрацыі; яе рашэнні галоўным чынам грунтуюцца на палітычнай і ідэалагічнай адпаведнасці афіцыйнай пазіцыі і практыкам.

У адпаведнасці з дзейнымі працэдурамі рэгістрацыі заяўнікі павінны былі пазначыць колькасць заснавальнікаў, іх імёны, а таксама фізічны адрас нежылога памяшкання ў якасці офіса, што было надзвычай цяжка з улікам фінансавых складанасцяў большасці НДА і нежадання ўласнікаў нерухомасці здаваць памяшканні ў арэнду недзяржаўным арганізацыям праз страх выклікаць пераслед з боку дзяржавы. Асобы, пазначаныя ў якасці сябраў арганізацыі, з вялікай верагоднасцю могуць апынуцца пад ціскам уладаў, калі ў НДА узнікнуць праблемы ў стасунках з дзяржавай. Незарэгістраваныя арганізацыі, якія не маглі арандаваць або дазволіць сабе офісныя памяшканні, паводле звестак, вымушаны былі выкарыстоўваць адрасы пражывання, што ўлады пазней маглі скарыстаць як падставу для адмовы ў рэгістрацыі або заявы, што арганізацыі дзейнічаюць незаконна. У 2019 годзе ўлады адмянілі закон, які прадугледжваў крымінальную адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраваных груп, у выніку якога пакаранне сябраў такіх груп вар’іравалася ад высокіх штрафаў да двух год пазбаўлення волі. Пакаранне было заменена адміністрацыйнымі штрафамі.

Закон аб грамадскіх аб’яднаннях забараняе НДА захоўваць у замежных фінансавых установах грашовыя сродкі на ажыццяўленне дзейнасці на мясцовым узроўні. Закон таксама забараняе НДА садзейнічаць у аказанні замежнымі дзяржавамі любой дапамогі або льготаў дзяржаўным служачым на падставе іх палітычных або рэлігійных поглядаў ці нацыянальнай прыналежнасці.

27 жніўня ўступіў у сілу прэзідэнцкі ўказ аб замежнай дапамозе. Указ прадугледжвае, што толькі зарэгістраваныя НДА могуць на законных падставах прымаць замежныя гранты і тэхнічную дапамогу і толькі для абмежаванага набору зацверджаных мерапрыемстваў. НДА павінны атрымаць ухвалу Міжведамаснай камісіі па пытаннях замежнай бязвыплатнай дапамогі перад тым, як яны змогуць прымаць сродкі або рэгістраваць гранты, якія не ўваходзяць у спіс зацверджаных дзяржавай катэгорый дапамогі. Улады таксама падзялілі выкарыстанне дапамогі на дзве катэгорыі: вызваленую ад падаткаў і тую, што падлягае падаткаабкладанню, і для апошняй патрабуецца ўплата рэгістрацыйнага збору ў памеры 0,5 адсотка ад падаткаабкладальнай дапамогі. Указ таксама ўводзіць штрафы за выкарыстанне несанкцыянаванай або незадэкларанай дапамогі атрымальнікамі першаснай і другаснай дапамогі і дазваляе ўладам спыняць фінансаванне.

Улады могуць закрыць НДА пасля вынясення яму толькі аднаго папярэджання аб парушэнні закону. Найбольш агульнай падставай для вынясення папярэджання альбо закрыцця арганізацыі была немагчымасць атрымаць афіцыйны адрас, а таксама тэхнічныя супярэчнасці ў заяўных дакументах. Закон дазваляе ўладам закрываць НДА за атрыманне імі таго, што лічыцца незаконнымі формамі замежнай дапамогі, і дазваляе Міністэрству юстыцыі ажыццяўляць маніторынг дзейнасці любой з НДА і правяраць усю іх дакументацыю. НДА таксама мусяць падаваць у міністэрства штогадовыя дэталёвыя справаздачы пра сваю дзейнасць, размяшчэнне офісаў, службовых асобаў і колькасць сябраў.

Урад працягваў адмаўляць некаторым НДА і палітычным партыям у рэгістрацыі на розных падставах, у тым ліку ў сувязі з “тэхнічнымі” праблемамі з падачай заявак. Улады нярэдка пераследавалі і запалохвалі заснавальнікаў арганізацый, спрабуючы прымусіць іх адмовіцца ад удзелу і, такім чынам, пазбавіць групу неабходнай для рэгістрацыі колькасці заяўнікаў. Шматлікім групам неаднаразова адмаўлялі ў рэгістрацыі.

Улады пераследавалі, запалохвалі і пазбаўлялі волі сябраў Каардынацыйнай рады, сфармаванай лідаркай апазіцыі Святланай Ціханоўскай для працы ў напрамку мірнага вырашэння палітычнага крызісу. Пры сваім стварэнні 18 жніўня рада налічвала каля 70 сябраў, сем з якіх былі абраныя ў прэзідыум, але

пазней вырасла да тысячы сябраў. Цягам месяца ўсе чальцы прэзідыума рады, акрамя аднаго, былі вымушаныя пакінуць краіну або сядзелі ў турме.

в. Свабода веравызнання

Гл. *Міжнародны даклад аб свабодзе веравызнання ў краінах свету* Дзярждэпартамента ЗША па адрасе: https://www.state.gov/religiousfreedomreport/.

г. Свабода перамяшчэння

Закон прадугледжвае свабоду перамяшчэння ў межах краіны, паездак за мяжу, эміграцыі і вяртання на радзіму, аднак у некаторых выпадках урад абмяжоўваў права сваіх грамадзян, у прыватнасці былых палітвязняў, на выезд за мяжу. Пасля прэзідэнцкіх выбараў урад узмацніў абмежаванне на вяртанне беларусаў у краіну з-за мяжы.

Перамяшчэнне ў межах краіны: Пашпарты служаць афіцыйным пасведчаннем асобы і неабходныя для рэгістрацыі па месцы жыхарства, уладкавання на працу і засялення ў гатэль. Міліцыя па-ранейшаму выбарачна пераследавала асобаў, якія жылі ў месцы, адрозным ад пазначанага ў абавязковых штампах ў іх пашпарце.

Закон таксама патрабуе, каб асобы, што наведваюць 30-кіламетровую памежную зону (за выключэннем афіцыйных пунктаў пропуску), атрымлівалі спецыяльны дазвол на ўезд.

Паездкі за мяжу: Афіцыйная база дадзеных асобаў, якім быў забаронены выезд за мяжу, уключае імёны тых, хто меў доступ да дзяржаўнай тайны, тых, хто прыцягваўся да адказнасці па крымінальных справах або грамадзянскіх пазовах ці меў нявыкананыя фінансавыя абавязкі. Улады пісьмова інфармавалі некаторых асобаў пра тое, што іх імёны ўнесеныя ў базу дадзеных; іншыя ж даведваліся пра гэта толькі пры спробе перасячы мяжу. Міністэрства ўнутраных спраў, службы бяспекі, памежныя і мытныя органы і дэпартаменты фінансавых расследаванняў маюць права ўносіць грамадзян у спісы “прафілактычнага ўліку”.

Міністэрства ўнутраных спраў таксама патрабавала адсочваць грамадзян, якія працуюць за мяжой, і кадравыя агенцтвы абавязаныя былі паведамляць пра асобаў, што не вярнуліся з-за мяжы ў запланаваны час.

Кіраўніку каталіцкай царквы ў краіне арцыбіскупу Тадэвушу Кандрусевічу забаранілі ўезд у краіну напрыканцы жніўня, калі ён вяртаўся з паездкі ў Польшчу па царкоўных справах. Арцыбіскуп выказваўся супраць гвалту з боку

міліцыі і маліўся перад следчым ізалятарам у Мінску пасля беспаспяховай спробы наведаць арыштаваных мірных дэманстрантаў. Улады заявілі, што ўнеслі арцыбіскупа ў спіс неўязных асобаў і анулявалі яго пашпарт на перыяд, пакуль спраўджвалі інфармацыю пра тое, ці меў ён грамадзянства некалькіх краін. Як вядома, арцыбіскуп меў толькі беларускае грамадзянства. Паводле закону, грамадзянства не можа быць анулявана, калі асоба мае толькі беларускае грамадзянства і не прэтэндуе на грамадзянства іншай краіны. Грамадзянам Беларусі не можа быць адмоўлена ва ўездзе на законных падставах. У канцы снежня арцыбіскупу далі дазвол на вяртанне ў краіну.

29 кастрычніка ўлады раптоўна зачынілі мяжу з Польшчай і Літвой, абмежаваўшы ўезд у краіну. 1 лістапада ўлады часова закрылі ўсе сухапутныя межы для звычайных вандроўнікаў нібыта для таго, каб абмежаваць рост колькасці выпадкаў заражэння COVID-19. Лукашэнка апярэдзіў гэты крок у сваім выступе 17 верасня, дзе ён не ўзгадваў COVID-19, але прыгразіў зачыніць заходнія межы краіны праз нібыта варожыя дзеянні з боку суседніх дэмакратычных урадаў, у прыватнасці Польшчы і Літвы. 5 лістапада ўлады яшчэ больш узмацнілі абмежаванні, перадусім для замежнікаў, але ў некаторых выпадках ўлады таксама абмяжоўвалі ўезд грамадзян Беларусі ў краіну, што, паводле меркавання назіральнікаў, супярэчыла канстытуцыі. У пачатку снежня ўрад увёў абмежаванні на выезд для грамадзян, якія хацелі выехаць па сушы, як паведамлялася, для таго, каб абмежаваць распаўсюд COVID-19 у краіне; НДА і актывісты сцвярджалі, што гэтае закрыццё межаў абмяжоўвала магчымасці тых, хто хацеў пакінуць краіну. Гэтыя меры пачалі дзейнічаць 20 снежня, што прывяло да абмежавання частаты выездаў і катэгорыі асобаў, якія маглі выехаць. Цягам гэтага перыяду ўлады пакідалі аэрапорты адкрытымі для міжнародных паездак, хоць абмежаваная даступнасць і высокія кошты патрабавалі выдаткаў і абмяжоўвалі магчымасці тых, хто хацеў пакінуць краіну.

Ссылка: Закон не дазваляе прымусовую ссылку, але крыніцы сцвярджалі, што сілавыя структуры працягвалі пагражаць некаторым сябрам апазіцыі нанясеннем шкоды здароўю або прыцягненнем да крымінальнай адказнасці ў выпадку, калі тыя не пакінуць краіну, у прыватнасці пасля выбараў 9 жніўня. Некаторыя знаходзіліся ў добраахвотным выгнанні, а іншых прадстаўнікі ўладаў давозілі да мяжы і вымушалі яе перасячы.

У ліпені кандыдат у прэзідэнты Валерый Цапкала ўцёк з краіны разам з дзецьмі, паводле інфармацыі, асцерагаючыся арышту пасля затрымання іншых кандыдатаў у прэзідэнты ў траўні і чэрвені. Яго жонка Вераніка Цапкала ўдзельнічала ў прэзідэнцкай кампаніі Святланы Ціханоўскай і ў жніўні таксама ўцякла праз ціск з боку ўладаў і страх быць арыштаванай.

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня ўлады вымусілі кадыдатку ад апазіцыі Святлану Ціханоўскую пакінуць краіну. Паведамляецца, што ўлады пагражалі ёй тым, што “яе дзеці вырастуць сіротамі”. 29 траўня яе муж быў затрыманы ўладамі і па стане на снежань заставаўся за кратамі. Улады таксама затрымалі паплечніцу Ціханоўскай Вольгу Кавалькову, і тая пагадзілася на ссылку ў верасні, пасля таго як улады прыгразілі ёй працяглым турэмным зняволеннем, калі яна не пакіне краіну. 8 верасня яшчэ два сябры апазіцыйнай Каардынацыйнай рады, выканаўчы дырэктар Іван Краўцоў і прэсавы сакратар Антон Раднянкоў, былі вымушаныя пакінуць краіну. Сілавікі выкралі Краўцова і Раднянкова і адвезлі іх да мяжы з Украінай, дзе яны былі вымушаныя перайсці на ўкраінскі бок.

Многія студэнты ўніверсітэтаў, якія былі выключаны з навучальных установаў ці лічылі, што знаходзяцца пад пагрозай выключэння за сваю палітычную дзейнасць, абіралі добраахвотнае выгнанне і працягвалі сваё навучанне за мяжой.

д. Асобы, перамешчаныя ўнутры краіны

Дадзеныя адсутнічаюць.

е. Абарона ўцекачоў

Урад супрацоўнічаў з Упраўленнем Вярхоўнага камісара ААН па справах уцекачоў (УВКУ ААН) і іншымі гуманітарнымі арганізацыямі ў забеспячэнні абароны і дапамогі ўцекачам; уцекачам, якія вяртаюцца; просьбітам прытулку; асобам без грамадзянства і іншым падмандатным асобам.

Высылка: Паступалі паведамленні пра тое, што ўлады высылалі або вярталі просьбітаў прытулку ці ўцекачоў у краіны, дзе яны маглі стаць ахвярамі жорсткага абыходжання. Так, напрыклад, 29 чэрвеня Вярхоўны суд адхіліў апеляцыю грамадзяніна Турцыі курдскай нацыянальнасці Хірчы Мамаса, якому было адмоўлена ў міжнароднай абароне ў Беларусі і які быў высланы. Турцыя патрабавала экстрадыцыі Мамаса ў сувязі з абвінавачаннем у “пасягальніцтве на адзінства і тэрытарыяльную цэласнасць дзяржавы”. Многія праваабарончыя арганізацыі лічылі, што Мамас сутыкнецца з сур’ёзнай пагрозай катаванняў, калі вернецца ў Турцыю.

Забеспячэнне прытулку: Закон, за некаторымі выключэннямі, прадугледжвае забеспячэнне прытулку або статусу ўцекача, дадатковую ці часовую абарону замежных грамадзян і асоб без грамадзянства. Урад распрацаваў працэдуру вызначэння статусу ўцекача, а таксама сістэму забеспячэння абароны ўцекачоў. Закон забяспечвае абарону ад прымусовага вяртання, што гарантуецца

замежнікам, якім было адмоўлена ў статусе ўцекача або ў часовай абароне, але якія не могуць быць вернутыя ў краіну паходжання.

Усе замежнікі, за выключэннем расійскіх грамадзян, маюць права хадайнічаць аб прадастаўленні прытулку. Паводле ўмоваў Пагаднення аб стварэнні Саюзнай дзяржавы з Расіяй, расіяне могуць на законнай аснове пражываць і атрымліваць від на жыхарства ў краіне. Урад зрабіў выключэнне для аднаго грамадзяніна Расіі, які папрасіў прытулку па рэлігійных прычынах.

Свабода перамяшчэння: Асобы, што звяртаюцца па прадастаўленне прытулку, надзелены свабодай перамяшчэння па ўсёй тэрыторыі краіны, але абавязаныя пражываць у тым рэгіёне, дзе падалі свае заявы на атрыманне статусу ўцекача, а таксама ў месцах, вядомых уладам, цягам усяго тэрміну разгляду іх заяваў, уключна з працэдурай абскарджання. Улады, паводле звестак, часта заахвочвалі просьбітаў прытулку выбіраць месца жыхарства ў сельскай мясцовасці; тым не менш, большасць з іх сялілася ў гарадах і мястэчках. Змена месца жыхарства была магчымая пры ўмове апавяшчэння ўладаў. Улады выдаюць асобам, што хадайнічаюць аб прадастаўленні прытулку, пасведчанні, якія служаць дакументам, што пацвярджае іх статус просьбіта прытулку і абараняюць іх ад высылкі з краіны. У адпаведнасці з заканадаўствам яны таксама павінны зарэгістравацца ў органах улады па месцы пражывання.

Доступ да базавых паслуг: Дарослыя асобы, што звяртаюцца па прадастаўленне прытулку, павінны плаціць за вышэйшую адукацыю, а таксама за няэкстраную медыцынскую дапамогу, у той час як няпоўнагадовыя атрымліваюць адукацыю і медыцынскую дапамогу бясплатна. Юрыдычная дапамога, жытло і моўныя курсы не прадастаўляюцца бясплатна ні асобам, якія шукаюць прытулку, ні ўцекачам. Пасля таго, як просьбіты прытулку атрымліваюць прытулак, да іх ставяцца як да рэзідэнтаў краіны.

Доўгатэрміновыя рашэнні: Прадастаўленне правоў грамадзянства ўцекачам было магчымае пасля сямі год сталага пражывання ў краіне, як і ў выпадку з іншымі катэгорыямі замежных грамадзян.

Часовая абарона: Нягледзячы на тое, што ўрад можа забяспечваць часовую абарону (тэрмінам да аднаго года) грамадзянам, якія не могуць лічыцца ўцекачамі, цягам справаздачнага года такая абарона не прадастаўлялася.

ж. Асобы без грамадзянства

Па стане на 1 ліпеня Міністэрства ўнутраных спраў і УВКУ ААН налічылі ў краіне 6 300 асобаў без грамадзянства. Паводле інфармацыі ўладаў, 98 адсоткаў з іх мелі дазвол на сталае пражыванне.

Асобы без грамадзянства, якія стала пражывалі ў краіне, мелі від на жыхарства і пры ўладкаванні на працу прыроўніваліся да грамадзян, за выключэннем абмежаванай колькасці пасад у дзяржаўным сектары і праваахоўчых органах, даступных выключна грамадзянам. Паступала інфармацыя, што асобы без грамадзянства часам сутыкаліся з дыскрымінацыяй пры працаўладкаванні, паколькі ўлады нярэдка вымушалі іх пераязджаць у сельскую мясцовасць, дзе магчымасці для працаўладкавання былі абмежаваныя. Паводле інфармацыі УВКУ ААН, асобы без грамадзянства маглі свабодна мяняць рэгіён пражывання.

Для асобаў без грамадзянства існуе пэўны шлях да яго атрымання. Асноўным патрабаваннем з'яўляецца сталае пражыванне на тэрыторыі краіны на працягу як найменш сямі год. Улады маюць і паскораную працэдуру натуралізацыі, але ў асноўным для асобаў, якія нарадзіліся або стала пражывалі ў краіне да распаду Савецкага Саюза, этнічных беларусаў, іх сужэнцаў ды нашчадкаў. Калі дзіця нараджаецца ў сям'і асобаў без грамадзянства, якія стала пражываюць у краіне, яно мае права на беларускае грамадзянства.

Раздзел 3. Свабода ўдзелу ў палітычным працэсе

Закон прадугледжвае права грамадзян абіраць свой урад шляхам свабодных і справядлівых перыядычных выбараў, якія праводзяцца шляхам таемнага галасавання на аснове ўсеагульнага і роўнага выбарчага права, аднак урад увесь час пазбаўляў грамадзян магчымасці рэалізоўваць гэта права, праводзячы выбары, якія не адпавядалі міжнародным стандартам.

З моманту свайго абрання ў 1994 годзе першым прэзідэнтам краіны на чатырохгадовы тэрмін, Аляксандр Лукашэнка паступова сканцэнтраваў паўнамоцтвы ў выканаўчай галіне ўлады з мэтай атрымання кантролю над усімі галінамі ўлады, у рэшце рэшт, па сутнасці знішчыўшы падзел паўнамоцтваў паміж галінамі ўлады. Праз рэферэндумы 1996 і 2004 гадоў, што не адпавядалі дэмакратычным стандартам, у Канстытуцыю былі ўнесеныя папраўкі, якія пашырылі яго паўнамоцтвы, падоўжылі тэрмін знаходжання на пасадзе і адмянілі абмежаванні на колькасць прэзідэнцкіх тэрмінаў. На кожных наступных выбарах, у тым ліку парламенцкіх, што адбыліся ў 2019 годзе, і прэзідэнцкіх выбарах, што адбыліся 9 жніўня, грамадзянам па-ранейшаму адмаўлялася ў праве выказаць сваю волю ў рамках сумленнага і празрыстага працэсу, у тым ліку і ў свабодным доступе да СМІ і рэсурсаў.

Выбары і ўдзел у палітычным жыцці

Апошнія выбары: Паводле дадзеных незалежных мясцовых назіральных груп, прэзідэнцкія выбары 9 жніўня былі азмрочаныя шматлікімі злоўжываннямі, выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу на карысць дзейнага прэзідэнта,

адсутнасцю бесстаронніх выбарчых камісій, няроўным доступам да СМІ, прымусам выбаршчыкаў да ўдзелу ў выбарах, датэрміновым галасаваннем, непразрыстым падлікам галасоў і абмежаваннямі незалежных назіральнікаў. Парушэнні, выяўленыя недзяржаўнымі арганізацыямі і незалежнымі назіральнікамі, выклікалі сур'ёзны сумнеў у адносінах да сцвярджэння ўладаў пра тое, што Аляксандр Лукашэнка атрымаў на прэзідэнцкіх выбарах 80 адсоткаў галасоў.

Ціск ўладаў на патэнцыйных кандыдатаў ў прэзідэнты ад апазіцыі распачаўся за тры месяцы да прэзідэнцкіх выбараў і працягнуўся пасля іх. Улады да прэзідэнцкіх выбараў абмяжоўвалі магчымасць прэтэндэнтаў рэгістравацца ў якасці кандыдатаў, абмяжоўвалі кандыдатаў падчас агітацыйнай кампаніі, аказвалі ціск і затрымлівалі каманды, якія праводзілі прэзідэнцкую кампанію, аказвалі ціск на грамадзян, што падтрымлівалі кадыдатаў ад апазіцыі, а таксама затрымлівалі журналістаў, каб абмежаваць апазіцыйнае асвятленне падзей.

У *справаздачы дакладчыка АБСЕ па Маскоўскім механізме аб меркаваных парушэннях правоў чалавека*, звязаных з прэзідэнцкімі выбарамі 9 жніўня, выпушчаным АБСЕ 5 лістапада, падрабязна выкладзены шырокі спектр парушэнняў на выбарах, датычных: "1) нясвоечасовага запрашэння міжнародных назіральнікаў; 2) недахопаў у прызначэнні кіроўчых выбарчых органаў на ўсіх узроўнях; 3) абмежавання права балатавацца (на пасаду); 4) абмежаванняў у вырашэнні выбарчых спрэчак; 5) поўнага ігнаравання свабоды сходаў; 6) няроўных умоваў для кандыдатаў, уключна з непразрыстасцю фінансавання кампаній; 7) непразрыстым працэсам датэрміновага галасавання; 8) перапоўненасцю выбарчых участкаў; 9) адсутнасцю сістэмы стрымак і процівагаў, адсутнасцю магчымасці праверкі вынікаў выбараў і 10) недасяжнасцю назірання за ўсімі этапамі выбарчага працэсу, што перашкаджала эфектыўнай ацэнцы выбараў". У справаздачы адзначаецца, што "з прычыны відавочных парушэнняў падчас прэзідэнцкіх выбараў, якія не адпавядалі асноўным патрабаванням, усталяваным на падставе папярэдняга маніторынгу выбараў і назіранняў грамадзян, прэзідэнцкія выбары павінны быць ацэненыя як не адпаведныя міжнародным абавязацельствам, узятым на сябе краінай у дачыненні да выбараў. Сцвярджэнні пра тое, што прэзідэнцкія выбары не былі празрыстымі, свабоднымі і справядлівымі, пацвердзіліся".

Улады затрымлівалі, а часам і прад'яўлялі абвінавачанні сябрам апазіцыйных штабоў выбарчых кампаній, уключна з рэгіянальнымі прадстаўнікамі, нібыта за ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах, што аказвала дадатковы ціск на апазіцыйныя групы. Праўладныя кандыдаты і іх каманды не сутыкаліся з падобным ціскам з боку праваахоўчых органаў.

Падчас перадвыбарчай кампаніі ўлады арыштоўвалі або высылалі кандыдатаў, якія, як лічылі назіральнікі, з'яўляліся найбольшай пагрозай для яго пераабрання.

6 траўня ўлады затрымалі кандыдата ў прэзідэнты Сяргея Ціханоўскага і пратрымалі яго цягам 15 дзён за нібыта ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве ў снежні 2019 года, з-за чаго ён заставаўся за кратамі пасля 15 траўня - крайняга тэрміну для рэгістрацыі ініцыятыўных груп па збору подпісаў за кандыдатаў у прэзідэнты. Ціханоўскаму не далі падпісаць да вызначанага тэрміну дакументы, неабходныя для рэгістрацыі ўласнай ініцыятыўнай групы па збору подпісаў. Хоць афіцыйныя асобы і прызнавалі, што кандыдатура Ціханоўскага адпавядала крытэрыям закона аб выбарах, яны сцвярджалі, што быў патрэбны яго подпіс. Жонка Ціханоўскага Святлана Ціханоўская замест гэтага паставіла сваё імя, якое ўлады і прынялі.

29 траўня ў Гродна Ціханоўскі быў зноў затрыманы падчас удзелу ў мерапрыемсте па збору подпісаў за кандыдатуру сваёй жонкі (гл. раздзел 2.б. "Свабода мірных сходаў"). Улады заявілі, што ён ўдзельнічаў у бойцы, у якой быў здзейснены напад на міліцыю. Дзяржаўныя СМІ асвятлялі затрыманне Ціханоўскага і неабгрунтаваныя абвінавачанні ў яго адрас. З матэрыялаў незалежных СМІ, а таксама відэазапісаў, зробленых некалькімі мінакамі, было бачна, як пара жанчын следавала за Ціханоўскім, спрабуючы справакаваць яго на канфлікт. Спачатку ён паразмаўляў з імі, але ў далейшым спрабаваў пазбягаць. Міліцыянты схапілі Ціханоўскага за руку пасля таго, як адна з жанчын паскардзілася, што ён не адказвае на яе пытанні. Натоўп людзей пасунуўся, каб дапамагчы Ціханоўскаму і загарадзіць ад міліцыі, але падчас гэтага адзін міліцыянт паваліўся на зямлю. Праз некалькі імгненняў АМАП затрымаў Ціханоўскага і дзевяць ягоных паплечнікаў, у тым ліку мясцовага прадстаўніка выбарчай кампаніі, якога не было побач з месцам меркаванай бойкі. У чэрвені Ціханоўскаму былі прад'яўленыя абвінавачанні ў розных крымінальных злачынствах (гл. раздзел 2.б.). Па стане на снежань Ціханоўскі заставаўся пад вартай.

18 чэрвеня ўлады затрымалі былога старшыню Белгазпрамбанка, кандыдата ў прэзідэнты Віктара Бабарыку і яго сына Эдуарда, калі яны збіраліся падаць у Цэнтральную выбарчую камісію неабходныя подпісы для рэгістрацыі кандыдатуры Віктара Бабарыкі ў прэзідэнты. Бабарыка быў дастаўлены ў памяшканне Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю на допыт, і ўлады забаранілі адвакатам Бабарыкі размаўляць з ім. Незалежныя СМІ і праваабарончыя НДА паведамілі, што 21 чэрвеня ўлады прад'явілі Бабарыку абвінавачанні ў адмыванні грошай у буйных памерах, ухіленні ад сплаты падаткаў, буйнамаштабных крадзяжах, махлярстве і хабарніцтве. Такія абвінавачанні вядуць да крымінальнага пакарання, уключна са штрафамі і шматгадовым турэмным зняволеннем. Суд адхіліў хадайніцтва

Бабарыкі аб адмене яго ўтрымання пад вартай. Улады адмовіліся зарэгістраваць Бабарыку ў якасці кандыдата пасля таго, як яго ініцыятыўная група сабрала больш за 400 000 сапраўдных подпісаў, спаслаўшыся на неадпаведнасці ў яго дэкларацыі аб прыбытках і маёмасці, а таксама на "ўдзел замежнай арганізацыі ў яго выбарчай кампаніі". НДА заяўлялі, што Бабарыка быў арыштаваны ў сувязі з яго палітычнай дзейнасцю і ўсеагульнай папулярнасцю падчас прэзідэнцкай кампаніі. Па стане на снежань Бабарыка і ягоны сын заставаліся пад вартай.

29 чэрвеня МУС заявіў аб пачатку папярэдняга расследавання меркаваных "фактаў незаконнай дзейнасці" кандыдата ў прэзідэнты, заснавальніка Парка высокіх тэхналогій і былога дыпламата Валерыя Цапкалы. 14 ліпеня Цэнтральная выбарчая камісія забараніла яму ўдзел у прэзідэнцкай кампаніі, заявіўшы, што многія з сабраных у яго падтрымку подпісаў несапраўдныя, а інфармацыя ў дэкларацыі аб прыбытках і маёмасці жонкі недакладная. 21 ліпеня ў мінскім судзе ў адсутнасць Цапкалы адбыліся папярэднія слуханні па пазове, пададзеным супраць яго турэцкім бізнесоўцам, які вінаваціў Цапкалу ў хабарніцтве. 24 ліпеня Цапкала ўцёк з краіны разам з дзецьмі пасля таго, як даведаўся, што ўлады плануюць арыштаваць яго (гл. раздзел 2).

Урад, падобна, маніпуляваў адміністрацыйнымі працэдурамі і крытэрамі рэгістрацыі кандыдатаў з мэтай абмежаваць палітычную канкурэнцыю. Ад кожнага прэтэндэнта, які хацеў стаць кандыдатам у прэзідэнты, улады патрабавалі сабраць 100 000 подпісаў. Грамадзянам было дазволена падпісвацца за некалькіх кандыдатаў. Для падліку подпісаў ўлады патрабавалі, каб ініцыятыўныя групы мелі афіцыйных прадстаўнікоў у кожным рэгіёне, якія б і падавалі подпісы разам з пацверджаннем грамадзянства ў органы мясцовага самакіравання. Подпісы грамадзян сапраўдныя толькі ў тых раёнах, дзе яны былі зарэгістраваныя, і гэта ўскладала вялікую нагрузку на невялікія ініцыятыўныя групы. Так, напрыклад, Цэнтральная выбарчая камісія адхіліла заяўку Цапкалы балатавацца кандыдатам у прэзідэнты, паколькі ён нібыта не падаў дастатковую колькасць подпісаў. Каманда Цапкалы сцвярджала, што яна падала 200 000 подпісаў, але ўлады палічылі сапраўднымі толькі 75 000 з іх, што прывяло да немагчымасці дасягнуць парога ў 100 000 подпісаў. Цапкала абскардзіў гэта рашэнне, але 20 ліпеня Вярхоўны суд адхіліў хадайніцтва.

Згодна са справаздачай Маскоўскага механізму АБСЕ, улады ўнеслі папраўкі, якія стварылі перашкоды празрыстасці фармавання выбарчых камісій, імкнуліся зменшыць долю незалежнага і апазіцыйнага ўдзелу ў выбарчых камісіях, а таксама адхілялі або не разглядалі скаргі і апеляцыі, датычныя ўключэння кандыдатаў у выбарчыя камісіі. Паводле дадзеных незалежных унутраных назіральнікаў, улады дыскрымінавалі сябраў апазіцыі, якія прэтэндавалі на месцы ў выбарчых камісіях. З 25-і сябраў апазіцыі, якія падалі заяўкі на месцы ў тэрытарыяльных выбарчых камісіях, увайшлі толькі двое. З 545 сябраў

апазіцыі, якія прэтэндавалі на месцы ва ўчастковых выбарчых камісіях, былі ўключаны толькі шасцёра. Астатнія месцы дасталіся праўладным арганізацыям. У выніку, як сцвярджалі назіральнікі, гэтыя камісіі засталіся настроенымі супраць апазіцыі.

Улады выкарыстоўвалі шэраг мераў, каб падтрымліваць меркаванне аб тым, што падлік галасоў 9 жніўня адпавядаў закону. Ключавымі з іх былі абмежаванні незалежнага назірання з боку мясцовых і міжнародных назіральнікаў на карысць праўладных, а таксама заявы пра больш актыўны ўдзел у датэрміновым галасаванні з мэтай павялічыць колькасць бюлетэняў, якія б маглі быць падлічаныя падманным шляхам на карысць Лукашэнкі.

Улады абмяжоўвалі прысутнасць мясцовых і міжнародных назіральнікаў падчас выбараў. Пасля рэгістрацыі тысяч праўладных назіральнікаў, 22 ліпеня старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына заявіла, што праз COVID-19 урад абмяжуе колькасць назіральнікаў на кожным выбарчым участку трыма асобамі падчас датэрміновага галасавання і пяццю ў дзень выбараў. Большасць незалежных назіральнікаў яшчэ не была зарэгістраваная (паколькі яны не чакалі, што рэгістрацыя будзе абмежаваная, і меркавалі, што ў іх ёсць больш часу для рэгістрацыі, як гэта было на папярэдніх выбарах, калі крайні тэрмін рэгістрацыі быў нашмат бліжэйшы да дня выбараў), а старшыні камісій на кожным выбарчым участку, якія кантралявалі назіранне, аддавалі прыярытэт тым, хто зарэгістраваўся першым.

Паступалі шматлікія паведамленні пра выпадкі прымусу дзяржаўных служачых да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні. Незалежныя ўнутраныя назіральнікі, якія падлічвалі колькасць выбаршчыкаў, ацанілі, што лічба датэрміновага галавання на некаторых выбарчых участках была завышаная ў два-тры разы, што падрывае давер да заявы ўрада пра тое, што яўка на датэрміновым галасаванні была вышэйшая за яўку ў дзень выбараў. У дзень выбараў незалежныя назіральнікі на некаторых участках адзначалі, што аб’яднаныя дадзеныя, якія складаліся з афіцыйных лічбаў датэрміновага галасавання і падлікаў назіральнікамі выбаршчыкаў у дзень выбараў, далі яўку больш за 100 адсоткаў выбаршчыкаў, зарэгістраваных на выбарчым участку. Як і на папярэдніх выбарах, падлік галасоў заставаўся для назіральнікаў непразрыстым.

Улады дазволілі дыпламатычнаму корпусу ўдзельнічаць у назіранні за выбарамі і адзначылі, што абмежаванні, звязаныя з COVID-19, не будуць прымяняцца да міжнародных назіральнікаў. Аднак падчас падліку галасоў старшыні камісій на некалькіх выбарчых участках заявілі, што пяць назіральнікаў ужо знаходзяцца ў памяшканні, і такім чынам забаранілі некаторым міжнародным назіральнікам назіраць за падлікам галасоў.

Назіральнікі за выкананнем правоў чалавека, незалежныя назіральнікі і дакладчык АБСЕ ў рамках Маскоўскага механізму прыйшлі да высновы, што выбары не адпавядалі міжнародным стандартам. Кандыдаты ад апазіцыі, іх прадстаўнікі і незалежныя назіральнікі паведамлялі, што ўлады адхілілі пераважную большасць пададзеных імі скаргаў.

Пасля таго, як 10 жніўня ўлады абвясцілі папярэднія вынікі выбараў, заявіўшы, што ў іх перамог Лукашэнка, урад вымусіў кандыдатку ў прэзідэнты Святлану Ціханоўскую пакінуць краіну. Вынікі на невялікай колькасці выбарчых участкаў, дзе праводзіўся празрысты падлік галасоў, паказалі, што Ціханоўская атрымала больш галасоў у гэтых месцах, і далі падставу меркаваць, што яна магла атрымаць большасць галасоў або дастатковую іх колькасць для правядзення другога тура галасавання. Паводле дадзеных незалежнага маніторынгу НДА, дзяржаўны кантроль над усімі вяшчальнымі СМІ выкарыстоўваўся для прасоўвання кандыдатуры дзейнага прэзідэнта, у той час як падкантрольныя дзяржаве СМІ забяспечвалі толькі крытычнае асвятленне кандыдатаў ад апазіцыі, пераважна канцэнтруючыся на крымінальных абвінавачаннях, высунутых супраць іх уладамі.

На думку прадстаўнікоў НДА, выбарчы працэс на ўсіх этапах не адпавядаў шэрагу міжнародных стандартаў дэмакратычных і справядлівых выбараў. Паведамлялася пра шматлікія парушэнні міжнародных стандартаў і заканадаўства краіны.

Улады пераважна адхілялі або ігнаравалі петыцыі і скаргі аб парушэннях выбарчага кодэкса на рознах этапах выбараў. У суды паступіла 484 апеляцыі датычна рашэнняў аб фармаванні выбарчых камісій, з якіх 415 былі адхіленыя, а 69 пакінутыя без разгляду. Незалежныя назіральнікі, якія ўваходзілі ў добраахвотную ініцыятыву па назіранні за выбарамі “Праваабаронцы за свабодныя выбары”, падалі каля 3 000 скаргаў у разнастайныя дзяржаўныя органы і вышэйстаячыя выбарчыя камісіі падчас датэрміновага галасавання і ў дзень выбараў. Паведамляецца, што ўлады адхілілі ўсе скаргі.

Паводле дадзеных АБСЕ, для назірання за прэзідэнцкімі выбарамі 9 жніўня патрабавалася своечасовае запрашэнне, якое мусіла паступіць не менш чым за 12 тыдняў да дня выбараў.

Калі 8 траўня ўрад абвясціў дату прэзідэнцкіх выбараў, ён таксама заявіў, што Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЕ будзе запрошана для назірання пасля заканчэння перыяду рэгістрацыі кандыдатаў 14 ліпеня. АБСЕ некалькі разоў нагадвала ўладам краіны, што ёй патрэбнае своечасовае запрашэнне, і 15 ліпеня кіраўнік БДІПЧ абвясціў, што БДІПЧ не атрымала своечасовага запрашэння і не зможа накіраваць місію назіральнікаў. Улады Беларусі накіравалі запрашэнне 15 ліпеня. Калі пазней ўлады

раскрытыкавалі за адсутнасць назіральнікаў ад БДІПЧ, урад усклаў віну на сам БДІПЧ, заявіўшы, што краіна запрасіла БДІПЧ прысутнічаць і кантраляваць галасаванне. У справаздачы Маскоўскага механізму АБСЕ адзначаецца, што ўрад накіраваў запрашэнне за чатыры месяцы да выбараў у Нацыянальны сход у 2019 годзе, “што вымушае падазраваць, што (затрымка запрашэння) была зробленая наўмысна, каб пазбегчы міжнароднага маніторынгу часткі перадвыбарчага працэсу, у прыватнасці, рэгістрацыі кандыдатаў, з якой назіраліся шматлікія праблемы”.

Раней у сакавіку міжнародныя назіральнікі далі ацэнку выбарам у Нацыянальны сход у лістападзе 2019 года, заявіўшы, што яны таксама не адпавядалі міжнародным стандартам. Згодна з прамежкавай справаздачай місіі па назіранні за выбарамі БДІПЧ, Парламенцкай асамблеі АБСЕ і Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы, хоць выбары ў Нацыянальны сход прайшлі спакойна з вялікай колькасцю кандыдатаў і назіральнікаў, яны не адпавядалі важным міжнародным стандартам дэмакратычных выбараў і прадэманстравалі поўную знявагу асноўных свабод - свабоды сходаў, асацыяцый і слова.

У справаздачы місіі назіральнікаў за выбарамі ў Нацыянальны сход было адзначана вылучэнне вялікай колькасці кандыдатаў на выбарах, але празмерна абмежавальны працэс рэгістрацыі, які тармазіў удзел кандыдатаў ад апазіцыі. Абмежаваныя агітацыйныя кампаніі праходзілі ў абмежавальным асяроддзі, якое ў цэлым не прадугледжвала значнага ці палітычна канкурэнтнага змагання. Асвятленне ў СМІ выбарчай кампаніі не дазваляла выбаршчыкам атрымліваць дастатковую інфармацыю пра кандыдатаў. У выбарчых камісіях пераважалі прадстаўнікі органаў выканаўчай улады, што абмяжоўвала іх бесстароннасць і незалежнасць, а цэласнасць выбарчага працэсу не была належным чынам забяспечаная. Значныя працэдурныя недахопы пры падліку галасоў выклікалі занепакоенасць тым, наколькі сумленна падводзіліся і перадаваліся вынікі галасавання, а агульная адсутнасць празрыстасці звузіла магчымасці для сур’ёзнага назірання.

<u>Палітычныя партыі і ўдзел у палітычным жыцці:</u> Улады рэгулярна пераследавалі апазіцыйныя палітычныя партыі ды іх актывістаў і стваралі перашкоды іх дзейнасці. Некаторыя апазіцыйныя партыі не мелі афіцыйнага статусу, паколькі ўлады адмаўлялі ім у рэгістрацыі, а ўрад рэгулярна парушаў іх права на арганізацыю, удзел у выбарах, збор галасоў і публікацыю праграм. Улады дазвалялі свабодна працаваць амаль паўтузіну пераважна бяздзейных, аднак афіцыйна зарэгістраваных пралукашэнкаўскіх палітычных партый. Урад выкарыстоўваў сваю манаполію на тэлерадыёвяшчанне, каб прынізіць апазіцыю і прапагандаваць пралукашэнкаўскія партыі, а таксама абмяжоўваць магчымасці апазіцыйных кандыдатаў даносіць да публікі свае погляды. Паступалі паведамленні пра тое, што дзяржаўныя рэсурсы выкарыстоўваюцца ў

інтарэсах дзейнага прэзідэнта, напрыклад, дзяржаўныя чыноўнікі праводзілі агітацыю за Лукашэнку ў працоўны час.

Цягам года ўлады штрафавалі і арыштоўвалі лідараў апазіцыйных палітычных партый за парушэнне Закона аб масавых мерапрыемствах і ўдзел у шэрагу несанкцыянаваных дэманстрацый (гл. раздзел 2). Закон дазваляе ўладам прыпыняць дзейнасць партый на шэсць месяцаў пасля аднаго папярэджання і закрываць іх пасля двух. Закон таксама забараняе палітычным партыям атрымліваць дапамогу з-за мяжы і патрабуе абавязковай рэгістрацыі ў Міністэрстве юстыцыі ўсіх палітычных груп і кааліцый. Сябры партый, якім улады адмовілі ў рэгістрацыі, напрыклад, Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі, па-ранейшаму былі аб'ектам перасследу і адвольных праверак.

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына паведаміла, што абмежаванні ў сувязі з COVID-19 не распаўсюджваюцца на міжнародных назіральнікаў, даверчых асобаў кандыдатаў у прэзідэнты, чальцоў Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, чальцоў мясцовых саветаў, якія могуць назіраць за выбарамі ў адпаведнасці са сваім статусам, а таксама на зарэгістраваныя СМІ. Пераважная большасць назіральнікаў на выбарчых участках, а таксама падчас галасавання і падліку галасоў была звязаная з уладамі, у той час як мясцовыя незалежныя назіральнікі чакалі за межамі выбарчых участкаў і спрабавалі палічыць колькасць асобаў, якія прыходзілі на ўчасткі. Унутраныя незалежныя назіральнікі сутыкнуліся са значнымі абмежаваннямі, уключна з абмежаваннем іх магчымасці прысутнічаць на выбарчых участках нібыта праз пагрозу COVID-19. Аднак урад не прыняў ніякіх іншых мераў перасцярогі, звязаных з пандэміяй, такіх як прымусовае сацыяльнае дыстанцыяванне, абмежаванне колькасці выбаршчыкаў у памяшканні ў пэўны момант часу або патрабаванне насіць маскі. У шэрагу выпадкаў камісіі выдалялі незалежных мясцовых назіральнікаў з выбарчых участкаў за нібыта ўмяшальніцтва ў іх працу і забаранялі ім рабіць відэа і фатаграфаваць. Некаторыя дзяржаўныя чыноўнікі, якія адказвалі за выбарчыя ўчасткі, выклікалі міліцыю, каб затрымаць незалежных унутраных назіральнікаў за разнастайныя, паводле іх меркавання, неадпаведныя дзеянні. Міліцыя пераважна дастаўляла гэтых назіральнікаў у РУВД, правярала дакументы і адпускала. Праваабаронцы паведамілі, што ў перыяд датэрміновага галасавання было затрымана 86 унутраных назіральнікаў.

<u>Удзел жанчын і меншасцяў:</u> Не існавала законаў, якія б забаранялі жанчынам або прадстаўнікам меншасцяў браць удзел у палітычных працэсах, аднак патрыярхальнае стаўленне грамадства не спрыяла намаганням жанчын атрымаць пасады ва ўладных структурах. З 24 міністраў ва ўрадзе краіны была толькі адна жанчына. Жанчыны ўсё часцей далучаліся да апазіцыі ў якасці

лідараў, былі актыўнымі сябрамі апазіцыі, праводзілі рэгулярныя “жаночыя маршы” і больш шырока ўдзельнічалі ў пратэстах. Жанчыны заяўлялі незалежным СМІ, што іх натхніла на большую палітычную актыўнасць выказванне Лукашэнкі пра яго апанентку Ціханоўскую. Ён заявіў: “У нас Канстытуцыя не пад жанчыну. І ў нас грамадства не выспела для таго, каб галасаваць за жанчыну. Таму што ў нас па Канстытуцыі прэзідэнт валодае моцнай уладай”. У больш позніх каментарах, паясняючы сваю заяву, Лукашэнка сказаў, што прэзідэнцтва - вялікі цяжар нават для мужчыны, а «калі яго ўскласці на жанчыну, то яна зваліцца.”

Раздзел 4. Карупцыя і недастатковая празрыстасць дзяржаўных органаў

Закон прадугледжвае крымінальную адказнасць за службовую карупцыю, і ўлады рэгулярна пазбаўлялі волі афіцыйных асобаў, якія, як меркавалася, былі замешаныя ў карупцыйных справах. Аднак паступалі таксама паведамленні пра тое, што некаторыя высокапастаўленыя чыноўнікі часам беспакарана займаліся карупцыйнымі справамі. Глабальныя паказальнікі эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання Сусветнага банка адлюстроўвалі той факт, што карупцыя ў краіне ўяўляла сабой сур’ёзную праблему. У сакавіку 2019 года Група дзяржаў супраць карупцыі (GRECO) Савета Еўропы заявіла пра неадпаведнасць краіны антыкарупцыйным стандартам. Урад не апублікаваў справаздачу аб ацэнцы адпаведнасці, што, паводле GRECO, “кінула цёмны цень на намеры Беларусі працаваць у напрамку прадухілення карупцыі і змагання з ёй, а таксама на агульнае супрацоўніцтва з GRECO”. У кастрычніку 2019 года выканаўчы сакратар GRECO яшчэ раз выказаў сваю занепакоенасць у сувязі з “пастаянным невыкананнем краінай патрабаванняў”.

Карупцыя: Згодна з афіцыйнымі крыніцамі, большасць карупцыйных спраў тычылася вымагальніцтва і атрымання хабару, махлярства і злоўжывання ўладай, хоць, як паведамлялася, такіх праяваў карупцыі ў працэсе штодзённага ўзаемадзеяння паміж грамадзянамі і дзяжаўнымі служачымі ніжэйшага звяна, як гэта ні дзіўна, звычайна не назіралася.

Адсутнасць незалежнай судовай сістэмы і органаў правапарадку, недастатковы падзел паўнамоцтваў і пераслед незалежнай прэсы, у значнай ступені пазбаўленай права ўзаемадзейнічаць з непразрыстым дзяржаўным бюракратычным апаратам, зрабілі амаль немагчымым вызначыць маштабы карупцыі або весці з ёй эфектыўную барацьбу.

Самымі карумпаванымі сектарамі былі дзяржаўнае кіраванне і закупкі, прамысловы сектар, будаўнічы сектар, ахова здароўя і адукацыя.

Цягам года было ўзбуджана шмат спраў аб карупцыі. Так, напрыклад, у студзені КДБ абвясціў пра арышт чатырох генеральных дырэктараў цукровых заводаў, уключна з кіраўніком Беларускай цукровай кампаніі і былым намеснікам кіраўніка Упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Уладзімірам Ціхінем. Іх абвінавацілі ў атрыманні хабару на "сотні тысяч даляраў", а Лукашэнка абвінаваціў у "кішэнных адкатах і карупцыі" за нібыта продаж цукру па заніжаным кошце праз пасярэднікаў, якія экспартавалі яго ў Расію і незаконна рээкспартавалі назад па больш высокай цане. 25 жніўня незалежныя СМІ паведамілі, што Ціхіня, які нібыта паведаміў генеральным дырэктарам пра магчымыя праверкі і дзеянні супраць іх, быў абвінавачаны і вызвалены, у той час як астатнія падазраваныя, паводле звестак, застануцца пад вартай да суда.

У цэлым судовы пераслед за карупцыю заставаўся выбарачным і непразрыстым.

Раскрыццё фінансавай інфармацыі: Заканадаўствам аб барацьбе з карупцыяй прадугледжана раскрыццё звестак аб даходах і маёмасці прызначаных або абраных на дзяржаўныя пасады асобаў, іх сужэнцаў і сваякоў, якія дасягнулі поўнагадовага ўзросту і працягваюць пражываць разам з імі. Згодна з законам, спецыялізаваныя падраздзяленні па барацьбе з карупцыяй у складзе Генеральнай пракуратуры, КДБ і Міністэрства ўнутраных спраў адсочваюць і кантралююць дзейнасць па барацьбе з карупцыяй, а генеральны пракурор і ўсе іншыя пракуроры ўпаўнаважаныя ажыццяўляць нагляд за прымяненнем антыкарупцыйнага заканадаўства. Гэтыя дэкларацыі не былі даступнымі шырокай грамадскасці, выключэннем з'яўляліся кандыдаты, якія бралі ўдзел у прэзідэнцкіх, парламенцкіх і муніцыпальных выбарах. За невыкананне закона прадугледжаны адміністрацыйныя санкцыі і дысцыплінарныя спагнанні.

Раздзел 5. Стаўленне органаў улады да расследаванняў меркаваных парушэнняў правоў чалавека, вядуцца міжнароднымі і недзяржаўнымі арганізацыямі

У краіне дзейнічаў шэраг мясцовых праваабарончых НДА, хоць улады нярэдка дэманстравалі ў дачыненні да іх дзейнасці варожае стаўленне і абмяжоўвалі яе, выбарачна супрацоўнічалі з імі і не рэагавалі на іх заявы.

Вядомыя праваабарончыя НДА, такія як Беларускі Хельсінскі камітэт (БХК), Офіс па правах людзей з інваліднасцю і Цэнтр прававой трансфармацыі, дзейнічалі як зарэгістраваныя арганізацыі. Урад адмовіў у рэгістрацыі шэрагу іншых арганізацый, тым самым ставячы іх пад пагрозу штрафных санкцый.

Шэраг незарэгістраваных НДА, у тым ліку “Вясна” і “Прававая дапамога насельніцтву”, працягвалі сваю дзейнасць.

Часам улады ажыццяўлялі пераслед як зарэгістраваных, так і незарэгістраваных праваабарончых арганізацый. Яны дасылалі праверкі і пагражалі адклікаць рэгістрацыю і, паводле звестак, кантралявалі іх перапіску ды тэлефонныя размовы. Пачынаючы са жніўня, праваабаронцаў таксама арыштоўвалі падчас жорсткіх рэпрэсіўных дзеянняў з боку дзяржавы. Напрыклад, 17 верасня была затрыманая праваабаронца “Вясны” і каардынатарка валанцёраў Марфа Рабкова, якой пазней было прад’яўлена абвінавачанне ў злачыннай дзейнасці за “навучанне або іншую падрыхтоўку асобаў да ўдзелу ў масавых беспарадках або фінансаванне такой дзейнасці”. “Вясна” сцвярджала, што затрыманне і абвінавачанні супраць Рабковай былі палітычна матываванымі і з’яўляліся адказам на яе дзейнасць па навучанні кароткатэрміновых назіральнікаў за выбарамі для валанцёрскай ініцыятывы “Праваабаронцы за свабодныя выбары” і на яе працу па дакументаванні жорсткага абыходжання з затрыманымі. Па стане на снежань Рабкова заставалася ў зняволенні разам з двума іншымі валанцёрамі “Вясны” - Андрэем Чапюком і Ксеніяй Сырамалот. “Вясна” ўсіх трох абвясціла палітвязнямі.

Урад пераважна ігнараваў справаздачы, падрыхтаваныя праваабарончымі НДА, і рэдка сустракаўся з прадстаўнікамі незарэгістраваных арганізацый. Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі рэдка паведамлялі пра праваабарончыя НДА і іх дзейнасць.

На працягу года банкаўскія рахункі Беларускага Хельсінскага камітэта (БХК) заставаліся заблакаваныя праз даўнюю падатковую запазычанасць, звязаную з замежным фінансаваннем у пачатку 2000-ых гадоў, у сувязі з чым улады і наклалі гэтыя абмежаванні, аднак пры гэтым дазвалялі БХК працаваць без аніякіх іншых перашкод.

Улады могуць закрыць НДА пасля таго, як вынесуць толькі адно папярэджанне аб парушэнні закона, у тым ліку і закона аб масавых мерапрыемствах. Закон дазваляе ўладам закрываць НДА за тое, што яны прымалі тыя формы замежнай дапамогі, якія ўлады не лічылі законнымі, і дазваляе Міністэрству юстыцыі кантраляваць дзейнасць НДА і праводзіць праверку іх дакументацыі. НДА таксама мусілі прадастаўляць у міністэрства падрабязныя штогадовыя справаздачы аб сваёй дзейнасці, месцазнаходжанні офісаў і агульнай колькасці сябраў.

У цэлым улады неахвотна супрацоўнічалі з міжнароднымі НДА і службовымі асобамі іншых праваабарончых арганізацый па пытаннях праваабарончай дзейнасці, а прадстаўнікі міжнародных НДА часта сутыкаліся са складанасцямі пры атрыманні дазволу на ўезд у краіну ў сваёй афіцыйнай якасці. Улады

рэгулярна ігнаравалі рэкамендацыі мясцовых і міжнародных НДА па паляпшэнні сітуацыі з правамі чалавека ў краіне і патрабаванні спыніць пераслед прадстаўнікоў праваабарончай супольнасці.

ААН і іншыя міжнародныя арганізацыі: У 2018 годзе Савет па правах чалавека ААН прызначыў Анаіс Марын новым Спецдакладчыкам па правах чалавека ў Беларусі. Урад працягваў выступаць супраць "палітызаванага і бессэнсоўнага" мандату дакладчыка, адмаўляўся яго прызнаваць і забараніў Марын уезд у краіну. 17 верасня ў агульнай колькасці 17 краін-сябраў АБСЕ прымянілі "Маскоўскі механізм" супраць краіны, каб прааналізаваць паведамленні пра сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека, уключна з фальсіфікацыяй выбараў і істотным ўмяшальніцтвам у свабоду выражэння і права на мірныя сходы. Краіна не супрацоўнічала з экспертнай місіяй механізму і не дазваляла ёй доступ у краіну.

Дзяржаўныя органы, адказныя за выкананне правоў чалавека: У краіне няма амбудсмена ці нейкай іншай праваабарончай установы. Дзейнасць Пастаяннай камісіі па правах чалавека ў ніжняй палаце Нацыянальнага Сходу была неэфектыўнай.

Раздзел 6. Дыскрымінацыя, гвалт у грамадстве і гандаль людзьмі

Жанчыны

Згвалтаванне і хатні гвалт: У цэлым закон кваліфікуе згвалтаванне як злачынства, аднак не ўтрымлівае асобных палажэнняў аб згвалтаванні сужэнцаў. Пакаранне за згвалтаванне з ацягчальнымі абставінамі складае ад 3 да 15 год пазбаўлення волі. У той самы час як сэксуальныя пасягальніцтвы працягвалі заставацца сур'ёзнай праблемай, урад, як правіла, узбуджаў справы супраць асобаў, якія не з'яўляліся сужэнцамі і здзейснілі згвалтаванне. Так, напрыклад, 3 сакавіка Вілейскі раённы суд прызнаў 26-гадовага мужчыну вінаватым у згвалтаванні 15-гадовай дзяўчыны і пакараў яго сямю гадамі пазбаўлення волі. Справа разглядалася як згвалтаванне заведама няпоўнагадовай асобы, і каралася паводле закона пазбаўленнем волі на тэрмін ад 5 да 13 год. Паводле дадзеных НДА, улады часта не разглядалі згвалтаванне сужэнца і не прыцягвалі да крымінальнай адказнасці па такіх справах, калі толькі яны не суправаджаліся сур'ёзнымі ацягчальнымі акалічнасцямі і наўпроставай пагрозай жыццю.

Значнай праблемай быў хатні гвалт, і цягам года ўрад не рабіў эфектыўных захадаў для яго прадухілення. Улады працягвалі выдаваць ахоўныя прадпісанні, паводле якіх ахвяры і асобы, учыніўшыя гвалт, павінны былі пражываць асобна, і забяспечвалі іх месцамі часовага пражывання на перыяд дзеяння

прадпісання. Таксама дзейнічалі крызісныя цэнтры, якія прадастаўлялі ахвярам часовы прытулак і аказвалі псіхалагічную і медыцынскую дапамогу.

Закон аб прадухіленні злачынстваў уводзіць асобнае вызначэнне хатняга гвалту і забяспечвае выкананне ахоўных прадпісанняў працягласцю ад трох да трыццаці дзён. Паводле закона, улады мусяць забяспечыць ахвяраў гвалту і асобаў, якія ўчынілі гвалт, месцам часовага пражывання на перыяд дзеяння прадпісання. Акрамя таго, кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях вызначае вялікія штрафы або пазбаўленне волі тэрмінам да 15 сутак за парушэнне ахоўных прадпісанняў, збіццё, наўмыснае прычыненне болю, а таксама псіхалагічных або фізічных пакутаў блізкім чальцам сям'і.

Паводле дадзеных шэрагу недзяржаўных арганізацый, якія займаюцца правамі жанчын, ахоўныя прадпісанні і крызісныя кабінеты заставаліся неэфектыўнымі і забяспечвалі абмежаваную абарону правоў ахвяраў. Таксама не рабілася захадаў па прыцягненні да адказнасці правапарушальнікаў і забеспячэнні юрыдычных і іншых сродкаў прававой абароны для выпраўлення іх паводзінаў. Эксперты НДА працягвалі адзначаць адсутнасць падтрыманых дзяржавай прытулкаў і спецыялістаў, якія працуюць з ахвярамі, дзецьмі і агрэсарамі.

Паводле дадзеных МУС, са студзеня па сакавік было зарэгістравана 655 правапарушэнняў, звязаных з побытавым гвалтам і гвалтам у сям'і, што на 18 адсоткаў менш, чым за той жа перыяд 2019 года. З іх 58 выпадкаў уключалі нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, 27 смяротных выпадкаў па віне сямейнікаў, а таксама 225 выпадкаў прагрозы смерцю і нанясеннем цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Міліцыя паведаміла, што прыцягнула да крымінальнай адказнасці 186 чалавек па абвінавачанні ў жорсткім абыходжанні ў сям'і. Са студзеня па сакавік міліцыя выдала 1903 ахоўныя прадпісанні.

Паводле інфармацыі ў СМІ, 14 траўня ў Чэрыкаве 38-гадовы мужчына жорстка збіў сваю 39-гадовую жонку. Жанчына не паведаміла міліцыі і звярнулася па медыцынскую дапамогу толькі праз два дні, была шпіталізаваная і ў той жа день памерла ад атрыманых траўм. Мужчына быў затрыманы і супраць яго было высунута абвінавачанне.

З прадстаўніком Міністэрства ўнутраных спраў можна было звязацца адзін раз цягам ліпеня па агульнарэспубліканскай гарачай лініі НДА для ахвяраў хатняга гвалту. У жніўні недзяржаўная арганізацыя, якая забяспечвала гарачую лінію, спыніла супрацу з прадстаўніком МУС пасля таго, як улады разагналі дэманстрантаў. Па стане на чэрвень арганізатары прытулкаў і гарачай лініі не бачылі павелічэння колькасці запытаў аб дапамозе ў краіне падчас COVID-19,

хоць гэта магло быць звязана з адсутнасцю ўведзеных урадам патрабаванняў ізаляцыі і самаізаляцыі на ўсёй тэрыторыі краіны. Міністэрствы ўнутраных спраў, працы і сацыяльнай абароны, аховы здароўя сумесна з НДА працягнулі кампанію “Дом без гвалту”. Падчас пандэміі кампанія была перанесеная ў анлайн, але асвятлялася ў дзяржаўных СМІ.

Сэксуальныя дамаганні: Паводле звестак, сэксуальныя дамаганні былі шырока распаўсюджаныя, аднак канкрэтныя законы для вырашэння гэтай праблемы, акрамя палажэнняў аб забароне фізічнага гвалту, адсутнічалі. Ахвяры сэксуальных дамаганняў не мелі доступу да крымінальных або грамадзянскіх сродкаў прававой абароны ад сэксуальных дамаганняў на працоўным месцы.

Прымусовыя дзеянні па кантролі народанасельніцтва: У папярэднія гады жанчыны з абмежаванымі магчымасцямі, а таксама цяжарныя жанчыны, у дзяцей якіх ва ўлонні былі дыягнаставаныя магчымыя адхіленні, паведамлялі, што некаторыя лекары настойвалі на перарыванні цяжарнасці. Хоць і не было ніякіх прыкметаў таго, што гэтая практыка змянілася, цягам года прэса і НДА не асвятлялі ніякіх канкрэтных выпадкаў.

Дыскрымінацыя: Закон прадугледжвае роўныя правы жанчын у пытаннях валодання маёмасцю, атрымання маёмасці ў спадчыну, сямейнага права, роўнай аплаты за роўную працу (хоць на практыцы жанчынам часта плацілі менш), а таксама ў судовай сістэме, і ў цэлым гэты закон выконваўся. Хоць жанчыны маюць такі самы прававы статус, яны сутыкаліся з дыскрымінацыяй у сферы занятасці, а таксама з дыскрымінацыяй на працоўным месцы (гл. раздзел 7.г.).

Цягам года Лукашэнка зрабіў некалькі грэблівых каментароў у адносінах да жанчын-лідарак палітычнай апазіцыі, што адлюстравала дыскрымінацыйнае стаўленне да жанчын, якія ўдзельнічаюць у палітычным жыцці (гл. раздзел 3).

Дзеці

Рэгістрацыя нараджэння: Грамадзянства даецца па факце нараджэння на тэрыторыі краіны або на падставе грамадзянства бацькоў. Дзіця грамадзяніна з’яўляецца грамадзянінам незалежна ад месца нараджэння нават у тым выпадку, калі адзін з бацькоў не з’яўляецца грамадзянінам. Як правіла, нараджэнне дзяцей рэгістравалася адразу.

Жорсткае абыходжанне з дзецьмі: Згвалтаванне і сэксуальны гвалт у дачыненні да няпоўнагадовых караецца тэрмінам да 15 год пазбаўлення волі. Сэксуальныя акты паміж асобай, старэйшай за 18 год, і асобай, пра якую вядома, што яна не дасягнула 16-гадовага ўзросту, караюцца тэрмінам да 10 год турэмнага зняволення.

Паводле мясцовых праваабарончых груп, хатні гвалт і жорсткае абыходжанне з дзецьмі былі звычайнай з'явай, а неафіцыйныя дадзеныя сведчаць пра тое, што многія бацькі прызнаваліся ў збіванні сваіх дзяцей. У шэрагу рэзанансных выпадкаў жорсткага абыходжання з дзецьмі і наўмыснага нанясення цялесных пашкоджанняў прынамсі адзін з бацькоў, які здзейсніў злачынства супраць дзіцяці, пакутаваў на алкагольную залежнасць, а другі не хацеў паведамляць пра злачынства. Напрыклад, суд горада Зэльва прызнаў вінаватым і прыгаварыў мужчыну да 25 год турэмнага зняволення за пастаянны гвалт над сваімі няпоўнагадовымі дочкамі, адна з якіх атрымала сур'ёзныя траўмы і памерла. Улады звычайна ўмешваліся, каб прадухіліць жорсткае абыходжанне з дзецьмі ў выніку хатняга гвалту, выяўлялі сем'і, якія апынуліся ў складаных умовах, і падбіралі прыёмныя сем'і для дзяцей, якія не маглі заставацца са сваёй сям'ёй, пакуль вялася прафілактычная праца. Хоць урад і працягваў пераслед вінаватых у жорсткім абыходжанні з дзецьмі, яго высілкі па ліквідацыі прычын жорсткага абыходжання з дзецьмі былі недастатковымі, паколькі не хапала эфектыўных магчымасцяў для выяўлення гвалту і своечасовага накіравання ахвяраў для атрымання адпаведнай дапамогі. Урад прыняў усеабдымную нацыянальную праграму на 2017-2021 гады па паляпшэнні догляду за дзецьмі і абароне правоў дзяцей, у тым ліку ахвяраў жорсткага абыходжання, хатняга гвалту і сэксуальнай эксплуатацыі ў камерцыйных мэтах, але прызнаў яе неэфектыўнасць у выкананні пэўных ахоўных мер і адсутнасць дапамогі з боку міжнародных арганізацый і НДА.

Пры садзейнічанні з боку НДА, якія абараняюць правы дзяцей, улады ў рамках расследаванняў або крымінальных спраў шырока выкарыстоўвалі працэдуру правядзення афіцыйнага аднаразовага допыту ў спецыялізаваных установах ахвяраў жорсткага абыходжання з дзецьмі пад непасрэдным наглядам псіхолагаў. Суды часта выкарыстоўвалі запісы паказанняў, каб пазбегчы паўторнага выкліку дзяцей-ахвяраў жорсткага абыходжання на судовыя слуханні, аднак эксперты працягвалі выказваць занепакоенасць тым, што ў некаторых выпадках суддзі ўсё ж выклікалі на слуханні для дачы паказанняў дзяцей-ахвяраў жорсткага абыходжання. Справы, якія закраналі правы і законныя інтарэсы няпоўнагадовых, як правіла, разглядаліся больш вопытнымі суддзямі, якія мелі досвед у галіне ўзроставай псіхалогіі, псіхіятрыі і адукацыі.

Па стане на студзень, Міністэрства адукацыі па ўсёй краіне мела 138 сацыяльна-адукацыйных цэнтраў для няпоўнагадовых ахвяраў любога тыпу гвалту або няпоўнагадовых, якія знаходзіліся ў цяжкіх і небяспечных умовах, але незалежныя назіральнікі паставілі пад сумнеў якасць іх паслуг. Медыцынскія ўстановы агульнага профілю аказваюць шырокі спектр медыцынскай дапамогі ахвярам жорсткага абыходжання з людзьмі.

<u>Раннія і прымусовыя шлюбы:</u> Паводле закона, мінімальны ўзрост уступлення ў шлюб для юнакоў і дзяўчат складае 18 год, хоць дзяўчаты, якія дасягнулі 14-

гадовага ўзросту, могуць афіцыйна выходзіць замуж са згоды бацькоў. Паступалі звесткі пра раннія шлюбы, калі дзяўчаты, што дасягнулі ўсяго толькі 14 год, і юнакі 16-гадовага ўзросту браліся шлюбам са згоды бацькоў.

Сэксуальная эксплуатацыя дзяцей: Мінімальны ўзрост, калі асоба можа ўступаць у сэксуальныя стасункі па ўласнай згодзе, складае 16 год. Дзіцячая прастытуцыя заставалася праблемай і дзяржава рабіла захады па барацьбе з ёй. У перыяд са студзеня па верасень улады выявілі 354 дзяцей, якія сталі ахвярамі сэксуальнага гвалту, і 24 выпадкі, калі дзяцей выкарыстоўвалі ў порнаіндустрыі. Закон прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да 13 год за выраб альбо распаўсюд парнаграфічных матэрыялаў з выявай няпоўнагадовых. У цэлым гэты закон выконваўся. Урад сцвярджаў, што закон не патрабуе доказаў прымянення сілы, махлярства ці прымусу, каб устанавіць злачынства, звязанае з гандлем дзецьмі з мэтай сэксуальнай эксплуатацыі, і заяўляў, што выявіў 27 няпоўнагадовых ахвяраў гандлю людзьмі. Улады лічылі, што дзіцячая парнаграфія і розныя віды віртуальнага сэксу, такія як смс сэксуальнага характару, заваёва даверу з боку дзіцяці з мэтай схіліць яго да распусных дзеянняў і ўцягнуць у заняткі прастытуцыяй, а таксама сэксуальны шантаж былі сур'ёзнай праблемай, і ў студзені быў прыняты асобны план дзеянняў па абароне няпоўнагадовых ад сэксуальнага гвалту і эксплуатацыі на 2020-22 гады. Па стане на снежань інфармацыі пра выкананне плану не паступала.

Дзеці ў спецыялізаваных установах: Сістэмы выяўлення выпадкаў жорсткага абыходжання з дзецьмі ў дзіцячых дамах і іншых спецыялізаваных установах не існавала. Улады не паведамлялі пра якія-кольвечы выпадкі жорсткага абыходжання з дзецьмі ў такіх установах. Паступалі паведамленні пра выпадкі жорсткага абыходжання ў прыёмных сем'ях. Па некаторых з гэтых выпадкаў улады распачалі або працягнулі расследаванне.

Паводле даследавання ЮНІСЭФ ад 2018 года, больш чым 2 з 5 дзяцей у дзіцячых дамах станавіліся ахвярамі фізічнага ці псіхалагічнага гвалту. Прыблізна чвэрць дзяцей у дзіцячых дамах, якія прынялі ўдзел у апытанні, паведамілі, што сталі ахвярамі фізічнага гвалту. Дзеці ў такіх установах аказваліся значна больш уразлівымі ў параўнанні з дзецьмі, якія пражывалі ў сем'ях: яны ў два ці тры разы часцей станавіліся ахвярамі гвалту, чым дзеці, якія навучаліся ў сярэдняй школе. Паводле дзяцей з навучальных установаў закрытага тыпу і пенітэнцыярных установаў, яны часцей станавіліся ахвярамі гвалту як дома, так і ў гэтых установах.

Міжнароднае скраданне дзяцей: Краіна з'яўляецца ўдзельніцай Гаагскай канферэнцыі 1980 года па грамадзянска-прававых аспектах міжнароднага скрадання дзяцей. Гл. *Штогадовы даклад Дзярждэпартамента ЗША аб*

скраданні бацькамі дзяцей: https://travel.state.gov/content/travel/en/International-Parental-ChildAbduction/for-providers/legal-reports-and-data/reported-cases.html.

Антысемітызм

Паводле інфармацыі габрэйскай супольнасці, у краіне пражывала ад 30 000 да 40 000 габрэяў.

Паступалі паведамленні пра асобныя праявы антысемітызму пасля выбараў 9 жніўня, у тым ліку пра выпадкі гвалту з прычыны антысемітызму з боку дзяржаўных структур падчас затрыманняў. Так, напрыклад, паводле інфармацыі ў СМІ, міліцыя падчас пратэстаў у Мінску затрымала Аляксандра Фрумана. Фруман паведаміў, што, даведаўшыся, што ён з'яўляецца грамадзянінам Ізраіля, міліцыянты збілі яго, выкрыкваючы антысеміцкія абразы, і прыгразілі, што прыйшоў час "зрабіць яшчэ адно абразанне". Лідары габрэйскай абшчыны не выказвалі заклапочанасці тым, што іх прадстаўнікі, якія ўдзельнічалі ў пратэстах, пры затрыманні станавіліся ахвярамі пераследу праз сваю этнічную або рэлігійную прыналежнасць.

На многіх мемарыялах, прысвечаных ахвярам Халакосту і пабудаваных яшчэ за савецкім часам і ў больш позні перыяд, не былі пазначаныя ахвяры габрэйскага народу з мэтай вылучыць іх сярод іншых ахвяраў фашысцкіх зверстваў. Габрэйская супольнасць працягвала супрацоўнічаць з замежнымі донарамі і мясцовымі ўладамі з мэтай усталяваць мемарыялы ў памяць менавіта габрэйскіх ахвяраў.

Гандаль людзьмі

Гл. *Справаздачу аб гандлі людзьмі Дзярждэпартамента ЗША* на старонцы: https://www.state.gov/trafficking-in-persons-report/.

Людзі з інваліднасцю

Закон наўпростава не забараняе дыскрымінацыю ў дачыненні да людзей з фізічнымі, сенсорнымі, разумовымі і псіхічнымі парушэннямі, і такая дыскрымінацыя была звыклай з'явай.

14 верасня суд у Смаргоні адхіліў пазоў, пададзены настаўнікам мясцовай дзіцячай музычнай школы, які меў фізічныя парушэнні і спрабаваў аднавіць шэраг сваіх правоў, якія, як ён сцвярджаў, былі парушаныя на падставе інваліднасці і дыскрымінацыйнага да яго стаўлення. Так, напрыклад, хоць ён і працаваў у школе з 1996 года, будынак не быў цалкам даступны для яго, і адміністрацыя праводзіла сход з настаўнікамі на паверсе, да якога настаўнік не мог дабрацца, што абмяжоўвала яго магчымасць дзяліцца інфармацыяй,

датычнай яго працы. Настаўнік таксама спасылаўся на дыскрымінацыйныя і зневажальныя выразы, якія выкарыстоўвала кіраўніцтва школы і іншыя настаўнікі, а таксама на адмову дырэктара забяспечыць дадатковыя выходныя настаўніку, які знаходзіўся ў групе рызыкі па COVID-19. Паведамляецца, што школа змяніла графік працы настаўніка і палепшыла доступ да будынка яшчэ да вынясення судовага рашэння, што дазволіла суду спыніць разгляд справы.

Закон патрабуе, каб транспартныя сродкі, жылыя дамы і прадпрыемствы былі даступныя для людзей з інваліднасцю, аднак для людзей у інвалідных вазках або людзей з праблемамі слыху ці зроку даступнымі былі толькі нешматлікія грамадскія месцы. Паводле ацэнкі Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-вазочнікаў, больш за 90% асобаў з фізічнымі парушэннямі не маглі пакінуць месца свайго пражывання без дапамогі, і, як сцвярджалася, дамы, у якіх яны пражывалі, не былі прыстасаваныя да патрэбаў людзей з фізічнымі парушэннямі. Хоць улады і заяўлялі, што 30% агульнай інфраструктуры краіны былі даступныя для людзей з інваліднасцю, арганізацыі па абароне правоў інвалідаў аспрэчвалі гэтыя лічбы, аднак цягам апошняга года сітуацыя працягвала паляпшацца. НДА паведамлялі, што ўрад усё ў большай ступені ўсведамляў гэтыя праблемы, але прагрэс быў павольным.

Адсутнасць у краіне магчымасцяў для самастойнага пражывання людзей з інваліднасцю не пакідала шмат для каго з іх ніякіх іншых шансаў, як толькі пражываць у дзяржаўных установах. Паводле Міністэрства працы, ва ўсёй краіне існавала прыкладна 89 такіх установаў, дзе знаходзілася блізу 21 500 чалавек. Арганізацыі па абароне правоў людзей з інваліднасцю паведамлялі, што якасць догляду ў гэтых установах была нізкая. Паведамлялася пра выпадкі дамаганняў і жорсткага абыходжання, такіх як фізічны і псіхалагічны гвалт, адсутнасць медыцынскай дапамогі пры іншых станах, не звязаных з інваліднасцю, а таксама пра недастатковае фінансаванне ўстановаў і інфраструктуры. Улады працягвалі змяшчаць людзей з фізічнымі і разумовымі парушэннямі ў адну і тую ўстанову і не забяспечвалі ні тым, ні іншым спецыялізаваны догляд. Прыкладна 15 000 асобаў з інваліднасцю, якія пражывалі ў “псіханеўралагічных” установах, былі пазбаўленыя законных правоў, а суд прызначаў кіраўнікоў гэтых установаў іх законнымі апекунамі.

Для людзей з інваліднасцю праезд у грамадскім транспарце быў бясплатным, аднак большасць станцый мінскага метро, а таксама аўтобусныя маршруты не былі дасяжныя для інвалідаў-вазочнікаў. У 2017 годзе, апошнім, па якім інфармацыя была даступная, эксперты недзяржаўнай арганізацыі “АКТ” па выніках маніторынгу выпусцілі справаздачу, згодна з якой толькі 3,3 % адукацыйных установаў па краіне былі дасяжныя для людзей з інваліднасцю, у тым ліку і для тых, хто меў парушэнні слыху ці зроку, і большасць з гэтых памяшканняў была нядаўна пабудаваная.

Людзі з інваліднасцю, асабліва асобы з парушэннямі зроку і слыху, часта мелі складанасці з магчымасцю звяртацца ў суды і атрымліваць перакладчыкаў у судзе. Жанчыны з інваліднасцю рэгулярна сутыкаліся з дыскрымінацыяй, у тым ліку з дыскрымінацыяй пры прыёме на працу, з заявамі, што яны не могуць паклапаціцца пра сваіх дзяцей, а таксама атрымлівалі горшыя медычныя паслугі і догляд у параўнанні з насельніцтвам у цэлым, асабліва ў правінцыйных медычных установах. Жанчыны з інваліднасцю, як і цяжарныя жанчыны, у дзяцей якіх былі дыягнаставаныя патэнцыйныя парушэнні развіцця ва ўлонні маці, паведамлялі, што некаторыя лекары настойліва раілі ім перапыніць цяжарнасць. Цяжарныя жанчыны з абмежаванымі магчымасцямі не сутыкаліся з безбар'ернай прасторай у радзільнях і шпіталях.

Нацыянальныя, расавыя і этнічныя меншасці

У грамадстве захоўвалася дыскрымінацыя прадстаўнікоў нацыянальнасці рома (цыганоў). Паводле заяваў лідараў цыганскай супольнасці, службы бяспекі і праваахоўчыя органы працягвалі іх адвольна затрымліваць, распачыналі ў дачыненні да іх расследаванні і жорстка з імі абыходзіліся, у тым ліку прымусова бралі адбіткі пальцаў, дрэнна ставіліся да іх у СІЗА і абражалі па прыкмеце нацыянальнасці.

Працягвалася дыскрымінацыя з боку дзяржавы і грамадства ў дачыненні да цыганоў, якіх у краіне налічвалася ад 6 848 (паводле перапісу насельніцтва 2019 года) да 60 000 чалавек (паводле ацэнак цыганскай супольнасці). Цыганская супольнасць па-ранейшаму маргіналізавалася, з'яўлялася аб'ектам рознага кшталту дыскрымінацыі, мела высокі ўзровень беспрацоўя, нізкі ўзровень адукацыі, а таксама адсутнасць доступу да сацыяльных паслуг. Як правіла, цыганы мелі беларускае грамадзянства, але шмат у каго з іх не было пасведчання асобы, і яны адмаўляліся яго атрымліваць.

Жорсткае абыходжанне, дыскрымінацыя і іншыя праявы гвалту, звязаныя з сэксуальнай арыентацыяй і гендарнай самаідэнтыфікацыяй

Паступалі паведамленні пра тое, што ўлады пагражалі і патуралі гвалту ў дачыненні да лесбіянак, гееў, бісэксуалаў, трансгендараў і інтэрсэксуалаў (ЛГБТІ). Напрыклад, паводле дадзеных праваабарончай ЛГБТІ-групы "Makeout", 26 верасня міліцыя затрымала трансгендара Яўгена Вялько падчас акцыі пратэсту. У машыне міліцыянты абражалі яго на падставе гендарнай ідэнтычнасці. У РУУС супрацоўнікі праваахоўчых органаў правялі вобшук з распрананнем і здзекаваліся з яго па гендарнай прыкмеце, пагражаючы згвалтаваннем і забойствам. Службовыя асобы следчага ізалятара паведамілі сваякам, якія ведалі, што ён у СІЗА, што ў іх установе не было затрыманых мужчын, таму яго ў іх няма. Вялько правёў за кратамі два дні, а 28 верасня яго

асудзілі і аштрафавалі. Супрацоўнікі міліцыі таксама канфіскавалі яго вясёлкавы сцяг.

Добраахвотныя аднаполыя стасункі паміж дарослымі не пярэчаць закону, аднак у дачыненні да ЛГБТІ-супольнасці дыскрымінацыя была шырока распаўсюджанай і фіксаваліся выпадкі пераследу. Закон не прадугледжвае для прадстаўнікоў ЛГБТІ абарону ад дыскрымінацыі на падставе сэксуальнай арыентацыі, гендарнай самаідэнтыфікацыі, яе праяў альбо палавых характарыстык.

Дыскрымінацыя ў грамадстве ў дачыненні да ЛГБТІ-актывістаў не прыпынялася пры маўклівай падтрымцы рэжыму, які або не расследаваў злачынствы, або рабіў гэта, не прызнаючы іх злачынствамі на глебе нянавісці. Так, напрыклад, у снежні 2019 года Мінскі раённы суд па абвінавачанні ў цяжкім хуліганстве прыгаварыў мясцовага жыхара да 18 месяцаў пазбаўлення волі і абавязаў яго выплаціць 5 400 рублёў (2 210 даляраў) кампенсацыі пацярпеламу Мікалаю Купрычу. Злачынца напаў на Купрыча і нанёс яму шматлікія траўмы твару і пераломы костак пасля таго, як, паводле звестак, убачыў, як Купрыч абдымае сяброў. Хоць злачынца ў ходзе расследавання і заявіў, што гэта было асноўным матывам яго нападу, суд адмовіўся прызнаць у якасці прычыны настроенасць супраць ЛГБТІ.

Урад дазваляе трансгендарным грамадзянам атрымліваць новыя пасведчанні асобы з новым імем і полам, аднак пакідае старыя асабістыя нумары, якія ўключаюць лічбу, што паказвае пол асобы пры нараджэнні. Трансгендарным асобам, паводле звестак, адмаўлялі ў працоўным месцы, як толькі патэнцыйныя працадаўцы заўважалі “неадпаведнасць” паміж асабістым нумарам і названым полам заяўніка. Банкі на тых самых падставах адмаўлялі трансгердарным асобам у адкрыцці рахункаў. Трансгендарным мужчынам выдавалі ваенныя білеты з пазнакай, што яны маюць “сур’ёзнае псіхічнае захворванне”.

Сацыяльная стыгматызацыя людзей з ВІЧ/СНІД

Дыскрымінацыя ў дачыненні да людзей з ВІЧ/СНІД з боку грамадства заставалася праблемай, а само захворванне несла цяжкую сацыяльную стыгму. Паводле дадзеных мясцовых НДА, якія працавалі з інфікаванымі ВІЧ і СНІД, а таксама з іншымі групамі рызыкі, ВІЧ-інфікаваныя, асабліва спажыўцы наркотыкаў, якія праходзяць або завяршаюць курс лячэння, працягвалі сутыкацца з дыскрымінацыяй, асабліва на працоўных месцах і падчас сумоўяў пры прыёме на працу. Напрыклад, згодна з клінічнымі справаздачамі лекараў, школы адмаўляліся браць на працу ВІЧ-інфікаваных, нават калі яны падавалі заяву на працу, якая не мае на ўвазе кантактаў з дзецьмі. Так, напрыклад, у траўні чалавеку забаранілі займацца рамонтам будынка згодна з інструкцыямі

Міністэрства аховы здароўя, якія забараняюць ВІЧ-інфікаваным асобам працаваць з дзецьмі.

Урад працягваў размяшчаць сацыяльную рэкламу, накіраваную на павышэнне асвядомленасці насельніцтва пра ВІЧ/СНІД, якая заклікала да праяваў большай цярпімасці ў дачыненні да людзей, інфікаваных гэтым вірусам.

Раздзел 7. Правы работнікаў

а. Свабода асацыяцый і права на калектыўныя перамовы

Нягледзячы на тое, што закон прадугледжвае права работнікаў, за выключэннем супрацоўнікаў органаў дзяржаўнай бяспекі і ваенных, на стварэнне незалежных прафсаюзаў і ўступленне ў іх, а таксама на правядзенне страйкаў, ён усталёўвае сур'ёзныя абмежаванні на рэалізацыю гэтых правоў. Закон прадугледжвае права на арганізацыю і правядзенне калектыўных перамоваў, але не абараняе прафсаюзы ад дыскрымінацыі. Як сведчылі актывісты незалежных прафсаюзаў, работнікі, што заяўлялі пра звальненне праз сваю прафсаюзную дзейнасць, не мелі ніякага ясна акрэсленага права на аднаўленне на працы або аспрэчванне свайго звальнення ў судзе.

Закон прадугледжвае грамадзянска-прававыя меры адказнасці ў выглядзе штрафаў за парушэнне свабоды сходаў або калектыўных перамоваў. Штрафы, прадугледжаныя для працадаўцаў, не адпавядалі пакаранню за іншыя злачынствы, звязаныя з парушэннем грамадзянскіх правоў. Урад не забяспечваў выкананне закона часткова таму, што ўлады і дзяржаўныя прадпрыемствы парушалі законнае права на свабоду аб'яднанняў.

Урад жорстка абмяжоўваў дзейнасць незалежных прафсаюзаў. Падкантрольная дзяржаве Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі ўяўляе сабою самы буйны прафсаюз краіны, які налічвае, паводле дадзеных самой федэрацыі, больш за чатыры мільёны сябраў, якім гэта дае пэўныя перавагі. Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП), у склад якога ўваходзіла чатыры прафсаюзы-заснавальнікі і прыкладна 10 000 сябраў незалежных прафсаюзаў, з'яўляўся найбуйнейшай галаўной арганізацыяй незалежных прафсаюзаў, не звязанай з уладамі. БКДП, аднак, не быў прадстаўніком большасці работнікаў ні на адным з найбуйнейшых дзяржаўных прапрыемствах краіны. Аднак праз жорсткі кантроль з боку дзяржавы над рэгістрацыйнымі патрабаваннямі і грамадскімі дэманстрацыямі гэтаму аб'яднанню было складана арганізоўвацца, пашырацца і баставаць.

Улады не прызнавалі права на свабоду аб'яднанняў і вядзення калектыўных перамоваў. Празмерна жорсткія рэгістрацыйныя патрабаванні, згодна з якімі любы новы незалежны прафсаюз павінен мець вялікую колькасць сябраў і

супрацоўнічаць з працадаўцам, працягвалі выступаць сур'ёзнай перашкодай на шляху стварэння незалежных прафсаюзаў. Прафсаюзы могуць быць выдаленыя з рэестра па рашэнні рэгістратара без якой-кольвечы судовай працэдуры. Рэгістратар можа выдаліць прафсаюз з рэестра, калі пасля выдачы пісьмовага папярэджання прафсаюзу аб яго парушэнні заканадаўства або ўласнага статута, гэтыя парушэнні на працягу месяца не будуць ліквідаваныя. Улады па-ранейшаму процістаялі спробам работнікаў выйсці з афіцыйнага прафсаюза і далучыцца да незалежнага, але, паводле звестак, пасля прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня работнікі ўсё часцей выходзілі з ФПБ, не ўступаючы ў БКДП па палітычных прычынах. Абмежаванні, якія дзяржава наклала на свабоду аб'яднанняў, ускладнялі ўдзел незалежных прафсаюзаў у калектыўных перамовах. Улады патрабуюць наяўнасць адзінай пазіцыі прафсаюзаў перад перамовамі, што на дзяржаўных прадпрыемствах, дзе таксама прысутнічае БКДП, вымагае, каб абедзве прафсаюзныя арганізацыі супрацоўнічалі ў калектыўных перамовах. Працоўныя актывісты, аднак, паведамлялі, што гэта пайшло на карысць БКДП, паколькі пагадненні, заключаныя з удзелам незалежных прафсаюзаў, былі больш спрыяльнымі для работнікаў, чым пагадненні, заключаныя выключна ФПБ.

Прававыя патрабаванні да правядзення страйкаў застаюцца высокімі. Так, напрыклад, страйкі могуць праводзіцца толькі праз па меншай меры тры або больш месяцаў пасля беспаспяховай спробы прафсаюза і працадаўцы ўрэгуляваць спрэчку. Працягласць страйкаў павінна быць вызначана загадзя. Акрамя таго, мінімальная колькасць работнікаў павінна працягваць працу падчас страйка. Тым не менш, гэтыя патрабаванні фактычна не мелі ніякага значэння, паколькі прафсаюзы, якія прадстаўлялі інтарэсы амаль усіх работнікаў, знаходзіліся пад кантролем урада. Дзяржаўныя органы і кіраўніцтва дзяржаўных прадпрыемстваў рэгулярна ўмешваліся ў дзейнасць прафсаюзаў і перашкаджалі спробам работнікаў арганізоўваць калектыўныя перамовы, у некаторых выпадках беспадстаўна спыняючы дзеянне калектыўных дамоваў. Кіраўніцтва і мясцовыя ўлады ў шмат якіх выпадках блакавалі спробы работнікаў арганізаваць страйкі, абвяшчаючы іх незаконнымі.

Некаторыя сябры прафсаюзаў, што бралі ўдзел у палітычных акцыях пратэсту, якія ўлады звычайна лічылі несанкцыянаванымі масавымі мерапрыемствамі, былі затрыманыя, а меншая частка палітычна актыўных работнікаў страціла працу. Нягледзячы на ціск з боку ўладаў, пасля выбараў 9 жніўня некаторыя работнікі пратэставалі і спрабавалі арганізаваць страйкі, аднак большасць не рабіла гэтага праз крайні ціск, які ўлады аказвалі на іх і на патэнцыйных лідараў страйкаў. Паказальны дзяржаўны ціск уключаў у сябе пазбаўленне лідараў страйкаў волі, фізічны гвалт над імі, звальненне, затрыманне або накладанне штрафаў на работнікаў, якія абмяркоўвалі магчымасць правядзення страйкаў, адмову працягваць працоўныя дамовы з работнікамі, якія бралі ўдзел у страйках, а таксама ўжыванне псіхалагічнага ціску ў форме пагроз пазбавіць

работнікаў бацькоўскіх правоў і падкрэсліванне наступстваў страты заробкаў для іх дзяцей і сем'яў. У жніўні і верасні няздольнасць пераканаць большасць працоўных правесці ўсеагульны страйк вымусіла значную меншасць працоўных на буйных дзяржаўных прадпрыемствах на знак пратэсту правесці акцыю "Працуй па правілах".

Працоўныя сутыкнуліся з палітычным ціскам. Напрыклад, 1 кастрычніка дзяржаўнае прадпрыемства "Беларускі металургічны завод" (БМЗ) праінфармавала супрацоўніка, які ўдзельнічаў у стыхійным мітынгу супраць Лукашэнкі на заводзе ў жніўні, пра тое, што не будзе працягваць працоўную дамову з ім па сканчэнні тэрміну яе дзеяння 4 лістапада. Паведамляецца, што кіраўніцтва БМЗ раней абяцала, што ніхто не будзе пакараны за ўдзел у палітычным мітынгу, але пазней міліцыя пасадзіла працоўнага і яшчэ аднаго яго калегу на 12 сутак нібыта за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве. На БМЗ работнік прапрацаваў 20 год.

Закон аб масавых мерапрыемствах таксама працягваў сур'ёзна абмяжоўваць правядзенне дэманстрацый, мітынгаў і іншых грамадскіх акцый, ушчамляючы прафсаюзы ў праве арганізоўвацца. Без дазволу ўладаў замежная дапамога не можа быць прапанаваная прафсаюзам на правядзенне семінараў, сходаў, страйкаў, пікетаў і г.д. або на "прапагандысцкую дзейнасць", накіраваную на сваіх уласных сябраў.

Захады ўладаў па ціску на незалежныя прафсаюзы ўключалі частыя адмовы ў працягненні працоўных дамоваў з сябрамі незалежных прафсаюзаў, а таксама адмову ў рэгістрацыі незалежных прафсаюзаў. Паводле лідара БКДП Аляксандра Ярашука, з 1999 года адбылася адзіная рэгістрацыя недзяржаўнага саюза ў 2019 годзе, калі ўлады ўхвалілі трэцюю заяўку на рэгістрацыю аддзялення незалежнага прафсаюза гарнякоў, работнікаў хімічнай, нафтаперапрацоўчай, энергетычнай, транспартнай, будаўнічай і іншых галін прамысловасці ў Салігорску. За рэгістрацыяй паследавала рэструктурызацыя дзяржаўнага прадпрыемства па вытворчасці калійных угнаенняў "Беларускалій", што прывяло да стварэння шэрагу асобных даччыных кампаній, і працоўныя пажадалі захаваць сваю прыналежнасць да прафсаюзаў БКДП. Улады імкнуліся аказваць ціск на працоўных або звальняць тых, хто лічыўся лідарам пратэстаў або страйкаў ці вёў апазіцыйную палітычную дзейнасць.

Цягам года старшыня незалежнага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці Генадзь Фядыніч і галоўны бухгалтар Ігар Комлік заставаліся пад хатнім арыштам пасля пакарання ў 2018 годзе чатырма гадамі абмежавання волі за ўхіленне ад сплаты падаткаў. Суд таксама забараніў ім займаць кіроўныя пасады на працягу пяці год. У 2018 годзе Мінскі гарадскі суд адхіліў іх апеляцыю. У траўні 2019 года ўмовы хатняга арышту Фядыніча былі трохі

палегчаныя, а ў лістападзе 2019 года ў выніку амністыі, падпісанай прэзідэнтам, тэрмін адбывання пакарання Фядыніча і Комліка быў скарочаны на адзін год да 2021 года.

Большасць кантрактаў на дзяржаўных прадпрыемствах з'яўляюцца аднагадовымі. Дзяржаўныя служачыя, якія складаюць прыкладна 70 адсоткаў працоўный сілы, могуць мець кантракты тэрмінам да пяці год, але большаць кантрактаў заканчваецца праз год. БКДП і НДА сцвярджалі, што гэтая практыка дала магчымасць уладам праз дзяржаўных працадаўцаў звальняць супрацоўнікаў, адмаўляючыся працягваць кантракты з некаторымі супрацоўнікамі (у тым ліку і медыкамі), якія пратэставалі супраць рэакцыі ўрада на COVID-19 або бралі ўдзел у пратэстах супраць таго, як улады правялі выбары. Сябры непраўладных прафсаюзаў, палітычных партый і груп грамадзянскай супольнасці згубілі працу праз заканчэнне гадавых кантрактаў. Пастанова ўрада дае працадаўцам магчымасць падпісваць бестэрміновыя працоўныя дамовы з работнікамі толькі пасля пяці год добрасумленнай і эфектыўнай працы з боку работніка. Аднак, як паведамляецца, больш працяглыя кантракты таксама абмяжоўваюць магчымасць супрацоўнікаў звольніцца, каб перайсці на іншую працу. Працоўныя звычайна абароненыя ў перыяд дзеяння кантрактаў.

Прадстаўнікі апазіцыйных палітычных партый і дэмакратычныя актывісты часам сутыкаліся са складанасцямі пры пошуку працы на дзяржаўных прадпрыемствах праз ціск уладаў на працадаўцаў.

б. Забарона на выкарыстанне прымусовай або паднявольнай працы

Закон забараняе ўсе формы прымусовай або паднявольнай працы, за выключэннем тых выпадкаў, калі судовыя пастановы патрабуюць выканання працы або паслугаў, у тым ліку і папраўчых працаў, як часткі прысуду.

Бацькоў, пазбаўленых бацькоўскіх правоў і беспрацоўных, альбо тых, хто працуе, але не ў стане кампенсаваць сродкі, якія дзяржава выдаткоўвае на ўтрыманне іх дзяцей, судовым загадам прымушаюць уладкоўвацца на працу. Асобы, якія адмовіліся ад прымусовай працы, могуць быць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці і накіраваныя на грамадскія або папраўчыя работы тэрмінам да двух год, пазбаўленыя волі тэрмінам да трох год або прыгавораныя да іншых формаў абмежавання волі з абавязковым удзелам у прымусовай працы з утрыманнем 70% заробку на пакрыццё выдаткаў, панесеных дзяржавай.

Мінскія ўлады патрабавалі ад афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных удзельнічаць у аплатных грамадскіх паслугах два дні ў месяц. Асобаў, якія адпрацавалі менш за 12 працоўных дзён на аплатных грамадскіх работах цягам года, пазбаўлялі магчымасці атрымліваць дапамогу па беспрацоўі. Асобы з інваліднасцю, адзінокія бацькі і бацькі трох і болей дзяцей, а таксама бацькі дзяцей з інваліднасцю і ва ўзросце да 18 год былі вызваленыя ад выканання такой працы.

Заканадаўства, датычнае прымусовай працы, рэдка выконвалася, а рэсурсы і інспекцыі, накіраваныя на выяўленне прымусовай і паднявольнай працы, былі мінімальнымі. Пакаранне за парушэнні было сувымернае з пакараннем за іншыя цяжкія злачынствы.

Беларусь служыла пераважна краінай-крыніцай гандлю людзьмі. Апроч памежных абмежаванняў, уведзеных падчас COVID-19, беларусы маглі свабодна вандраваць і працаваць у Расіі, якая, паводле звестак, з'яўляецца найбуйнейшай краінай прызначэння. У параўнанні з НДА, улады рэдка выяўлялі ахвяраў гандлю людзьмі з мэтай працоўнай эксплуатацыі, а судовы пераслед вінаватых у працоўнай эксплуатацыі заставаўся мінімальным. У 2019 годзе НДА выявілі 59 ахвяраў прымусовай працы ў параўнанні з трыма, выяўленымі дзяржавай. Паведамляецца, што ўлады не прызнавалі прэтэнзій з боку беларусаў, якія вярнуліся з Расіі і скардзіліся на тое, што там сталі ахвярамі прымусовай працы. Дзейнасць урада па прадухіленні прымусовай працы ў краіне і барацьбе з ёй не палепшылася.

Не было паведамленняў пра выпадкі рэпрэсій з боку ўладаў у дачыненні да асобаў, якія цягам года ўстрымліваліся ад удзелу ў грамадскіх мерапрыемствах, якія звычайна называюць суботнікамі. Аднак, згодна з інфармацыяй у СМІ, работнікі дзяржаўнага шпіталя выказалі страх перад магчымымі рэпрэсіямі ў выглядзе ўтрымання заробку, калі яны не будуць удзельнічаць у падобных мерапрыемствах.

Былыя зняволеныя паведамлялі, што іх штомесячны заробак не перавышаў 3-4 рублі (ад $1,5 да $2). Высокапастаўленыя чыноўнікі Генеральнай пракуратуры і Міністэрства ўнутраных спраў у лістападзе 2015 года заяўлялі, што прынамсі 97% усіх працаздольных зняволеных працавалі ў месцах пазбаўлення волі, як таго патрабуе закон, за выключэннем пенсіянераў і людзей з інваліднасцю, і што праца ў турме была важнай і карыснай для мэтаў рэабілітацыі і рэінтэграцыі зняволеных.

Гл. таксама *Справаздачу аб гандлі людзьмі Дзяржадэпартамента ЗША* на https://www.state.gov/trafficking-in-persons-report/.

в. Забарона на выкарыстанне дзіцячай працы і мінімальны ўзрост для працаўладкавання

Закон забараняе найгоршыя формы дзіцячай працы. Мінімальны ўзрост для працаўладкавання складае 16 год. Дзеці, якія дасягнулі 14 год, могуць падпісваць працоўную дамову з пісьмовай згоды аднаго з бацькоў або законнага апекуна. Генеральная пракуратура адказвае за выкананне гэтага закона. Няпоўнагадовых, якія не дасягнулі 18-гадовага ўзросту, дазваляецца прымаць на працу, што не ўяўляе для іх ніякай небяспекі, але забараняецца прыцягваць да працы ў звышурочны час, у выходныя дні або дзяржаўныя святы. Праца не павінна наносіць шкоду здароўю дзяцей або перашкаджаць іх навучанню.

Урад у цэлым выконваў гэтыя законы, і пакаранне за іх парушэнне было сувымерным з пакараннем за іншыя цяжкія злачынствы.

г. Дыскрымінацыя ў пытаннях працаўладкавання і занятасці

У цэлым, за дыскрымінацыю не прадугледжана пакаранне. Працоўны кодэкс забараняе дыскрымінацыю з боку працадаўцы толькі ў тым выпадку, калі ён адмаўляецца прыняць на працу асобу, накіраваную дзяржаўным агенцтвам па працы, занятасці і сацыяльным забеспячэнні ў рамках сістэмы квот. У выпадку, калі дыскрымінацыя грунтавалася на расе, узросце, гендары, мове, палітычных або рэлігійных перакананнях чалавека, прыналежнасці да прафсаюза, сацыяльным статусе або месцы жыхарства, дзяржава магла прыцягнуць працадаўцу да грамадзянскай адказнасці. Дзяржава не забяспечвала эфектыўнае выкананне гэтага заканадаўства.

Дыскрымінацыя ў пытаннях працаўладкавання і занятасці адбывалася па прыкмеце этнічнай і гендарнай прыналежнасці, інваліднасці, мовы, сэксуальнай арыентацыі, палавой самаідэнтыфікацыі і яе праяў, а таксама ў дачыненні да людзей з ВІЧ-пазітыўным статусам (гл. раздзел 6). Акрамя таго, некаторыя прадстаўнікі цыганскай супольнасці скардзіліся на частую дыскрымінацыю ў дачыненні да іх з боку працадаўцаў, якія або адмаўляліся іх наймаць, або не забяспечвалі ім поўны працоўны дзень. Урад на працягу года не рабіў ніякіх захадаў, каб прадухіліць ці ліквідаваць дыскрымінацыю пры працаўладкаванні.

Дыскрымінацыя ў сферы занятасці мела месца ў большасці сектараў эканомікі як на прыватных, так і на дзяржаўных працоўных месцах.

Закон патрабуе роўнай аплаты за роўную працу, аднак гэтае палажэнне выконвалася нерэгулярна, а ў ліпені 2019 года Нацыянальны статыстычны камітэт краіны паведаміў, што сярэдні заробак жанчын быў на 27,3 адсоткі меншы, чым заробак мужчын.

Урадам быў зацверджаны спіс з 181 “фізічна цяжкай працы” і “працы ў шкодных ці небяспечных умовах”, якія жанчынам забараняецца выконваць. Жанчыны таксама не могуць працаваць ва ўсіх тых самых сферах занятасці, што і мужчыны. Вельмі абмежаваная колькасць жанчын была прадстаўлена ў вышэйшым эшалоне кіраўніцтва або ўрада, большасць жа была сканцэнтраваная ў нізкааплатным дзяржаўным сектары. Хоць закон і дае жанчынам права на тры гады дэкрэтнага адпачынку з забеспячэннем працоўнага месца па вяртанні, працадаўцы часта абыходзілі пытанні абароны занятасці, падпісваючы з жанчынай кароткатэрміновы кантракт, а затым адмаўляліся яго працягваць у выпадку, калі жанчына зацяжарвала.

Дзяржаўная забарона на даўжэйшы за сем гадзін працоўны дзень для людзей з інваліднасцю, паводле звестак, прыводзіла да таго, што кампаніі неахвотна бралі іх на працу. Мясцовыя НДА паведамлялі, што да 85% людзей з інваліднасцю былі беспрацоўнымі. Улады забяспечвалі мінімальную сацыяльную дапамогу для асобаў з інваліднасцю. Пры разліку пенсій неабходна было ў адпаведнасці з законам улічваць статус інваліднасці, аднак улады не заўсёды былі гатовыя налічваць больш высокія пенсіі праз наяўнасць інваліднасці. Прадстаўнікі паралімпійскіх каманд краіны атрымлівалі палову заробку і прызавога ўзнагароджання ў параўнанні са спартоўцамі без інваліднасці.

д. Прымальныя ўмовы працы

Па стане на 1 кастрычніка мінімальная штомесячная заработная плата перавышала рысу беднасці.

Закон вызначае стандартны працоўны тыдзень працягласцю ў 40 гадзін і прадугледжвае не менш за адзін 24-гадзінны перапынак штотыдзень. Закон прадугледжвае абавязковую аплату звышурочнай працы і дзевяці святочных дзён, а таксама абмяжоўвае звышурочную працу 10-ю гадзінамі цягам тыдня, пры гэтым агульная працягласць звышурочнай працы не можа перавышаць 180 гадзін у год.

Урад эфектыўна забяспечваў выкананне заканадаўства аб мінімальнай заработнай плаце і звышурочнай працы, а штрафы за парушэнні гэтага заканадаўства былі сувымерныя з пакараннем за іншыя падобныя парушэнні. У чэрвені міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч адзначыла, што міністэрства кантралюе кампаніі і арганізацыі на прадмет выканання правіл звальнення супрацоўнікаў падчас COVID-19. Касцевіч паведаміла, што з пачатку пандэміі агульная колькасць працоўных гадзін скарацілася, паколькі працадаўцы імкнуліся захаваць занятасць работнікаў, змяншаючы колькасць працоўных гадзін або адпраўляючы людзей у адпачынак. Паводле звестак, дзяржава ў сувязі з COVID-19 падтрымлівала не працоўных і прыватны сектар, а пераважна дзяржаўныя прадпрыемствы, якія атрымлівалі фінансавую падтрымку ў выглядзе крэдытаў.

Дзяржаўныя працоўныя інспекцыі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны былі адказныя за забеспячэнне пытанняў заробкаў, звышурочнай працы, бяспекі на працоўным месцы і здароўя работнікаў. Закон усталёўвае мінімальныя стандарты бяспекі ўмоваў працы і аховы здароўя працоўных, аднак працадаўцы часта ігнаравалі гэтыя стандарты або патрабавалі ад працоўных насіць мінімальны ахоўны рыштунак. Дзяржаўныя працоўныя інспекцыі не мелі дастатковых паўнамоцтваў, каб прымусіць працадаўцу выконваць нормы аховы працы, і часта ігнаравалі парушэнні. Хоць інспектары і маглі праводзіць інспекцыі без папярэджання, іх колькасць была недастатковай для прадухілення парушэнняў. Пакаранне за парушэнне тэхнікі бяспекі і гігіены працы не было сувымернае з пакараннем за іншыя аналагічныя злачынствы.

Згодна з апошнімі дадзенымі, у 2019 годзе ўлады паведамілі пра 2 042 траўмы на працоўным месцы і 141 смяротны выпадак у параўнанні з 2 115 траўмамі і 144 смерцямі ў 2018 годзе.

Дэпартамент дзяржаўнай працоўнай інспекцыі ў кожным рэгіёне падтрымліваў “гарачыя лініі” па пытаннях працы, а таксама даваў асобныя кантактныя дадзеныя па пытаннях, звязаных з інспекцыяй працы, аховай працы і працоўнымі парушэннямі. Ведамства таксама мела гарачую лінію па праблемах, звязаных з незаконным звальненнем работнікаў.

У перыяд з 7 чэрвеня па 2 верасня Дэпартамент дзяржаўнай працоўнай інспекцыі апублікаваў інфармацыю, у якой адзначаліся тыповыя парушэнні патрабаванняў аховы працы ў чатырох галінах: эксплуатацыя аўтамабільнай і цяжкай тэхнікі, электрычнае і газавае абсталяванне, земляныя працы і наземнае будаўніцтва. Незалежныя эксперты паведамлялі, што ценявы сектар складае да 30 адсоткаў ад усёй эканомікі, у якой занята 4,5 мільёна чалавек. Закон аб працы не распаўсюджваецца на работнікаў ценявой эканомікі.